WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

29 ВЕРАСНЯ 2009 г.
АЎТОРАК
№ 183
(26541)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Рэзка пахаладае. Будзе дажджліва і ветрана, а ўначы месцамі замаразкі

Сёння ў другой палове дня ўслед за халодным атмасферным фронтам на тэрыторыю Беларусі завітае арктычнае паветра з боку паўночнага захаду кантынента, паведаміла рэдакцыі галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.

Атмасферны фронт выклікае ў аўторак сур'ёзныя дажджы, у асобных раёнах навальніцы. Усталюецца парывісты паўночны і паўночна-заходні вецер, пасля чаго істотна пахаладае. Тэмпература паветра ўдзень 9—14, толькі ў Брэсцкай і Гомельскай абласцях да 16 градусаў. Уначы на сераду будзе яшчэ халадней — усяго 1—7 цяпла, а на глебе месцамі замаразкі да мінус 2 градусаў. Тэмпература ўдзень 8—14 градусаў, месцамі кароткачасовыя дажджы.

У першы дзень кастрычніка ўначы па захадзе, а ўдзень амаль паўсюдна пройдуць дажджы. На працягу сутак даволі рэзкі парывісты заходні вецер. Тэмпература паветра ўначы ад плюс 2 па ўсходзе да 10 градусаў па захадзе краіны, удзень 7—12, па паўднёвым усходзе да 14 цяпла.

Згодна з папярэднімі прагнозамі, няўстойлівае і халоднае надвор'е захаваецца і ў выхадныя. Месцамі будзе ісці дождж. Тэмпература паветра ўначы 2—8, у суботу на тарфяніках Палесся на глебе замаразкі да мінус 2 градусаў, удзень 6—13, у нядзелю на поўдні краіны да 15 цяпла. Сіноптыкі адзначаюць, што восень да нас завітала сур'ёзна, а трэцяй хвалі бабінага лета ўжо не будзе.

Сяргей КУРКАЧ.

Беларусь па асноўных эканамічных паказчыках за 9 месяцаў можа выйсці на ўзровень 2008 года

Аб гэтым заявіў 26 верасня на пасяджэнні Савета Міністраў Беларусі прэм'ер-міністр Сяргей Сідорскі.

Аналізуючы асноўныя эканамічныя паказчыкі, кіраўнік урада адзначыў, што «дапушчаны сур'ёзныя правалы на працягу года, самымі дрэннымі былі паказчыкі па жніўні». «Мы вымушаны былі звярнуцца да сістэмы дадатковых мераў па дасягненні прагнозных паказчыкаў, — сказаў Сяргей Сідорскі. — Я лічу, што сітуацыю за дзевяць месяцаў гэтага года з улікам усіх працэсаў, якія адбываюцца ў рэальнай эканоміцы нашай краіны, можна палепшыць і выйсці на ўзровень 2008 года цалкам рэальна».

Прэм'ер-міністр даручыў ураду прыняць меры па скарачэнні няпоўнай занятасці на беларускіх прадпрыемствах. «За восем месяцаў гэтага года ўзровень беспрацоўя не выйшаў за рамкі прагнозу, у той жа час не поўнасцю занятых у жніўні было больш за 100 тыс. чалавек, а ў студзені—жніўні гэтага года — больш за 300 тыс. чалавек, што ў 4 разы больш у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года, — праінфармаваў кіраўнік урада. — На жаль, гэты паказчык не ўдаецца знізіць». На МТЗ у рэжыме няпоўнай занятасці працуюць больш як 13 тыс. чалавек, на БелАЗе — каля 6,8 тыс., на Мінскім падшыпнікавым заводзе — каля 3 тыс., на Мінскім маторным заводзе — каля 5 тыс., у канцэрне «Беллегпрам» — больш за 6 тыс. «Перавод работнікаў у рэжым няпоўнай занятасці ў крызісных умовах апраўданы, але трэба ўлічваць, што летні перыяд скончыўся, — сказаў Сяргей Сідорскі. — Хацелася б пачуць ад міністраў і дырэктараў прадпрыемстваў, як яны будуць займаць рабочых. Як ствараюцца рабочыя месцы? Як узаемадзейнічаюць буйныя прадпрыемствы з бізнэсам, ствараючы малыя і сярэднія прадпрыемствы?» Прэм'ер-міністр звярнуў увагу на неабходнасць разгляду існуючай сітуацыі на буйных прадпрыемствах краіны. «Трэба вырашыць, як далей будзем працаваць, бо ўсе гэтыя пытанні маюць вострыя характар, які ўплывае як на занятасць у краіне, так і на эканоміку ў цэлым», — адзначыў ён. Сяргей Сідорскі дадаў, што пытанні выплаты заработнай платы і забеспячэння занятасці насельніцтва знаходзяцца на пастаянным кантролі ўрада.

Стаўка рэфінансавання ў Беларусі на 2010 год запланавана на ўзроўні 9-12 працэнтаў гадавых. Такія звесткі закладзены ў праекце Асноўных напрамкаў грашова-крэдытнай палітыкі Беларусі на 2010 год, паведаміў старшыня праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Пётр Пракаповіч. Цяпер стаўка рэфінансавання ў Беларусі складае 14 працэнтаў гадавых. Чакаецца, што сярэдняя стаўка па крэдытах на канец 2010 года складзе 12-15 працэнтаў гадавых. Пётр Пракаповіч таксама паведаміў, што патрабаванні банкаў да эканомікі ўзрастуць на 29-34 працэнты, што апярэджвае запланаваныя тэмпы росту ВУП.

Кіраўнік урада адзначыў, што кожнае міністэрства зацвердзіла стратэгію скарачэння складскіх запасаў. У цэлым па краіне яны зніжаюцца. Так, за ліпень-жнівень 2009 года складскія запасы скарочаны практычна на Br1 трлн. «І гэта прытым, што ўся прадукцыя, якая вырабляецца ў гэтых месяцах, прадаецца за межы краіны», — сказаў ён. Аднак, нягледзячы на дадатную дынаміку скарачэння складскіх запасаў за 20 дзён верасня, большасць ведамстваў, за выключэннем Мінсельгасхарча, не справіліся з выкананнем паказчыкаў, запланаваных іх стратэгіямі. «Асабліва насцярожвае сітуацыя па верасню на Мінскім трактарным заводзе, дзе рост складскіх запасаў склаў Br6 млрд, на «Гомсельмашы» — Br15 млрд і г.д.», — сказаў прэм'ер-міністр.

Большасць прадпрыемстваў з месяца ў месяц зніжаюць аб'ёмы вытворчасці прамысловай прадукцыі. «Аднак я не адчуваю, што нашы буйныя прадпрыемствы — гіганты прамысловасці — працуюць над тымі даручэннямі, якія даў Прэзідэнт», — дадаў прэм'ер.

Больш за ўсё крытыкі Сяргей Сідорскі накіраваў у адрас канцэрна «Беллегпрам». «Па выніках паездкі на Аршанскі льнокамбінат я поўнасцю расчараваўся ў рабоце канцэрна: у яго няма ні стратэгіі, ні жадання працаваць», — сказаў ён. На думку прэм'ер-міністра, адна з галоўных праблем, якія не даюць магчымасці прадпрыемствам эфектыўна разгружаць склады, — няўменне выбудоўваць маркетынгавую палітыку і прадаваць сваю прадукцыю.

БЕЛТА.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

МЕРКЕЛЬ ПЕРАМАГАЕ

Канцлер Германіі Ангела Меркель, якая ўзначальвае Хрысціянска-дэмакратычны і Хрысціянска-сацыяльны саюз, заявіла аб пачатку перамоў з мэтай стварэння ўрадавай кааліцыі са «Свабоднай дэмакратычнай партыяй» (СвДП).

Паводле папярэдніх звестак, партыйны саюз ХДС/ХСС на чале з Меркель перамагае на выбарах у бундэстаг з 33,8 % галасоў выбаршчыкаў. ХДС/ХСС і СвДП змогуць сфарміраваць «чорна-жоўты» кааліцыйны ўрад, які названы так па колерах партый. Выбары ў бундэстаг сталі зруйнавальным паражэннем для галоўнага суперніка Меркель, кіраўніка МЗС ФРГ Франка-Вальтара Штайнмайера, у барацьбе за пасаду федэральнага канцлера Германіі і самым горшым вынікам для сацыял-дэмакратаў за ўсю гісторыю ФРГ з 1949 года.

ІРАН ЗАПУСЦІЎ РАКЕТУ

Іран правёў выпрабаванні балістычнай ракеты «Шахаб-3» з радыусам дзеяння да дзвюх тысяч кіламетраў, якая здольная паразіць цэлі на тэрыторыі Ізраіля.

«Шахаб-3» — гэта самыя магутныя іранскія балістычныя ракеты, якія, як «Шахаб-1» і «Шахаб-2», а таксама іранскія ракеты малой дальнасці тыпу «Фаджр», маюць раздзяляльныя боегалоўкі, але валодаюць вялікім радыусам дзеяння — да 2 тысяч кіламетраў, гэта значыць, здольныя дасягнуць тэрыторыі Ізраіля, і таксама могуць уяўляць пагрозу для амерыканскіх баз у зоне Персідскага заліва. Выпрабаванні ракет прайшлі на фоне абвастрэння адносінаў паміж Іранам і заходнімі краінамі з-за ядзернай праграмы Тэгерана. ЗША, Вялікабрытанія і Францыя асудзілі Іран за будаўніцтва другога завода па ўзбагачэнні ўрана без ведама міжнародных арганізацый.

ЕЎРОПА АДМАЎЛЯЕЦЦА ПЛАЦІЦЬ «ГАЗПРАМУ»

У 2009 годзе «Газпрам» можа аштрафаваць сваіх найбуйнейшых замежных партнёраў за невыкананне ўмоў кантрактаў.

Найбуйнейшыя еўрапейскія спажыўцы расійскага газу, першым чынам Германія, Італія і Турцыя, недабіраюць прадугледжаныя кантрактамі з расійскім «Газпрамам» мінімальныя аб'ёмы. У сувязі з гэтым замежным кампаніям, магчыма, давядзецца выплаціць немалую няўстойку. Усяго, па апошніх падліках, італьянская ENI, нямецкі E.ON, турэцкая Botas і шэраг іншых кампаній павінны будуць выплаціць «Газпраму» 2,8 мільярда долараў у якасці штрафаў. Аднак самі даўжнікі выступаюць супраць таго, каб плаціць няўстойку. Ужо сёлета ў першым паўгоддзі краіны Заходняй Еўропы знізілі закупкі расійскага газу на 29%.

ФІЛІПІНЫ ЗАТАПІЛА

На Філіпінах адбылася паводка, якая стала наймацнейшай за апошнія 40 гадоў.

У суботу на Манілу і суседнія правінцыі абрынуліся моцныя ліўні, якія доўжыліся дзевяць гадзін. За дзень выпала 41,6 сантыметра ападкаў. Больш за 337 тысяч чалавек былі вымушаныя пакінуць свае дамы. Каля 60 тысяч філіпінцаў застаюцца ў часовых лагерах, арганізаваных для эвакуяванага насельніцтва. Колькасць загінулых перавысіла 140 чалавек.

ISSN 1990 - 763X

ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

2 кастрычніка 2009 г. у 10.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 4) пачне работу трэцяя сесія Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання.

КАРОНА ЕДЗЕ Ў ВЕНЕСУЭЛУ, А БЕЛАРУСКА — ЛЕПШАЯ Ў ЕЎРОПЕ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У Мінску завяршыўся 38-ы конкурс прыгажосці «Міс ІнтэркАНТыненталь»

Гэтай перамогі чакалі. Праяе шапталіся ў кулуарах журналісты, абмяркоўвалі ў грамадскім транспарце аматары, іншымі словамі яшчэ да пачатку фіналу менавіта Ханэлі Куэнтэра Ледзма, прыгажуня з Венесуэлы, лічылася фаварыткай конкурсу «Міс Інтэркантыненталь-2009».

Не ведаю, накаркалі мы ці не, але ў выніку яно так і атрымалася. Ханэлі Куэнтэра Ледзма стала чацвёртай венесуэлкай, якой за ўсю гісторыю конкурсу прысуджалі тытул «Міс Інтэркантыненталь».

Першы раз карону ў гэту паўднёва-амерыканскую краіну прывезла Марыя Эмілія дэ лос Рыаз у далёкім 1974-м. Пазней пасля вялікага перапынку гэта ўдалося зрабіць венесуэлцы Ліджыі Фернандзе Пэціт Варгас у 2001 годзе. У 2005-м у горадзе Гуаньшань (Кітай), дзе праводзіўся конкурс, дасягненне суайчынніцы паўтарыла Эмарыс Пінта.

Ханэлі Куэнтэра — прафесійная тэлевядучая і мадэль, ёй 23 гады, рост 177 см. Ханэлі любіць танцаваць, хадзіць у кіно, валодае іспанскай і англійскай мовамі.

Да конкурсу дзяўчына не ведала пра нашу краіну нічога, аднак чула, што паміж урадамі Венесуэлы і Беларусі цёплыя сяброўскія ўзаемаадносіны. У Беларусі дзяўчыне найбольш запомніліся гасціннасць і салігорскія шахты. На пытанне, што ёй дапамагае захоўваць прыгажосць, дзяўчына прызналася, што шмат добрай касметыкі: крэмы для твару, рук. А вось у планах галоўнай інтэркантынентальнай прыгажуні выйсці замуж і нарадзіць дзяцей. Акрамя кароны пераможцы і грашовага прыза ў $35 тысяч, Ханэлі атрымала таксама тытул «Міс Інтэркантыненталь-Амерыка».

— Новая Міс Інтэркантыненталь напэўна дасягне такога ж поспеху, як і 37 пераможцаў мінулых гадоў, якія праявілі сябе ў рознабаковых сферах, уключаючы кіно, бізнэс, хатнюю гаспадарку, журналістыку, дзяржаўную службу і мадэльны бізнэс, — упэўнены **еўрапейскі дырэктар Сусветнай арганізацыі прыгажосці Дзітлаф Тэрсіс.**

— Неверагодны год чакае «Міс Інтэркантыненталь-2009». Яна будзе падарожнічаць па свеце, знаёміцца з людзьмі, працуючы над гуманітарнымі праектамі, і атрымае мноства іншых магчымасцяў, — кажа **старшыня і прэзідэнт Сусветнай арганізацыі прыгажосці Льюіс Піці Сагрэра з Панамы.**

ЯК УСЁ ПАЧЫНАЛАСЯ

Самой пішучай і здымаючай братыі на конкурс было акрэдытавана каля сотні. Сам конкурс «Міс інтэркантыненталь-2009» трансляваўся ў 34 краіны свету. Тэлеканал АНТ паставіў сапраўднае шоу.

Сцэна ў Футбольным манежы манціравалася на працягу месяца і заняла 700 кв.м, яе галоўнымі сюрпрызамі стала адмысловая пляцоўка пад вадаспад і трубы, якія ў самыя напружаныя моманты дзеяння выкідвалі агонь і стралялі феерверкам. Седзячы ў першым шэрагу, моц і тэмпература гэтых феерверкаў адчувалася асабліва моцна.

— Мы тут хутка абвуглімся, — трапна заўважыла неяк мая калега, калі на сцэне пад трэск феерверка чарговы раз падскочыў Дзіма Білан.

Быў феерверк і пазней, калі на сцэне рваў струны на смычку малады хлопец у джынсах, спяваючы так душэўна, нібыта які Васіль з палескай вёскі Курані. Вось толькі звалі хлопчыка Аляксандр Рыбак, і яго Курані называліся Нарвегіяй...

Увогуле, пры выступленні масцітых зорак гледачы ў Футбольным манежы ўваходзілі ў сапраўдны экстаз: крычалі, махалі рукамі, спявалі, пляскалі ў далоні і расплываліся ва ўсмешках да самых скроняў... Самае цікавае, што большасць умудралася паралельна здымаць усё дзейства на відэа і шчоўкаць мыльніцамі.

Не цураліся мыльніцаў і журы конкурсу. Ды і навошта цурацца — самі ў адкрытую здымалі і фатаграфавалі. Фотаапаратаў не было хіба што толькі ў Вольгі Хіжанковай і Дзітлафа Тэрсіса: яны сумленна глядзелі, слухалі і аналізавалі. Сярод журы, дарэчы, Міс Беларусь-2008 выдзялялася асабліва. Яе белая сукенка а-ля Мэрылін Манро вельмі пасавала пад яе прычоску і адразу прыкоўвала позірк.

Але самая відовішчная рэч адбывалася пры выхадзе дзяўчат у вячэрніх строях. Музыка. Свет. Подыум. І дзяўчаты, бы тыя гусі на вадапой, ішлі адна за адной грацыёзна і велічна... Нетаропка, стройна, прыгожа, з высока паднятай галавой, з усмешкай на твары і агеньчыкам у вачах.

Прызнаюся шчыра, мне гэта адразу нагадала паказ новай калекцыі ад якога-небудзь сусветна вядомага куцюр'е. Шыкоўныя сукенкі сядзелі на дзяўчатах, як на сапраўдных мадэлях (вядома, што не ўсе з канкурсантак прафесійныя мадэлі). А дзяўчаты, падымаючы шыкоўныя шлейфы ад сваіх сукенак, пад гукі музыкі, задаволеныя сабою, нават не ішлі, а плылі, свецячыся ад шчасця і расплываючыся ва ўсмешцы. Гэта было свята! Карэспандэнт «Звязды» нават не вытрымаў і памахаў дзяўчыне з Венгрыі, якая якраз праходзіла з яго боку. Прыгажуня ўсміхнулася яшчэ шырэй і памахала ў адказ.

А ХВАРЭЛІ МЫ ЗА МАШУ, А ЧАМУ? БО ЯНА НАША!

Яшчэ падчас паездкі ў Салігорск, калі інтэркантынентальныя прыгажуні наведвалі горад шахцёраў, я запытаў у Марыі Есьман, ці адчувае яна сябе гаспадыняй. Прызналася, быў упэўнены, што беларуска адкажа: так, натуральна, я гаспадыня і бяру ад гэтага па-максімуму. Але Маша адказала адваротнае: «Я не адчуваю сябе тут у больш прывілеяваным становішчы: маўляў, раз гаспадыня, значыць усё дазволена. Я такая ж, як і астатнія дзяўчаты. І нічым не лепшая».

У паездках наша Маша сядзела з расіянкай Ганнай Мезенцавай, а вось найбольш пасябравала з украінскай прыгажуняй Кацярынай Бойка... Але ніколі беларуска ў стасунках з прэсай не пагарджала іншымі канкурсанткамі. Відаць, за наш талерантны менталітэт і прагаласавалі дзяўчаты, прысудзіўшы тытул «Міс Кангеніяльнасць» беларусцы. Бо гэты тытул, як вядома, прыгажуні выбіраюць самі.

Але на гэтым колькасць тытулаў у беларускай прыгажуні не скончылася. Марыя Есьман стала «1-й віцэ-міс Інтэркантыненталь-2009», а таксама «Міс Інтэркантыненталь-Еўропа», пацвердзіўшы леташні поспех Любові Яковінай, якая атрымала такі ж тытул. Беларускія дзяўчаты другі год запар прызнаюцца найпрыгажэйшымі ў Еўропе!

Да пачатку конкурсу заставалася таямніцай, каму ж тэлеканал АНТ прысудзіць дадатковы прыз. Як зазначаў падчас першай прэс-канферэнцыі **першы намеснік старшыні праўлення ЗАТ «Другі нацыянальны тэлеканал» Сяргей Хоміч,** адна з дзяўчат атрымае таксама адмысловы падарунак ад тэлеканала АНТ. Гэтым падарункам стала спецыяльнае калье, упрыгожанае ізумрудамі, вырашчанымі ў Акадэміі навук. Яго распрацоўкай займаліся ювеліры Дзіянавы з Полацка. У калье ўвайшло 100 грамаў срэбра і 20-каратныя ізумруды, штучна вырашчаныя нашымі вучонымі. І падарылі гэтае калье беларусцы!..

Ужо пасля фіналу, калі пераможцу і двух віцэ-міс вывелі да журналістаў, Марыя расказала, што вельмі задаволена сваім выступленнем: «Адчуваю я сябе добра, хвалявання ўжо трохі менш. І вялікі дзякуй усім, хто за мяне хварэў». Не шмат пытанняў паспелі задаць журналісты — дзяўчат павялі ў грымёрку. Але аўтограф для маленькай дзяўчынкі Маша даць паспела. А дзяўчо з нататнікам і ручкай, атрымаўшы жаданае, аж падскочыла ад радасці!

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Побач з журналістамі стаялі і бацькі Машы: Святлана Трыфанаўна і Аляксей Аляксеевіч. Сціпла і трохі ўбаку. Яны не лезлі наперад, але з дачкой усё ж пагаварылі. Пазней, размаўляючы з карэспандэнтам «Звязды», **Святлана Трыфанаўна** прызнаецца:

— Ставіліся да гэтага спакойна, без фанатызму. Хваляванне перамешвалася і з гонарам, і з перажываннем. Але мы ведалі, што ўсё ў Божых руках. Мы падтрымлівалі Машу, кожны вечар прыязджалі ў гасцініцу, бо Маша павінна была жыць разам з іншымі канкурсанткамі ў гатэлі.

— Усе мы хвалявaліся, — дадае **тата Аляксей Аляксеевіч.** — І асабліва за тое, каб Беларусь не ўдарыла тварам у гразь.

— Асабліва прыемна, што Маша атрымала тытул «Міс Еўропа». Гэта ганарова і адказна ўдвайне.

— Ці думалі вы калі-небудзь, што Маша будзе ў такой адказнай ролі?

— Я больш была настроена на вучобу, — кажа **Святлана Есьман.** — Дзяўчынка здольная. Была энергічным дзіцем. Вось так мы спачатку ў гімнастыку, затым у бальныя танцы, а пасля я гляджу — спраўляецца Маша і з вучобай паспявае, то тады яшчэ і на скрыпку аддалі. А ўвогуле больш думалі ў вучэбным плане. Скончыць БДУ, затым, калі атрымаецца, аспірантуру. А ўдзелу ў такім прэстыжным конкурсе я не чакала... Але мы вельмі радыя і ганарымся сваёй дачкой.

Яшчэ да пачатку конкурсу на он-лайн канферэнцыі ў Машы запыталі, ці збіраецца яна далей звязваць сваё жыццё з мадэльным бізнэсам. На што беларуска адказала: «На конт будучыні не магу нічога сказаць. У першую чаргу хачу скончыць універсітэт. Калі змагу сумяшчаць з мадэльным жыццём — чаму б і не». Нагадаю, што конкурс «Міс Інтэркантыненталь» стаў першым конкурсам прыгажосці ў жыцці беларускай прыгажуні.

* * *

Фінал міжнароднага конкурсу прыгажосці «Міс Інтэркантыненталь-2009», які ў гэтым годзе прайшоў у Мінску, наведаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. Конкурс «Міс Інтэркантыненталь» вядзе сваю гісторыю з 1971 года і ўваходзіць у пяцёрку самых прэстыжных спаборніцтваў прыгажосці ў свеце.

Ілья ЛАПАТО.

ПЕНСІЙНАЯ ПРЫБАЎКА Ў ЗВЯЗЦЫ З ЭКАНОМІКАЙ

У Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны не выключаюць, што павышэнне працоўных пенсій можа адбыцца яшчэ да канца гэтага года. Аднак канчатковае рашэнне на гэты конт яшчэ не прынятае — як адзначыла падчас сустрэчы з журналістамі намеснік міністра Валянціна КАРАЛЁВА, у гэтым выпадку ўсё будзе залежаць ад сітуацыі ў айчыннай эканоміцы.

ПАКУЛЬ НАПЕРАДЗЕ — ІНФЛЯЦЫЯ

Паводле звестак міністэрства, у сёлетніх студзені—верасні адносна аналагічнага перыяду летась памер сярэдняй пенсіі па ўзросце павялічыўся на 9,5, а мінімальнай пенсіі па ўзросце — на 11,9 працэнта. Разам з тым гэты рост фактычна «з'ела» інфляцыя. І больш за тое: папярэднія разлікі паказваюць, што рэальны, з улікам змянення цэнаў на тавары і паслугі, памер сярэдняй пенсіі па ўзросце зменшыўся на 3,9 працэнта.

Як заўважыла Валянціна Каралёва, у Беларусі традыцыйна адзначаецца высокі паказчык суадносінаў сярэдняй пенсіі па ўзросце і сярэдняй зарплаты — не менш за 40 працэнтаў. Аднак тлумачэнне цяперашняй сітуацыі — меншая ў замаруджванні тэмпаў росту заробкаў. У сваю чаргу гэта ўплывае на аб'ём паступленняў у Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва страхавых узносаў, якія і з'яўляюцца крыніцай фінансавання пенсій. Так, варта нагадаць, што заканадаўства вызначае: падставай для павышэння працоўных пенсій з'яўляецца больш чым 15-працэнты рост сярэдняй зарплаты. Пакуль перавысіць гэтую «планку» не ўдалося. Праўда, пытанне, ці адбудзецца павелічэнне працоўных пенсій сёлета, усё ж застаецца адкрытым. І адказ на яго залежыць выключна ад эканомікі.

А ШТО ДАЛЕЙ?

Адна з папулярных апошнім часам тэм — працуючыя пенсіянеры. Як заўважыла Валянціна Каралёва, сітуацыя, калі выплаты пенсій такім пенсіянерам робяцца па сутнасці без значных абмежаванняў, працягвацца бясконца не можа. Інакш кажучы, падыходы тут сапраўды могуць быць перагледжаныя. «Але гэта ні ў якім разе не значыць, што калі-небудзь паўстане катэгарычны выбар — або пенсія, або зарплата, — падкрэсліла намеснік міністра. — Варыянты змяненняў ёсць розныя, і, як падаецца, самы прымальны з іх — выплата пенсій у залежнасці ад сукупнага даходу. Прынамсі, пры такім падыходзе не пацерпяць інтарэсы пенсіянераў, якія ўладкоўваюцца на не надта прэстыжныя і нізкаплатныя вакансіі».

Пры гэтым Валянціна Каралёва адзначыла: ні сёлета, ні ў наступным годзе ніякіх прапаноў наконт працуючых пенсіянераў Міністэрства працы і сацыяльнай абароны вылучаць не будзе. Не варта таксама чакаць хуткіх рашэнняў і наконт пенсійнага ўзросту. Аднак малюнак тут сапраўды неадназначны — паводле прагнозаў да 2030 года ўзрост больш за 60 гадоў будуць мець больш за 27 працэнтаў беларусаў. «Калі мы хочам мець высокія пенсіі ў старасці, то гэта старасць не павінна надыходзіць хутка, — зазначыла Валянціна Каралёва. — Тым больш, што такі ж нізкі пенсійны ўзрост, як у Беларусі, застаўся ўсяго ў лічаных краінах свету».

АД РАЙЦЭНТРАЎ — У ВЁСКУ

Паступовае павелічэнне долі пажылых грамадзян — рэалія многіх дзяржаў. Як застаецца фактам і рост колькасці адзінокіх пенсіянераў. Сёння ў Беларусі 156 тыс. пажылых людзей не маюць дзяцей увогуле, а яшчэ 586 тыс. чалавек жывуць асобна ад тых жа дзяцей і іншых працаздольных сваякоў.

Як адзначыла Валянціна Каралёва, апошнім часам робіцца ўсё, каб старыя і адзінокія людзі маглі як мага больш заставацца дома. Зараз 81,7 тыс. чалавек наведваюць сацыяльныя работнікі, прычым карыстацца іх паслугамі могуць жыхары прыкладна 96 працэнтаў населеных пунктаў краіны.

Адметна, што ці не 70 працэнтаў грамадзян, якія атрымліваюць сацыяльныя паслугі дома, з'яўляюцца вяскоўцамі. Зноў-такі збольшага на жыхароў сельскай мясцовасці разлічаныя і так званыя сацыяльныя пункты, пры якіх, у прыватнасці, ствараюцца гаспадарчыя брыгады — для адназавых паслуг па апрацоўцы прысядзібных участкаў, рамонце жылля, нарыхтоўцы дроў. Пры гэтым сацыяльных пунктаў становіцца ўсё больш — у цэлым па краіне іх налічваецца 499.

Між тым, за апошнія гады ў дамах-інтэрнатах з'явілася 718 дадатковых месцаў. Як вынік, практычна ліквідавана чарга ва ўстановы для пенсіянераў і інвалідаў. Аднак гэтага ж нельга сказаць у дачыненні да ўстаноў для псіханеўралагічных хворых — змяшчэння сюды яшчэ чакаюць 812 чалавек.

З улікам гэтага ў міністэрстве зазначаюць: укладанні сродкаў у інтэрнаты працягнецца. Як працягнуцца і інвестыцыі ў спецыялізаваныя санаторыі для ветэранаў і інвалідаў.

ДЛЯ ТЫХ, КАМУ БОЛЬШ ЦЯЖКА

Як вядома, з 1 студзеня зменяцца некаторыя ўмовы аказання адраснай сацыяльнай дапамогі. Планка даходаў для штомесячных выплат застаецца ранейшай — 100 працэнтаў ад бюджэту пражыткавага мінімуму. А вось планка даходаў для аказання аднаразовай падтрымкі ўзрасце з 120 да 150 працэнтаў БПМ. У тым ліку апошняя акалічнасць павінна паўплываць на агульную колькасць атрымальнікаў адраснай дапамогі. У наступным годзе гэта колькасць можа ўзрасці да 308 тыс. чалавек, дзеля справядлівасці, непасрэдна галоўныя «адрасы» выплат павінны застацца без зменаў — няпоўныя і шматдзетныя сем'і.

Пры гэтым, нагадала Валянціна Каралёва, таксама з 1 студзеня будзе вырашана і ці не самае балючае пытанне апошняга часу — з забеспячэннем сродкамі рэабілітацыі інвалідаў III групы і дзяцей ва ўзросце да 18 гадоў, якія інвалідамі не прызнаныя, але, паводле медыцынскіх паказанняў, маюць патрэбу ў гарсэтах, артапедычным абутку, «распорках» і г.д. Узгаданыя катэгорыі грамадзян змогуць атрымліваць неабходныя ім дапаможныя сродкі бясплатна.

Сяргей ГРЫБ.

АСАБЛІВАСЦІ САКАЛІНАГА ПАЛЯВАННЯ

Выпрабавана на сабе

Карэспандэнт «Звязды» ў самай глыбінцы Прыдзвінскага краю вырашыў вывучыць усе нюансы сакалінага палявання. Яго яшчэ называюць царскім, бо цары, князі вельмі любілі такім чынам бавіць час. Той жа Аляксей Міхайлавіч, напрыклад. І ў нашы дні, як кажуць, уладныя людзі «адпачываюць» на паляванні з драпежнікамі.

Наш журналіст таксама нейкім чынам трохі «адчуў сябе царом». Дарэчы, ён наогул на паляванні ніколі не быў. А тут узяў ды і правёў у кампаніі паляўнічых свой законны выхадны дзень. І не пашкадаваў. Увесь дзень на прыродзе! Прыгожая птушка сядзіць на руцэ. У адрозненне ад стрэльбы, яна рэдка «памыляецца». З вялікай хуткасцю і дакладнасцю даганяе птушку і... Класна! А колькі баек пачуў ад паляўнічых!

Тры паляўнічыя, тры сабакі з радаслоўнымі і адзін журналіст

У беларускай глыбінцы, у Бешанковіцкім раёне, і ў цэлым у паўночнай вобласці краіны адраджаюць гэты від палявання. Але як туды, у глыбінку, дабрацца? Адзін начальнік «ад палявання» яшчэ тры тыдні таму абавязкова паабяцаў узяць з сабой. Потым пацвердзіў гэта, а за дзень да паездкі адмовіў. Хай будзе здаровым!

Затое выручыў энтузіяст, адзін з ініцыятараў адраджэння царскага палявання **Сяргей Эдуардавіч УСАЎ,** член Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў, эксперт першай катэгорыі па гончых сабаках. Ён па-прасіў свайго знаёмага-паляўнічага адвесці бедалагу-рэпарцёра, які быў без колаў.

Юрый Мікалаевіч ГАРАГЛЯД — член абласнога праўлення таварыства, каардынуе дзеянні аматараў палявання з паляўнічымі выжлямі. У якасці пасажыра ў ягонай машыне ехалі яшчэ два ўладальнікі выжлаў, тры сабакі (у кожнага свая) і я — поўны навічок у паляванні. Здзівіла, калі Юрый Мікалаевіч паставіў музычны дыск з... запісам оперных спевакоў. Раніца, дарога няблізкая, а мы слухаем «Памяці Каруза» ў выкананні Павароці.

СТАР. 5

РЫБАК НА ПЯЦЬ ГАДЗІН ЗАХРАС У ВАДЗЕ

Пяць гадзін прастаяў па пояс у вадзе няўдачлівы рыбак, які захрас у глеістых адкладаннях Чыжоўскага вадасховішча.

Як расказаў прэс-сакратар Мінскага гарадскога ўпраўлення МНС Аляксандр Лапанік, на пульт дзяжурнага патэлефанавала мінчанка і паведаміла, што муж не вярнуўся з рыбалкі дадому. Падраздзяленні выратавальнікаў абследавалі Чыжоўскае вадасховішча па перыметры і знайшлі чалавека, які стаяў па пояс у вадзе. Мінчанін захрас у балоцістым месцы і не змог выбрацца самастойна. Як адзначыў Аляксандр Лапанік, рыбак дапусціў памылку, не прыхапіўшы з сабой мабільны тэлефон. З дапамогай лодкі і выратавальнага круга яго выцягнулі з вады і перадалі медыкам.

Уладзімір ЖДАНОВІЧ, «Мінск—Навіны».

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка выказаў глыбокія спачуванні родным і блізкім Героя Савецкага Саюза Віктара Лівенцава ў сувязі з яго смерцю

«Гэты выдатны чалавек прайшоў вялікі і слаўны шлях абаронцы Айчыны і стваральніка будучыні сваёй краіны, — гаворыцца, у прыватнасці, у спачуванні. — Віктар Ільіч валодаў вялікай сілай духу і цвёрдай грамадзянскай пазіцыяй, актыўна ўдзельнічаў у грамадскім жыцці, правядзенні выхаваўчай работы з моладдзю. Яго выбітныя заслугі перад Радзімай адзначаныя многімі высокімі ўзнагародамі».

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ЛІВЕНЦАЎ Віктар Ільіч

Віктар Ільіч Лівенцаў нарадзіўся 21 красавіка 1918 г. у в. Давыдаўка Варонежскай вобласці.

Пасля вучобы ў Варонежскім педагагічным інстытуце В.І. Лівенцаў працаваў настаўнікам у сяродняй школе г. Ліскі Варонежскай вобласці. У 1938 годзе В.І. Лівенцаў быў прызваны на ваенную службу.

У час Вялікай Айчыннай вайны ў 1941 годзе Віктар Ільіч кіраваў падпольнай арганізацыяй ў г. Бабруйску. Больш за два гады ўдзельнічаў у актыўных баявых дзеяннях як камандзір партызанскага атрада 1-й Бабруйскай партызанскай брыгады.

Аўтарытэт і працавітасць, прафесіяналізм і рашучасць В.І. Лівенцава праявіліся і ў пасляваенныя гады ў час працы ў г. Мінску ў ЦК ЛКСМБ і ў праўленні Белпрамсавета.

Але самую значную частку свайго жыццёвага шляху — 20 гадоў — Віктар Ільіч аддаў сферы фізічнай культуры і спорту. У 1958 годзе В.І. Лівенцаў узначаліў Камітэт па фізічнай культуры і спорце пры Савеце Міністраў БССР: пад яго кіраўніцтвам у рэспубліцы былі дасягнутыя значныя поспехі ў развіцці фізічнай культуры і спорту. Беларускія спартсмены ў складзе зборных каманд СССР неаднаразова падымаліся на найвышэйшыя прыступкі спартыўных п'едэсталаў, з гонарам выступаючы на чэмпіянатах свету і Еўропы.

Пры актыўным удзеле В.І. Лівенцава пабудаваныя многія спартыўныя аб'екты, якія і сёння з'яўляюцца архітэктурнымі ўпрыгажэннямі г. Мінска і краіны, а таксама месцамі масавага адпачынку і базамі падрыхтоўкі спартыўнага рэзерву нацыянальных каманд. Сярод іх мінскі водна-спартыўны камбінат (САК «Алімпійскі»), алімпійскія спартыўныя комплексы («Раўбічы», «Стайкі»), гродзенскі і віцебскі тэхнікумы фізічнай культуры.

Знаходзячыся на пенсіі, В.І. Лівенцаў актыўна ўдзельнічаў у грамадскім жыцці. Яго неаднаразовыя шчырыя і пераканаўчыя выступленні па радыё і тэлебачанні, у іншых сродках масавай інфармацыі, спрыялі выхаванню моладзі на баявых і працоўных традыцыях беларускага народа. Акрамя гэтага, Віктар Ільіч рэгулярна адкрываў спартыўныя спаборніцтвы, удзельнічаў у мерапрыемствах, якія праводзіла Міністэрства спорту і турызму па ўганараванні алімпійскіх чэмпіёнаў.

В.І. Лівенцаў удастоены высокіх званняў: ён Герой Савецкага Саюза, заслужаны дзеяч фізічнай культуры і спорту БССР, узнагароджаны двума ордэнамі Леніна, двума ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнам «Знак Пашаны», ордэнам Дружбы народаў, а таксама многімі медалямі. У 2004 годзе яму аб'яўлена падзяка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Віктар Ільіч адносіўся да плеяды выбітных беларускіх дзеячаў, якія ўнеслі бясцэнны ўклад у развіццё фізічнай культуры і спорту ў Рэспубліцы Беларусь. Светлая памяць аб ім, пачуццё ўдзячнасці і павагі назаўжды застануцца ў нашых сэрцах.

У.М. Патупчык, А.Л. Качан, Г.П. Аляксеенка, А.М. Новікаў, М.А. Шчоткіна.

Па чутках і аўтарытэтна

Над якім «і» расставіць кропкі?

або Заваруха з двухмоўнымі недарэчнасцямі геаграфічных назваў у пытаннях і адказах

Па віртуальнай прасторы панесліся чуткі — Нацыянальнае кадастравае агенцтва (НКА) хоча русіфікаваць геаграфічныя назвы, адмаўляецца ад транслітарацыі іх на лацінку з беларускай мовы. Прыгадвалася дакладная запіска агенцтва ў Дзяржаўны камітэт па маёмасці. Карэспандэнт «Звязды» выправіўся напрасткі ў месца ўцечкі гэтай службовай інфармацыі, каб разабрацца ў сітуацыі. А цяпер і вы, чытачы, зможаце азнаёміцца з вынікамі праведзенага «расследавання» і інфармацыяй з першых вуснаў.

ДАВЕДКА НКА

Карэспандэнта «Звязды» добразычліва сустрэлі старшыня Дзяржкаммаёмасці Георгій Іванавіч Кузняцоў, намеснік старшыні Гаеў А.А., начальнік аддзела картаграфіі Кляшчоў В.Б., генеральны дырэктар НКА Філіпенка А.А. і адміністратар Рэестра АТА і ТА Павілан Г.П. і расказалі пра тое, якімі структурамі і якая работа праводзіцца ў частцы рэгулявання пытанняў, звязаных з найменнем геаграфічных аб'ектаў, да якіх адносяцца і назвы населеных пунктаў.

Цяпер вядзецца распрацоўка законапраекта «Аб найменнях геаграфічных аб'ектаў». Закон распрацоўваецца Нацыянальным цэнтрам заканадаўства і прававых даследаванняў РБ пры ўдзеле спецыялістаў Акадэміі навук РБ, Дзяржкаммаёмасці, БДУ, Міністэрства транспарту і камунікацый і інш. міністэрстваў і ведамстваў.

Найменні геаграфічных аб'ектаў, да якіх адносяцца і адміністрацыйна-тэрытарыяльныя і тэрытарыяльныя адзінкі, фізіка-геаграфічныя аб'екты, аб'екты транспартнай інфраструктуры, складаныя часткі населеных пунктаў, выкарыстоўваюцца для вырашэння многіх задач. У тым ліку для забеспячэння картаграфічнай дзейнасці, адрасацыі аб'ектаў і г.д.

У Рэспубліцы Беларусь каардынацыю дзейнасці па фарміраванні адзінага падыходу да найменняў і перайменавання геаграфічных аб'ектаў здзяйсняе Тапанімічная камісія пры Савеце Міністраў РБ (Камісія), у адпаведнасці з палажэннем «Аб Тапанімічнай камісіі пры Савеце Міністраў РБ», зацверджаным пастановай Саўміна ад 05.08.1998 № 1238. Камісія ў сваёй дзейнасці кіруецца Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, міжнароднымі дагаворамі і заканадаўствам.

Адна з функцый Камісіі — гэта ўзгадненне найменняў і перайменаванне геаграфічных аб'ектаў, у тым ліку населеных пунктаў.

У адпаведнасці з п.18 палажэння «Аб парадку найменняў і перайменавання геаграфічных аб'ектаў», зацверджанага пастановай №1238, Камісія разглядае прапановы аб найменні ці перайменаванні населеных пунктаў і падрыхтоўвае адпаведнае заключэнне ў выпадку ўтварэння новага населенага пункта ці пры перайменаванні наяўнага. Яно можа быць як станоўчае, так і адмоўнае.

Патрабаванні да найменняў вызначаныя Палажэннем «Аб парадку найменняў і перайменавання геаграфічных аб'ектаў», зацверджаным пастановай Саўміна № 1238 ад 05.08.1998. У прыватнасці, прысваенне найменняў аб'ектам здзяйсняецца з улікам геаграфічных, гістарычных, нацыянальных, побытавых і іншых умоў, найменні прысвойваюцца аб'ектам простыя, нешматслоўныя і павінны адпавядаць патрабаванням тапанімікі.

Таксама адной з функцый Камісіі з'яўляецца распрацоўка і стварэнне даведнікаў геаграфічных назваў. Яны носяць рэкамендацыйны характар. Распрацоўшчыкамі была праведзена велізарная работа па выяўленні гістарычных найменняў. У працэсе гэтай работы былі выяўлены назвы на рускай мове, якія разыходзяцца з назвамі, што прымяняюцца на сённяшні момант, і мясцовым органам улады прапануецца прыняць рашэнні па перайменаванні асобных населеных пунктаў, узяўшы за аснову назву, якая ёсць у даведніку. Такія назвы ў даведніку адзначаныя лічбамі, а растлумачэнне даецца ва ўводзінах. Згодна з Законам РБ «Аб адміністрацыйна-тэрытарыяльным дзяленні і вырашэнні пытанняў адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўладкавання РБ» ад 5 мая 1998 года, устаноўліваюць найменні Прэзідэнт РБ і мясцовыя органы ўлады ў адпаведнасці са сваёй кампетэнцыяй. Мясцовыя органы ўлады разгледзелі прапанаваныя назвы, і большая частка з іх была прынятая, але не ўсе. Прыклад: п. Новы Шлях, паводле даведніка на рускай мове — п. Новый Шлях, а паводле рашэння на рускай мове — Новый Путь.

На гэты момант усе назвы населеных пунктаў у рашэннях аб найменні ці перайменаванні пазначаюцца на беларускай і рускай мовах.

Пасля прыняцця рашэння яно разам з іншымі дакументамі накіроўваецца для рэгістрацыі ў адзіным рэестры адміністрацыйна-тэрытарыяльных і тэрытарыяльных адзінак РБ у НКА.

Рэестр АТА і ТА вядзецца з 1999 года, у ім улічваюцца ўсе адміністрацыйна-тэрытарыяльныя і тэрытарыяльныя змены, у тым ліку і найменні і перайменаванні. Рэестр вядзецца на дзвюх дзяржаўных мовах: рускай і беларускай. У рэестры ёсць «Гай» па-руску (у беларускім варыянце «Гай») на Міншчыне, а ёсць «Роща» («Рошча» па-беларуску) на Магілёўшчыне.

Звесткі аб назвах населеных пунктаў уносяцца з рашэнняў мясцовых органаў улады. Аднак назвы на беларускай мове населеных пунктаў не заўсёды пазначаліся ў рашэннях мясцовых органаў улады.

Фарміраваўся Рэестр АТА і ТА на аснове Агульнадзяржаўнага класіфікатара РБ «Сістэма абазначэнняў аб'ектаў адміністрацыйна-тэрытарыяльнага дзялення і населеных пунктаў РБ», зацверджанага Белстандартам ад 28.02.1994 № 2, і звестак мясцовых органаў улады.

Рэестр АТА і ТА з'яўляецца крыніцай інфармацыі для 30 дзяржаўных інфармацыйных рэсурсаў.

У НКА паступаюць рашэнні мясцовых органаў улады аб перайменаванні на рускай мове населеных пунктаў, элементаў вулічна-дарожнай сеткі. Прыклад: населены пункт Швабы, які да гэтага мяняў назву на рускай мове некалькі разоў: «Чирвоная Швабовка», «Чырвоная Швабовка», «Чирвоная Швабовка», а потым «Швабы».

З ЧАГО ЎСЯ КАША ЗАВАРЫЛАСЯ?

Са службовага дакумента Дзяржкартгеацэнтра (цэнтр географа-геадэзічных матэрыялаў і дадзеных Рэспублікі Беларусь), дзе прапануецца змяніць найменні 114 чыгуначных аб'ектаў на рускай мове. Асобна складзены пералік аб'ектаў, дзе «значна змяняецца найменне на рускай мове». Прыпынак «Лебяжий» у Мінску (ля рынка «Ждановічы», відаць, многім знаёмы), напрыклад, прапануюць перайменаваць па-руску ў «Лебединый» (па-беларуску «Лебядзіны»), прыпынак «Роща» (там дзе інтэрнаты БДУ) — у «Гай» (у адпаведнасці з беларускім «Гай»), «Строитель» — у «Будовник», гродзенскую станцыю «Учитель» — у «Наставник», брэсцкую «Сахарный завод» — у «Цукровый завод» (па-беларуску «Цукровы завод») і так 14 аб'ектаў, (астатнія 100, трэба меркаваць, будуць зменены незначна). Ад сябе дададзім тлумачэнне, што гэта адпавядае лінгвістычнаму прынцыпу транслітарацыі (а не перакладу!) геаграфічных назваў з нацыянальнай мовы на іншыя.

— Прааналізаваўшы прапанаваныя перайменаванні і назіраючы сітуацыю з неаднаразовым перайменаваннем населеных пунктаў, а таксама элементаў вулічна-дарожнай сеткі на працягу некалькіх гадоў, і НКА падрыхтавала сваю дакладную запіску на імя старшыні Дзяржаўнага камітэта па маёмасці (і адначасова старшыні Тапанімічнай камісіі) Георгія Кузняцова, — тлумачыць **адміністратар адзінага рэестра адміністрацыйна-тэрытарыяльных і тэрытарыяльных адзінак Рэспублікі Беларусь НКА, член Тапанімічнай камісіі пры Савеце міністраў Ганна ПАВІЛАН.** Падобныя перайменаванні, толькі населеных пунктаў, спрабавалі прапанаваць мясцовым органам улады ў 2003 годзе. Напрыклад, паводле рашэння Бярэзінскага раённага Савета дэпутатаў (а менавіта саветы дэпутатаў прымаюць рашэнні аб найменнях і перайменаваннях, Тапанімічная камісія можа толькі рэкамендаваць), былі перайменаваныя некаторыя населеныя пункты, у прыватнасці, вёска «Красный Пахарь» атрымала назву на рускай мове «Чирвоный Аратый». Гэта выклікала блытаніну ў сістэме адрасацыі, неразуменне такіх назваў на рускай мове і, такім чынам, абурэнне грамадзян. У сувязі з чым Бярэзінскі раённы Савет дэпутатаў праз два гады вырашыў вярнуць першапачатковае найменне на рускай мове — «Красный Пахарь». Толькі ў гэтым раёне былыя назвы вярнулі 26 аб'ектам. Усяго за 2003 год было перайменавана 77 аб'ектаў, большай частцы з іх праз два гады вярнулі старыя назвы. З чаго варта зрабіць высновы, што мясцовыя жыхары не падтрымліваюць палітыку змянення рускіх найменняў. Таксама не трэба забывацца, што ў адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь у краіне дзве дзяржаўныя мовы: руская і беларуская. Чаму ж адной з іх адаецца перавага?

НКА звяртае ўвагу і на фінансавы складальнік праблемы:

— Перайменаванне чыгуначных аб'ектаў пацягне матэрыяльныя і працоўныя выдаткі, — кажа **генеральны дырэктар НКА Андрэй ФІЛІПЕНКА**. — Грамадзянам давядзецца пераафармляць адрасы ў пашпартах, прадпрымальнікам — замяняць дакументы на фірму. І гэтыя працэдуры яны будуць аплачваць самі. Гэта пацягне за сабой шматлікія скаргі. Што ўжо казаць пра міжнародныя транспартныя перавозкі. Білет да нейкай беларускай станцыі можна купіць ва Уладзівастоку — там таксама трэба будзе ўсё мяняць, каб пасажыр трапіў у патрэбны пункт прызначэння.

ШТО ПРАПАНУЕ НКА?

— Па-першае, захоўваць прысвоеныя найменні населеных пунктаў на рускай мове, — інфармуе Андрэй Філіпенка. — Па-другое, рэкамендаваць мясцовым органам улады называць і перайменоўваць геаграфічныя аб'екты з улікам мясцовай нацыянальнай спецыфікі і меркавання мясцовых жыхароў, а не меркавання толькі мінскіх спецыялістаў, прысвойваць сугучныя найменні на рускай і беларускай мовах тым геаграфічным аб'ектам, якія ствараюцца. Напрыклад, «Медовая Поляна» па-руску і «Мядовая Паляна» па-беларуску. Па-трэцяе, перагледзець і ўнесці змены ў Інструкцыю па перадачы на рускую мову найменняў геаграфічных аб'ектаў Рэспублікі Беларусь, зацверджаную ў 2004 годзе.

ШТО ПРАПАНУЮЦЬ ЛІНГВІСТЫ?

Лінгвісты (у прыватнасці, **галоўны навуковы супрацоўнік Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы, доктар філалагічных навук, прафесар, член Тапанімічнай камісіі пры Савеце міністраў, старшыня Тапанімічнай камісіі пры Нацыянальнай акадэміі навук Валянціна ЛЕМЦЮГОВА)** прапануюць усе назвы транслітараваць з нацыянальнай мовы (беларускай) на іншыя, а не перакладаць — зноў жа каб не было блытаніны, што нехта едзе на станцыю «Гай», а нехта чакае прыпынку «Роща»...

ЯК БЫЦЬ З НОВЫМІ НАЗВАМІ?

Змадэлюем сітуацыю: я, беларускамоўная паненка, стварaю хутар і жадаю назваць яго «Агурок». Якім будзе рускі адпаведнік, пытаюся, — «Агурок» ці «Огурец»? «Агурок», паколькі назва першапачаткова прысвойвалася на беларускай мове», — кажа Ганна Павілан.

— Аднак да кожнага выпадку трэба падыходзіць індывідуальна, — адзначае Андрэй Філіпенка. — Бо ў Брэсцкай вобласці, напрыклад, людзі хочуць, каб быў ухіл, скажам, у бок беларускай мовы, а не выключана, што на мяжы са Смаленскай вобласцю захочуць, каб было па-іншаму. Мы лічым, што гэта правільна.

ЯКАЯ АСАБІСТАЯ ПАЗІЦЫЯ ГЕОРГІЯ КУЗНЯЦОВА?

— Мяркую, што тыя назвы, якія існуюць даўно, не трэба чапаць, — лічыць **старшыня Дзяржаўнага камітэта па маёмасці і старшыня Тапанімічнай камісіі пры Савеце міністраў.** — Паводле маёй рэзалюцыі па дакладной запісцы НКА будуць падрыхтаваныя матэрыялы да чарговага пасяджэння Тапанімічнай камісіі, якое адбудзецца ў кастрычніку. Рашэнне, безумоўна, будзе прымацца калегіяльна, у склад камісіі ўваходзіць каля 20 спецыялістаў у розных галінах, у тым ліку і ў лінгвістыцы.

Галоўнае, каб пасля доўгіх спрэчак спецыялісты розных сфер прыйшлі да кансенсусу. А гэта будзе вой як няпроста, улічваючы, што пазіцыі многіх удзельнікаў дыскусіі разыходзяцца...

ШТО ПАВІННА БЫЦЬ У ЗАКОНЕ?

Тапанімічны разнабой, магчыма, звязаны з тым, што парадак не поўнасцю адрэгуляваны заканадаўствам, вырашэнне спрэчных сітуацый застаецца на меркаванне мясцовых саветаў дэпутатаў. Было б інакш, калі б усе нюансы былі прапісаны ў законе, калі б былі выпрацаваныя адзіныя падыходы. Нагадаем, што работа над праектам нарматыўнага прававога акта аб назвах геаграфічных аб'ектаў якраз вядзецца.

— Я лічу, што гэты закон патрабуе шырокага грамадскага абмеркавання, паколькі закранаюцца інтарэсы многіх людзей і ёсць розныя пункты гледжання, — мяркуе Андрэй Філіпенка. — Пры распрацоўцы закона нам трэба ўлічваць не толькі міжнародны досвед, але і тыя асаблівасці нашай краіны, якія існуюць. Па-першае, у нас дзве роўныя дзяржаўныя мовы, па-другое, частцы геаграфічных аб'ектаў першапачаткова прысвоеныя назвы на рускай мове, а частцы — на беларускай. Таму мы мяркуем, што ў дачыненні да прысвоеных ужо назваў нельга прымяняць ні суцэльную «беларусіфікацыю», ні суцэльную «русіфікацыю». І ў законе трэба прадугледзець працяг таго ж індывідуальнага падыходу да кожнага населенага пункта.

Гендырэктар НКА лічыць магчымым правесці аналогію геаграфічных назваў з асабовымі імёнамі:

— У законе ад мовах сказана, што беларускія і рускія асабовыя імёны і прозвішчы ўжываюцца ў адпаведнасці з нацыянальнай іменнаслоўнай традыцыяй, нормамі і правіламі беларускай і рускай мовы, а асабовыя імёны і прозвішчы з іншых моў — недзяржаўных — транслітаруюцца. Магчыма, такі падыход можна будзе скарыстаць і ў дачыненні да найменняў геаграфічных аб'ектаў. Мяркую таксама, што падыход і правілы транслітарацыі на лацінку асабовых імёнаў і найменняў населеных пунктаў павінны быць аднолькавымі.

* * *

Перакладаць ці транслітараваць — вось у чым пытанне... Што будзе больш зручна для жыхароў тых населеных пунктаў? Над якім «і» расстаўляць кропкі... Дыскусія, зразумела, будзе мець працяг. Пажывём — пабачым.

Зоя ВАРАНЦОВА.

У Беларусі дапоўнены пералікі аперацый, за якія ўрачам выплачваецца павышаная зарплата

Пералікі высокатэхналагічных і складаных медыцынскіх умяшанняў дапоўнены новымі відамі медыцынскіх паслуг, аказанне якіх стала магчыма ў сувязі з выкарыстаннем у рэспубліцы новага сучаснага медыцынскага абсталявання і ўкаранення ў практыку найноўшых дасягненняў у галіне медыцыны. Прэзідэнт Беларусі 24 верасня падпісаў адпаведны ўказ № 467, якім унесены змяненні і дапаўненні ва ўказ ад 26 снежня 2005 года № 619 «Аб удасканаленні матэрыяльнага стымулявання асобных катэгорый урачоў.

Указам № 619 устаноўлена павышэнне ў 2,3-3,5 раза тарыфных акладаў урачам (хірургам і анестэзіёлагам-рэаніматолагам) дзяржаўных арганізацый аховы здароўя, якія маюць вышэйшую і першую кваліфікацыйныя катэгорыі, ажыццяўляюць высокатэхналагічныя і складаныя медыцынскія ўмяшанні згодна з прыкладзенымі да ўказа пералікамі. Адначасова з пералікаў выключаны тыя віды медыцынскай дапамогі, якія шырока ўкаранёныя ў працу арганізацый аховы здароўя і сталі звычайнымі аперацыямі. Указ уступае ў сілу пасля яго афіцыйнага апублікавання.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Аляксандр Лукашэнка і Дзмітрый Мядзведзеў 29 верасня возьмуць удзел у вучэнні «Захад-2009» і правядуць двухбаковую сустрэчу

Прэзідэнты Беларусі і Расіі Аляксандр Лукашэнка і Дзмітрый Мядзведзеў 29 верасня возьмуць удзел у аператыўна-стратэгічным вучэнні Узброеных Сілаў Беларусі і Расіі «Захад-2009».

У цэнтры ўвагі кіраўнікоў дзяржаў будуць знаходзіцца пытанні забеспячэння ваеннай бяспекі Саюзнай дзяржавы. Плануецца таксама, што прэзідэнты правядуць сустрэчу ў фармаце сам-насам, у ходзе якой будуць абмеркаваны актуальныя пытанні двухбаковага беларуска-расійскага супрацоўніцтва і міжнароднага парадку дня.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Патрыяршы візіт у Беларусь

ПАТРЫЯРХ ПАТЛУМАЧЫЎ, НАВОШТА СУЧАСНАМУ ЧАЛАВЕКУ ЦАРКВА

Тэмп, у якім Патрыярх працаваў падчас свайго візіту ў Беларусь, быў настолькі высокім, што, як заўважылі некаторыя з ліку тых, хто суправаджаў Яго Святейшаства, месца для рэфлексіі проста не заставалася. Таму асэнсаванне і аналіз з'явяцца пазней. Пакуль жа магчыма ў большай ступені канстатацыя таго, дзе пабываў і пра што сказаў кіраўнік Рускай Праваслаўнай Царквы. Царквы, з якой атаясамлівае сябе большасць вернікаў нашай краіны.

Мяркуйце самі. Першы дзень візіту, пятніца: Патрыярх прылятае з Масквы, наведвае кафедральны сабор, сустракаецца з кіраўніком дзяржавы, прыязджае ва Усясвяцкі храм, удзельнічае ва Урачыстым акце ў Палацы Рэспублікі. За гэты дзень Прадстаяцель сказаў пяць прамоў і даў інтэрв'ю журналістам.

Субота: Святейшы наведвае Епархіяльнае ўпраўленне, моліцца ў Крыжовай царкве, сустракаецца са студэнтамі і выкладчыкамі ў Інстытуце тэалогіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, чытае там лекцыю, ускладае вянок да Абеліска на плошчы Перамогі, аглядае Дом Міласэрнасці і ад'язджае ў Полацк, дзе ўзначальвае святочную ютрань, здзяйсняе чын Уздзвіжання Крыжа. У гэты дзень святейшы, акрамя 40-хвілінай доктарскай лекцыі ў Інстытуце тэалогіі, тройчы звяртаецца з прамовай да вернікаў і духавенства.

Нядзеля пачынаецца з Божай Літургіі ў Спаса-Ефрасіннеўскім жаночым манастыры Полацка, працягваецца аглядам Спаса-Праабражэнскага храма і фрэсак XII стагоддзя, прыёмам, які дае кіраўніцтва Полацка і Наваполацка, экскурсіяй па старажытным Сафійскім саборы, потым — пераезд у Віцебск, ускладанне кветак да мемарыяльнага Крыжа на месцы гібелі ахвяраў нацызму, пасадка памятнага дрэва, наведванне Свята-Пакроўскага кафедральнага сабора, удзел у цырымоніі адкрыцця Плошчы Перамогі... Пропаведзь і чатыры прамовы, адна з іх — перад шматтысячнай аўдыторыяй.

(Заканчэнне на 6-й стар.)

Патрыяршы візіт у Беларусь

ВІЦЯБЧАНЕ СУСТРЭЛІ СВЯЦЕЙШАГА ЎСМЕШКАМІ НА ТВАРАХ

Калі чын Уздзвіжання Крыжа быў цэнтральнай падзеяй сакральнай часткі візіту, то сустрэчы Патрыярха з гараджанамі і моладдзю ў Віцебску сталі самымі яскравымі момантамі для людзей свецкіх.

— Я езджу паўсюды з Патрыярхам каля года, аднак тут, у Беларусі, Яго Святейшаства сустракаюць асабліва, — падзяліўся асабісты фатограф Патрыярха Кірыл Наваторскі. — Асабліва гэта было заўважна ў Віцебску. Людзі на вуліцы пад халодным ветрам некалькі гадзін чакалі Прадстаяцеля, зразумела, усе замерзлі і стаміліся, аднак, як толькі яны ўбачылі Святейшага, іх твары расквітнелі ўсмешкамі. І бачыў шчырую радасць у вачах маладых людзей.

Каля трыццаці тысяч жыхароў і гасцей старажытнага Віцебска сабраліся ў выхадны дзень, нядзелю, 27 верасня на новай плошчы Перамогі. Людзі розных пакаленняў, моладзь, пажылыя, сем'і з дзецьмі прыйшлі сюды ў святочным адзенні, у іх руках былі сцяжкі з выявай Патрыярха і памятным надпісам на беларускай мове. Горад у гонар прыезду Святейшага запаліў усю сваю ілюмінацыю.

З вітальным словам да Патрыярха і ўсіх, хто сабраўся, звярнуўся старшыня Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта Аляксандр Косінец:

— Дзяржава і Царква адзіныя ў пабудове духоўнасці, у стварэнні прагрэсіўнага гуманістычнага грамадства, у забеспячэнні моцнай і працвітаючай Беларусі. Сёння Праваслаўная царква ўдзельнічае практычна ва ўсіх сацыяльных праграмах, яна адыгрывае вялікую ролю ў забеспячэнні стабільнасці грамадства.

У сваім адказе Святейшы Патрыярх надаў асаблівую ўвагу важнасці гэтай сустрэчы на Плошчы Перамогі, плошчы мужнасці, бо ў гэтым бачыцца сімвалічнае імкненне народа будаваць сваю Айчыну на вечных падмурках, якімі з'яўляюцца вера і нацыянальныя інтарэсы.

— Мы пражылі трагічныя дзесяцігоддзі XX стагоддзя, калі гераізм суседнічаў са здрадай, любоў да Радзімы — з жорсткім ганеннем Царквы. І вось сёння надышоў новы час! Вось чаму я такі шчаслівы бачыць вас, мае дарагія, вашы тварыы... — сказаў Патрыярх.

На наступны дзень да Патрыярха ішла моладзь. Каля шасці тысяч чалавек размясцілася ў Летнім амфітэатры Віцебска. Там, а таксама на Плошчы Свабоды былі ўсталяваныя вялікія экраны, на якія транслявалася выступленне Патрыярха. Сам Святейшы знаходзіўся ў зале Цэнтра культуры, куды таксама сабраліся студэнты вышэйшых навучальных устаноў горада, выкладчыкі і прадстаўнікі гарадской інтэлігенцыі. Такім чынам аўдыторыя Святейшага павялічылася яшчэ на дзве тысячы чалавек.

— Прыйсці сюды для мяне — сапраўдная падзея, — сказаў Аляксандр Мізула, студэнт 2 курса медыцынскага ўніверсітэта. — Я атрымаў магчымасць на свае вочы ўбачыць вялікага чалавека, адчуць, што такое рэлігія, зразумець, у чым сутнасць Бога і жыцця. Я хачу паслухаць Патрыярха і знайсці адказ на тыя найважнейшыя пытанні, якія мяне хвалююць.

І было падобна, што не толькі моладзь, якая прыйшла на сустрэчу, але ўсе, хто ўчора чуў Патрыярха ў Віцебску, знайшлі адказы на многія свае пытанні. Напэўна, такі ўжо талент гэтага чалавека — размаўляць з любой аўдыторыяй пра тое, што гэту аўдыторыю хвалюе.

Патрыярх адзначыў, што яму як пастару таксама важная гэта сустрэча. А казаў ён пра сэнс жыцця, пра любоў, пра тое, чаму патрэбная маладым людзям адукацыя і як чалавеку не зламацца пад ударамі жыцця.

— Для таго, каб жыццё было шчаслівым, нават пад уздзеяннем знешніх абставін, якімі б яны ні былі, — казаў архіпастыр, — важна сфарміраваць моцнага ўнутранага чалавека.

Патрыярх закрануў тэмы асаблівасці маладога ўзросту, удасканалення ўнутранай прыроды чалавека, феномену прыроджанага маральнага пачуцця, значнасці станоўчага героя ў культуры і жыцці, крызісу сучасных еўрапейскіх каштоўнасцяў, правоў і свабоды чалавека, чалавечых трагедый, у аснове якіх ляжаць навуковыя ідэі і адсутнічае рэлігійная і маральная адказнасць іх аўтараў і прыхільнікаў.

Маладыя людзі выходзілі з гэтай сустрэчы задаволеныя і натхнёныя.

— Яго словы былі непаўторныя, ён казаў якраз тое, што патрэбна было нам, маладым, пра любоў, пра пачуццё абароны ў гэтым жыцці, — падзялілася сваімі ўражаннямі студэнтка 2 курса ветэрынарнай акадэміі Анжэла Праскоўская. — Мы, калі ішлі на гэту сустрэчу, чакалі, што размова будзе цікавай, але не думалі, што яна настолькі нас усхвалюе.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

АПЕРАЦЫЯ — «ЛІКВІДАЦЫЯ»

Нехта аблюбаваў стары нежылы хутар каля вёскі Мінянка Кобрынскага раёна і абсталяваў там міні-заводзік па вытворчасці самагонкі.

І мяркуючы па ўсім, вытворчасць прасоўвалася даволі паспяхова. Бо калі ў хату зазірнулі праваахоўнікі з рэйдам, то знайшлі ў пасудзінах ажно 750 літраў брагі. Завод, усё яго абсталяванне і сыравіну знішчылі. Гаспадара «прадпрыемства» пакуль устанавіць не ўдалося.

Яна СВЕТАВА.

Абзац

◢ Участковы інспектар Першамайскага РАУС Віцебска дапамог правярнуць аферу з крадзяжом буйной нелегальнай партыі прадукцыі з утрыманнем спірту. Да 28-гадовага старшага лейтэнанта міліцыі звярнуўся знаёмы, які расказаў, што ў адным з прыватных дамоў захоўваецца вялікая партыя градуснай вадкасці. Каб скрасці тавар, што захоўваўся незаконна, двум зламыснікам патрабаваўся сапраўды прадстаўнік законнасці. Міліцыянер згадзіўся і пад выглядам праверкі званка імітаваў канфіскацыю 16-ці 200-літровых бочак. За злоўжыванне службовымі паўнамоцтвамі былы ўчасковы інспектар асуджаны на 4 гады пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці, пазбаўленнем права працаваць у органах 5 гадоў і прыгавораны да штрафу ў памеры Br7 млн. Асуджаныя і яго саўдзельнікі.

◢ **Маці і двое дзяцей загінулі на пажары ў Старадарожскім раёне. Трагедыя адбылася ў прыватным жылым доме ў вёсцы Залужжа а трэцяй гадзіне ночы. У выніку пажару загінула жанчына і двое яе дзяцей, 2004 і 2008 гадоў нараджэння. Згодна з папярэдняй версіяй, прычынай пажару стала парушэнне правілаў эксплуатацыі пячнога ацяплення.**

Поўны абзац

◢ Памочнік менеджара адной з крамаў у гандлёвым цэнтры «Дубай Мол» у Аб'яднаных Эміратах, адэсітка Вікторыя Малярэнка, вярнула індыйскаму пакупніку забыты ім у краме пакет з 500 тыс. дырхамаў (больш за $270 тыс.). Забыўлівым пакупніком быў буйны індыйскі бізнэсмен, які жыве тут апошнія дзесяцігоддзі. Ён зайшоў у краму купіць пакунак шакаладу, забраў яго, а пакет з грашыма, толькі што атрыманымі ў адным з банкаў, пакінуў. Гаспадара грошай жанчына знайшла з дапамогай квітанцыі і аднесла іх у банк, адкуль і пазванілі бізнэсмену. Ён, дарэчы, прапажу так і не выявіў. Вікторыя Малярэнка не палічыла свой учынак адметным і нават адмовілася ад прапанаванага ўзнагароджання.

◢ **У Ніжагародскай вобласці вынесены судовы прыгавор вартаўніку дачнага пасёлка. Парфірый Макунін разлавaваўся на дачнікаў, якія адмовіліся падняць яму зарплату, і вырашыў адпомсціць. Не доўга думаючы, вартаўнік спаліў 18 дамоў. Цяпер найбліжэйшыя 6 гадоў ён правядзе ў турме. Доўгі час дачнікі плацілі пенсіянеру па 50 рублёў з кожнага дома за ахову пасёлка, але ён палічыў суму недастатковай і запатрабаваў падняць аплату да 90 рублёў. Яго не падтрымалі і на сходзе кааператыву пастанавілі наогул адмовіцца ад яго паслуг. Пакрыўджаны вартаўнік узброіўся бутэлькамі з гаручай сумессю, разбіваў вокны дамкоў і кідаў туды небяспечныя бутэлькі, запаліўшы іх. За лічаныя хвіліны палова пасёлка згарэла ўшчэнт. Урон склаў больш за 5 млн расійскіх рублёў. На шчасце, людзі не пацярпелі.**

◢ У Харкаўскі заапарк можна трапіць і без грошай — за 5 кг жалудоў. Кіраўніцтва заапарка аб'явіла акцыю па нарыхтоўцы корму для жывёл. Кожны, хто прынясе не менш за 5 кг якасных жалудоў і агародніны, атрымлівае права на бясплатнае наведванне заапарка.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

БРАТ З СЯСТРОЙ ТРАПІЛІ ПАД АЎТО

У Салігорскім раёне ў дарожна-транспартным здарэнні загінуў хлопчык, а яго сястра пацярпела.

Паводле звестак аддзялення інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Мінаблвыканкама, здарэнне было зафіксаванае ў нядзелю каля паловы чацвёртай дня на перакрыжаванні раўнаznачных дарог па вуліцы Кальцавой у пасёлку Навапалескі. 39-гадовы кіроўца, які знаходзіўся за рулём службовага аўтамабіля «ГАЗ», учыніў наезд на вучня другога класа: хлопчык ехаў на веласіпедзе. Школьнік у аварыі загінуў, а сястра, якая нарадзілася ў 2004 годзе і ехала з ім, з цялесным пашкоджаннямі была шпіталізаваная.

А паблізу вёскі Сітня Калінкавіцкага раёна ў гэты ж дзень жыхар Мінска, які кіраваў аўтобусам «МАЗ», пры павароце налева сутыкнуўся з аўтамабілем «Рэно». У гэтым здарэнні загінула жанчына, што знаходзілася ў легкавушцы. А кіроўца «Рэно» і тры пасажыры аўтобуса — вясковец і двое навучэнцаў каледжа — былі змешчаныя ў бальніцу.

Ігар ГРЫШЫН.

У ВЕТЭРАНА СКРА

ВОЛЬНАЯ СЫТАЯ ВЁСКА

У першы крызіс пераехалі ў вёску, таму другі — не заўважылі



Ларыса Сямёнаўна МАСКАЛЁВА выносіць на падворак галоўных герояў сезона — трох перапёлак. Маленькія і стракатыя шэра-карычневыя птушкі людзей не пужаюцца. А вось калі клеткай зацікавіліся індыкі, пачалі лезці дзюбамі і частавацца кормам, адна з перапёлак, нібыта з пратэстам, рэзка скокнула са свайго жытла, але трапіла ў звыклыя рукі гаспадыні.

Пад рукамі былой гараджанкі таматы растуць гронкамі і спеюць аж да лістапада.

— Штодзень мае перапёлачкі нясуць два яйкі, — тлумачыць жанчына. — Я іх, шчыра кажучы, ніколі не каштавала: усе яйкі, да аднаго, прызначаныя для маёй 9-гадовай унучкі Лізы, у якой моцная алергія. Яна не можа есці цытрусавыя, піць сокі. Я спецыяльна гэтых птушак завяла, бо мне сказалі, што толькі перапяліныя яйкі дапамогуць малой.

Цяпер штодзённы абавязак дзяўчынкі: з'есці гогаль-могаль з цукрам альбо амлет. А бабулі даводзіцца даглядаць перапёлак: аказваецца, гэтыя птушкі маюць патрэбу ў цяпле, але не любяць прамыя сонечныя промні.

Аднак перапёлкі — гэта толькі маленькая частка вялікай гаспадаркі і сямейнай гісторыі. Ларыса Сямёнаўна калісьці жыла ў раённым цэнтры. Праўда, сваю кватэру ў Клімавічах яна цяпер называе «шпакоўняй на другім паверсе». Па прафесіі майстар-масароб, яна працавала на прадпрыемстве, але на пачатку 1990-х вырашыла змяніць месца жыхарства.

— Тады такі быў час, калі ўсе схапіліся за зямлю, — узгадвае жанчына. — У 1991 годзе мы з мужам набылі хатку ў вёсцы Зімніцы. За яе мы аддалі паўтары тысячы рублёў. Не памятаю, колькі гэта было долараў, але танна.

Вясковае лецішча гараджанам спадабалася: у любых жыццёвых сітуацыях са свайго агарода можна было пракарміцца. Практыка ў мужа і жонкі была, бо яны родам з вёсак, а Ларыса Сямёнаўна яшчэ школьніцай замяніла на гаспадарцы маці, якая захварэла.

Лецішча з цягам часу пашырылася лазняй, а потым Маскалёвы завялі жывёлу — карову, парсючкоў, гусей і курэй. Таму калі дачка пайшла замуж і ёй спатрэбілася асобная жылплошча, бацькі без шкадавання зусім кінулі горад і капітальна аселі ў Зімніцах: «Нам тут падабаецца!»

— Мы ў 1990-я крызісу не адчувалі, і цяпер не заўважылі, — запэўнівае жанчына. — Нават у той час, калі былі квіткі, мы тут на волі смачна елі. Я не працую на продаж, але заўсёды маю на стале малако, смятану і тварог. Мы заўсёды сытыя, і нашы дзеці таксама.

Разам з тым, гараджане і не думалі адмаўляцца ад жыллёвага камфорту і добраўпарадкавання. Вясковая хата Маскалёвых — гэта не нейкае сярэднявечнае жытло без выгодаў. Гаспадары самі выкапалі калодзеж, усталявалі помпу, правялі трубы пад зямлёй і ў выніку атрымалі ваду ў хаце — можна і ванную прымаць пры жаданні, а таксама і цёплую прыбіральню, якая з'яўляецца светлай марай любога вяскоўца.

Муж Васіль Нікіфаравіч выявіў у сябе здольнасці дызайнера і акультурыў навакольную тэрыторыю: з выкінутага на сметнік металалому зрабіў выдатныя рэчы. З сетак старых ложкаў атрымалася арыгінальная агароджа, колы пайшлі на дэкаратыўнае ўпрыгажэнне, старыя жалязякі сталі лаўкамі, і нават стары таз пераўтварыўся. Васіль Нікіфаравіч пафарбаваў усё гэтае «б/к багацце» ў модныя бэзавыя, ружовыя і фіялетавыя колеры. У тон падабраны кветкі, якія цвітуць каля хаты і цяпер.

Саму хату найбольш упрыгожваюць каты, якія спяць на падваконнях. Гаспадыня называе іх «мяшанцамі», бо ў гэтых катах сапраўды змяшалася сіямская і еўрапейская пароды, і атрымаліся сінія вочы і карычневыя палоскі.

На вуліцы непадалёк ад індыкоў важна ходзяць пеўнік і куры з махровымі лапамі. Чарада белых гусей топчацца каля лужыны. Каровы пасуцца на полі. Каля хаты прыпаркаваны трактар.

Вялізны сабака брэша на гасцей: мянушка Жулькі не адпавядае яе пагражальнай знешнасці — вераголна, літаральна так выглядала сабака Баскервіляў.

— Гэта помесь каўказскай і нямецкай аўчарак, а выкарміла шчанюка сабака-баксёр, — каментуе Ларыса Сямёнаўна.

Гаспадыня вядзе далей: яна хоча прадэманстраваць у парніку сваю гордасць — таматы.

— Паглядзіце, другая палова верасня, а ў мяне поўны парнік таматаў: прычым не чырвоных, а зялёных, якія яшчэ будуць саспяваць, — паказвае яна. — Я іх да савецкіх кастрычніцкіх святаў звычайна збіраю. А сакрэт? Не, ніякай хіміі і адмысловых тэхналогій. Проста пад маімі рукамі расце.

З таматаў Маскалёва робіць сок, усю гародніну закручвае на зіму. А сунічная наліўка і вішнёвая настойка — гэта адзіны алкаголь, які ўжываюць у гэтай сям'і, ды і тое крышку на святы.

— Я жадаю людзям, каб яны працавалі і не пілі, — кажа Ларыса Сямёнаўна. — Я часам заўважаю, як маладыя людзі співаюцца: гэта страшна. А ад працы прынамсі яшчэ ніхто не паміраў.

«Хто працуе — той і жыве», — такое перакананне Маскалёвых. Пад'ём — а 4-й раніцы, адбой — калі давядзецца. Цяпер раней становіцца цёмна, то можна і тэлевізар паглядзець. Улетку ж, прызнаецца Ларыса Сямёнаўна, ніхто і не ўключае тэлевізар — ён проста стаіць «для мэблі». Сельскія працаўнікі ў сезон прыходзяць у хату толькі спаць.

У вёсцы працы шмат, але Маскалёвы ніколі не пашкадавалі аб сваім пераездзе. Самы важны аргумент для Ларысы Сямёнаўны — магчымасць дапамагчы дачцэ:

— Калі б была гарадской пенсіянеркай, то атрымлівала б грошы толькі сабе на пражытак. А так гаспадарка забяспечвае харчамі і нас з мужам, і сям'ю дачкі, якая працуе медыкам і мае невялікі заробак. А, па-другое, як можна ў вёсцы жыць і гаспадарку не трымаць? Бо рух — гэта ж жыццё!

Ларыса Сямёнаўна прызнаецца, што хутка прызвычаілася да вясковага жыцця: нават проста заначаваць у гарадской кватэры — праблема для яе і мужа. Яны любяць прыроду, збіраюць ягады і грыбы з вясны да позняй восені. Ім даспадобы вольнае жыццё, чыстае паветра, цішыня і спакой, дружалюбныя суседзі. Унучка праводзіць у Зімніцах цэлае лета.

— Я люблю ўсё гэта, — гаспадыня нібыта абдымае рукамі падворак. — Гаспадарка вялікая. Часам бывае цяжка, але ўсё адно цікава. Калі б вы ведалі, як цікава даглядаць маленькіх індыкоў! А наша чарада гусей? Кожны свааяк пад новы год атрымлівае ад нас падарунак — гусака. Так што калі і працую шмат — дык то без прымусу, і не на кагосьці — а на сябе і на родных людзей. Калі цяжка ў горадзе — даваймa ў вёску!

Гусаркоўскі сельсавет, на тэрыторыі якога месцяцца Зімніцы, ужо мае вопыт перасялення гараджанаў у вёскі. Тут арганізавалі сваю працу браты Суздалевы, пра якіх пісала «Звязда». Нагадаем: гараджане з Клімавічаў прадалі «БМВ», набылі кароў і сталі зарабляць вытворчасцю малака. Цяпер, расказалі ў Клімавіцкім райвыканкаме, Суздалевым перадалі ферму, якая пуставала.

Побач з Маскалёвымі ёсць падворак, дзе карэнная масквічка ўпраўляецца з вялікай хатняй гаспадаркай.

— У нас добры сельсавет, які людзям дапамагае, — кажуць у Зімніцах. — Для нас тут галоўнае — узімку чысціць дарогі, каб не адрэзала ад свету. Да горада недалёка, многія ездзяць у Клімавічы на працу, таму нам патрэбныя шляхі зносінаў паміж горадам і вёскай.

Ілона ІВАНОВА.

Клімавіцкі раён.

Перапёлкі для Лізы: іх яйкамі бабуля лечыць унучку ад алергіі.

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

ПРЫ ЗМЯНЕННІ СКЛАДУ СЯМ'І ПРАВОДЗІЦЦА ПЕРАРАЗЛІК НАЛЕЖНАГА ПАМЕРУ ЛЬГОТНАГА КРЭДЫТУ

З горада Гарадка са сваёй праблемай і просьбай аб дапамозе патэлефанаваў Сяргей Васільевіч Карніленка. Датычылася яна жыллёва-будаўнічай сферы. Заяўнік разам з маці пражывае ў службовай кватэры. Паколькі стаяў у чарзе на будаўніцтва ўласнага жылля, увосень мінулага года ўступіў у кааператыў, атрымаў льготны крэдыт і пачаў будаваць аднапакаёвую кватэру плошчай амаль 40 квадратных метраў. Падавалася б, яшчэ крыху — і вось яны, доўгачаканыя ўласныя «квадраты». Аднак узнікла адна праблема...

— Напачатку я адзін быў уключаны ў спіс членаў жыллёва-будаўнічага кааператыва № 11 — як асоба з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў, якая мае права на атрыманне льготнага крэдыту. Аднак потым уключыў у склад сям'і сваю маці, каб не даплачваць за лішні метраж. Там выходзіла каля 5 мільёнаў рублёў. Падаецца, усё было вырашана. Аднак нядаўна бухгалтар кааператыва паведаміла мне, што я павінен даплаціць 835 тысяч рублёў. У мяне такіх сродкаў няма. За што? Кажуць, за той час, пакуль я быў у чарзе адзін. Дык ці правамоцна гэта? — пытаўся заяўнік.

Па дапамогу ў высвятленні сітуацыі мы звярнуліся да **галоўнага спецыяліста аддзела архітэктуры і будаўніцтва Гарадоцкага райвыканкама Ніны ЛЕВАНЧУК**. Ёй спатрэбіўся літаральна дзень, каб зрабіць неабходныя запыты і даць падрабязны адказ.

Так, сапраўды, нашаму заяўніку ў пачатку красавіка 2009 года ў філіяле № 207 ААТ «ААБ Беларусбанк» была адкрытая крэдытная лінія на будаўніцтва кватэры ў жыллёва-будаўнічым кааператыве № 11. Нарміраваныя памеры агульнай плошчы жылога памяшкання, што будуецца, для вызначэння велічыні льготнага крэдыту ўстанаўліваюцца пры будаўніцтве для аднаго чалавека аднапакаёвай кватэры — 36 квадратных метраў. А ў канцы таго ж красавіка ў філіял паступіў спіс грамадзян, што мелі патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў і права на атрыманне льготных крэдытаў, у якім у склад сям'і заяўніка была ўключана яго маці.

А згодна з пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 992 ад 24 ліпеня 2002 года «Аб зацвярджэнні палажэння аб парадку і ўмовах выдзялення грамадзянам льготных крэдытаў на будаўніцтва (рэканструкцыю) ці набыццё жылых памяшканняў», пры змяненні складу сям'і грамадзяніна ў перыяд вядзення будаўніцтва (рэканструкцыі) жылога памяшкання і ўнясенні ў вызначаным парадку змяненняў у спісы льготнага крэдытавання праводзіцца пераразлік належнага памеру льготнага крэдыту — з моманту ўзнікнення падстаў з улікам будаўнічай гатоўнасці жылога памяшкання. Працэнт будаўнічай гатоўнасці аб'екта на дату змянення сям'і складаў 48 працэнтаў. Калі пакінуць па-за кадрам усе матэматычныя падлікі, выходзячы з вышэйсказанага вынікае сума, якую павінен даплаціць наш чытач — амаль 835 тысяч рублёў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ЗА «ВОЛГУ» ВОЛЬЗЕ НЕ СОРАМНА

Менавіта таму дзяўчына прыехала на сваёй даволі сталай «сяброўцы» (фота) для ўдзелу ў выставе рэтра-аўтамабіляў, якая праходзіць у межах фінальных рэспубліканскіх спаборніцтваў па прафесійным майстэрстве кіроўцаў аўтамабіляў у Гомелі.

45 лепшых вадзіцеляў, сярод якіх прадстаўнікі кожнай з абласцей Беларусі, прыехалі ў горад над Сожам, каб даказаць, што менавіта яны самыя лепшыя ў прафесійным майстэрстве сярод калег. Між іншым, яны былі выбраны пасля паэтапнай, шматмесячнай барацьбы сярод 1000 прафесіяналаў галіны.

Як расказвае галоўны суддзя спаборніцтваў Міхаіл Свістуноў, для вызначэння найлепшых выкарыстоўваюцца традыцыйныя прыёмы, якія кіроўцы часцей за ўсё прымяняюць у рэальным жыцці: пад'езд да прыпынку, пасадка пасажыраў, бакавая паркоўка, габарытны тунэль, змейка... Самай цікавай і відовішчнай, абяцаюць арганізатары, стане аўтаэстафета. Рэспубліканскае аўтатранспартнае ўнітарнае прадпрыемства «Гомельаблаўтатранс», якое сёння стала гаспадаром рэспубліканскіх спаборніцтваў, — самае вялікае сярод абласных па аб'ёмах перавозкі пасажыраў.

— Даўжыня аўтобусаў нашага аўтапарка, калі іх выстраіць у адзін рад, складзе 12 кіламетраў, — гаворыць кіраўнік прадпрыемства Аляксандр Драпеза. І абяцае, што сам прыме ўдзел у спаборніцтвах: — Даўно за «баранкам» МАЗа не сядзеў, трэба ўспомніць. Такая ж магчымасць ёсць літаральна ў кожнага, хто мае пэўныя катэгорыі кіроўцаў. За правільнае выкананне практыкаванняў можна да таго ж і прыз атрымаць.

Ну а прафесіяналы спаборнічаюць у пяці асноўных намінацыях: кіроўцы аўтобусаў, самазвалаў, цягачоў, мікрааўтобусаў, легкавых аўтамабіляў. Між тым, з моманту, калі былі адроджаны падобныя прафесійныя спаборніцтвы, паступова пайшла ўніз крывая дарожна-транспартных здарэнняў, адзначае старшыня аргкамітэта спаборніцтваў, намеснік міністра транспарту і камунікацый Аляксандр Несцяровіч:

— У дарожна-транспартныя здарэнні прафесіяналы трапляюць у 1,4 раза менш, чым аматары. За 8 месяцаў года па рэспубліцы загінула 760 чалавек, гэта на 17 % менш, чым летась за адпаведны перыяд. Можа, трэба і сярод аматараў праводзіць такія спаборніцтвы? Сёння ж атрымліваецца так: чалавек атрымаў правы 10-15 гадоў таму. Змяніліся транспартныя сродкі, правілы дарожнага руху, дарожныя пакрыцці — а кіроўца ездзіць, як яго 15 гадоў таму навучылі, і не ўдасканальваецца прафесійна, што можа ўрэшце прывесці да аварыі. Тым часам, за апошнія пяць гадоў на дарогах рэспублікі дабавілася 2,5 мільёна аўтамабіляў, значыць, павысілася шчыльнасць руху. Заторы на дарогах сталі звычайнасцю, асабліва ў буйных гарадах. У гэтых умовах важна ўсё: і своечасовы тэхагляд, і дасканалае карыстанне ўсім, што прапануе аўтарынак... Але чалавек застаецца галоўнай дзейнай фігурай, бо ў трох з чатырох здарэнняў пэўным чынам менавіта ад чалавека залежыць вынік ДТЗ. Да аварыі прыводзіць і недастатковае веданне правілаў дарожнага руху, і няўменне прагназаваць дарожную сітуацыю, і няправільнае прымяненне прыёмаў кіравання аўто, і няведанне пэўных характарыстык канкрэтнага аўтамабіля, і пераацэнка асабістых магчымасцяў, і адсутнасць самакантролю...

Гэтых хібаў у прафесійных вадзіцеляў быць не павінна. І таму за выкананнем практыкаванняў, што праходзяць на тэрыторыі Гомельскага аўтапарка № 6, пільна сочаць усе службы, у тым ліку і ДАІ. Да таго ж арганізавана відэазаправанджэнне — ход спаборніцтваў можна бачыць на вялізным экране. Ну, а самыя-самыя па індывідуальных і камандных выніках атрымаюць не толькі віншаванні калег, але і складаную бытавую тэхніку ў падарунак.

Ірына АСТАШКЕВІЧ. Фота аўтара.

У ГАЛЬШАНЫ — НА ФЭСТ!

У першую суботу кастрычніка адбудзецца фестываль «Гальшанскі замак»

З кастрычніка Гальшаны пераўтворацца ў сапраўднае старажытнае мястэчка, якім было калісьці. Тут пройдзе фестываль «Гальшанскі замак», які наладзілі турыстычнае агенцтва «Гісторыя-Тур» і Ашмянскі райвыканкам. Што адбудзецца падчас арыгінальнага фэсту, як на дзень патрапіць у сярэднявечча? На пытанні карэспандэнта «Звязды» адказвае дырэктар агенцтва «Гісторыя-Тур» Алесь КУШНЕР.

— Ідэя правядзення фестывалю ўзнікла даволі даўно, — заўважыў спадар Алесь. — Варта правесці мерапрыемства такога кшталту, паколькі няшмат іх можна цяпер налічыць. Быў Навагрудскі фэст, быў Лідскі, але, на жаль, яны больш не ладзяцца. Як паказала практыка, мясцовыя ўлады не былі падрыхтаваныя да правядзення падобных мерапрыемстваў. У нашым выпадку атрымалася інакш — калі звярнуліся з прапановай аб арганізацыі фестывалю, то знайшлі паразуменне з Ашмянскім райвыканкамам. Адразу была створана адпаведная рабочая група, і пачалі працаваць. Усё канкрэтна, па-дзелавому — мне вельмі падабаюцца такія адносіны.

— Месца для правядзення фэсту, напэўна ж, выбралі адмыслова?

— Зразумела, шукалі варыянты і Гальшаны ў гэтым плане, як нам падаецца, найбольш падыходзяць. Месца вельмі вядомае, яго апеў Уладзімір Караткевіч. Думаю, што не знойдзецца чалавека, які б не чытаў «Чорны замак Альшанскі». Людзі, што да нас тэлефануюць, каб замовіць квіткі на фестываль, адразу пра гэта ўзгадваюць. Адпаведна, з'явілася назва фэсту, яна прыйшла неяк сама па сабе, асабліва спрачацца наконт гэтага не давялося. Гальшанскі замак — сапраўдны брэнд, які прыцягвае ўвагу многіх людзей. І не толькі ў Беларусі, паколькі на фестываль прыедуць людзі і з Расіі, Літвы.

— Мяркуючы па вашых словах, цікавасць да мерапрыемства вялікая?

— Рэзананс сапраўды значны — тэлефануюць людзі з усіх куткоў Беларусі. Думаю, што на фэст збярэцца шмат гасцей. Мы спецыяльна падабралі дату: пачатак кастрычніка, большасць сельскагаспадарчых работ завершаныя і можна са спакойнай душой добра адпачыць. Першы фестываль «Гальшанскі замак» прысвечаны 10-годдзю гурта «Стары Ольса». Мы імкнуліся зрабіць тэматычны фэст, каб людзі не толькі адпачылі, але і знайшлі нешта новае для сябе. Адбудзецца вялікі канцэрт «Старога Ольсы», а перад гэтым выступяць іх сябры — групы «Тэстаментум тэра», «Расалія» і «Келіх кола». Музычную праграму таксама арганізуе і Ашмянскі райвыканкам, у яе межах — выступленні самадзейных калектываў, нават цыгане завітаюць! Так што «салянка» атрымаецца даволі цікавая і разнастайная, на розны густ.

— Алесь, а што яшчэ адбудзецца ў Гальшанах?

— А дванаццатай гадзіне пачнуць працаваць гандлёвыя пункты, рыцарскія атракцыёны. У людзей будзе магчымасць пастраляць з арбалетаў, лукаў, пакідаць дзіду і сякеру. Можна пафатаграфавацца з сярэднявечнымі ваярамі. Будзе створаны сапраўдны рыцарскі лагер — з чанамі, вогнішчамі, паходнямі. Таксама выставяць макеты з выявамі князя і князёўны, можна будзе ўсунуць твар у прарэз і сфатаграфавацца ў такой высокай кампаніі. Пры жаданні магчыма праехацца і на конях — такія прагулкі ладзіць конна-спартыўны клуб «Гіпіка». Будзе арганізаваны продаж ежы, пітва. Харчаванне максімальна набліжана да сярэднявечнага, наколькі гэта магчыма ў цяперашніх умовах. Дабрацца ў Гальшаны можна як цэнтралізавана (на аўтобусах «Гісторыі-Тура»), так і сваім ходам — па гродзенскай трасе. Квіткі магчыма замовіць загадзя па тэлефоне (8-029) 677-00-46 (па Мінску кур'ер даставіць іх бясплатна), таксама яны будуць рэалізоўвацца на ўваходзе ў дзень правядзення фэсту. Для транспарту гасцей зрабілі добрую стаянку, так што наконт паркоўкі праблем не ўзнікне. Хацелася б выказаць падзяку партнёрам фестывалю — ААТ «Пріорбанк» і рэстарацыі «Камяніца».

— Фэст стане традыцыйным?

— Спадзяёмся, што ўсё так і будзе. Налета ёсць цудоўная падстава, каб сабрацца ў Гальшанах. Будзе адзначацца 400-годдзе ўзвядзення замка. Думаю, мы і надалей будзем пазіцыянаваць фестываль, як тэматычны. Людзі цікавяцца ўласнай гісторыяй і варта ім дапамагаць адкрываць для сябе ўласную краіну. Апошнім часам вельмі ўзрос попыт на гістарычны турызм. Чым выклікана такая сітуацыя не ведае ніхто, але з'ява, пагадзіцеся, пазітыўная. Людзі павінны ведаць гісторыю — напэўна, гэта самая лепшая ідэалогія. Правядзенне фэсту — магчымасць прыцягнуць увагу да Ашмяншчыны. Тут шмат гісторыка-культурных аб'ектаў, вельмі маляўнічыя мясціны. Не варта забываць, што гэта памежная тэрыторыя і ў найбліжэйшы час можна чакаць замежных турыстаў. Варта загадзя падрыхтавацца да прыёму гасцей, каб ім было што паказаць.

Фестываль, вядома ж, — яшчэ адна спроба прыцягнуць увагу да Гальшанскага замка. З'явілася інфармацыя наконт таго, што гэты аб'ект будзе закансерваваны і на прылеглай тэрыторыі мяркуецца зрабіць усю неабходную інфраструктуру для адпачынку. Так што шанцы на будучыню ў Гальшанскага замка неблагія, думаю, што з нашай дапамогай яны павялічацца.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

АЙЧЫННАЙ «МАБІЛЕ» ЎСЁ Ж БЫЦЬ?

Пра магчымы выпуск беларускіх мабільных тэлефонаў спецыялізаваным цэхам Мастоўскай сельгастэхнікі мы пісалі яшчэ ўвесну. На прадпрыемстве вырабілі некалькі доследных апаратаў, якія тады праходзілі выпрабаванні. Чакалася, што вось-вось будзе абвешчана: наладжваецца серыйны выпуск... Нядаўна з'явілася інфармацыя, што быццам бы вытворчасць айчынных мабільнікаў будзе распачатая ўжо ў найбліжэйшы час.

На самім прадпрыемстве папрасілі ўстрымацца ад агучвання нейкіх канкрэтных тэрмінаў пачатку вытворчасці. Як высветлілася, выпрабаванні доследных узораў яшчэ працягваюцца, паведаміў вядучы інжынер Мікалай Русіноўскі. Па іх канчатковым заканчэнні і будзе прымацца рашэнне. Разам з тым суразмоўца дадаў, што першапачатковы план — выраблянь мабільныя тэлефоны з мінімальным наборам функцый, паколькі найперш такія апараты будуць прызначаны для людзей ва ўзросце — не змяніліся. Нагадаем, па задуме айчынны «мабільнік» павінен мець вялікі экран і вялікія кнопкі для зручнасці карыстання, у ім будзе функцыя хуткага набору (адзін раз запісаў, потым дастаткова толькі націснуць кнопку, не набіраючы кожны раз наноў нумар дзяцей, хуткай дапамогі, любой іншай экстраннай службы), а таксама быць даступным па кошце менавіта для гэтай катэгорыі насельніцтва.

Сяргей РАСОЛЬКА.

МАРЫ АБ ЗАЛАТОЙ ВОСЕНІ

На ўзроўні падсвядомасці кожны як можа рыхтуецца да восені жыцця. Адны выхоўваюць у дзецях пачуццё павагі да бацькоў, іншыя робяць акцэнт на назапашванні матэрыяльных каштоўнасцяў. Толькі вось лёс часам уносіць свае карэктывы, і ў адну хвіліну руйнуе ўсе планы, пакінуўшы чалавека адзін на адзін са старасцю. Тады мары аб светлай, як залатая восень, старасці становяцца прывіднымі. І тады на дапамогу пажылым людзям прыходзяць работнікі сацыяльных службаў. «Ірына Васільеўна Ігнацьева працуе ў нас ужо 8 гадоў. Пад крылом яе апекі — 8 адзінокіх веткаўскіх пенсіянераў. Дзвюх падапечных яна на «бусле» аблятае двойчы, а астатніх — тройчы на тыдзень. Гэтая жанчына ведае ўсе тонкасці працы сацыяльнага работніка. З большасцю старых у яе амаль роднасныя адносіны, некаторых, на жаль, даводзілася праводзіць у апошні шлях», — такімі словамі мне ахарактарызавалі Ірыну Васільеўну ІГНАЦЬЕВУ работнікі Веткаўскага Цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Менавіта дзякуючы ёй я даведаўся, з чаго складаецца АДЗІН ПРАЦОЎНЫ ДЗЕНЬ САЦЫЯЛЬНАГА РАБОТНІКА.

У СТАРАСЦІ СВАЕ «РАДАСЦІ»

Згодна з папярэдняй дамоўленасцю, сустракаемся з Ірынай Ігнацьевай у 9.00 у Цэнтры сацыяльнага абслугоўвання.

— Вы пешшу? Шкада... Ведаеце, мае бабулькі раскіданыя па ўсім горадзе, таму я іх звычайна аб'язджаю на веласіпедзе. Але нічога, сёння наведваем толькі трох. Таму, калі не баіцеся аббіць ногі, будзем адпраўляцца, — шпарка пачынае знаёмства сацыяльны работнік.

Хвілін дзесяць павіхляўшы па веткаўскіх вуліцах, падыходзім да дома, дзе жыве першая падапечная. Ірына Васільеўна прывязвае ля пад'езда свайго педальнага «каня», правяраe паштовую скрыню і мы паднімаемся на пяты паверх. Пераадольваючы лесвічныя пралёты, не вельмі ўяўляеш, як гэткі штурм шматпавярховага «Эверэста» без ліфта ажыццяўляе 81-гадовая бабуля.

— Я заўсёды наведваю Сцяпанаўну ў гэты час, таму яна павінна мяне ўжо чакаць. Вось пабачыце, дзверы будуць адчыненыя. Хіба толькі што здарылася... — абрывае аповед сацыяльны работнік, тузануўшы зачыненыя дзверы.

Пасля некалькіх зацяжных званкоў Сцяпанаўна са словамі «Нешта мне, Ірачка, сёння вельмі дрэнна» адчыняе дзверы. Па бледным, выцвілым ад часу тварыны жанчыны разумееш, якія «радасці» цэлым сукветцем прыходзяць са старасцю.

— «Хуткую» выклікаць не трэба. Наглыталася лекаў, паляжу крыху, мо адпусціць. Ты, родненькая, прыйдзі лепш пазней, там вырашым, што рабіць, — просіць Сцяпанаўна.

ЯК САБЕ. ТОЛЬКІ ЗА МІЗЭРНУЮ ДАПЛАТУ

— Што ж, калі так, трэба ехаць затарвацца, — карэктуе наш графік Ірына Васільеўна.

Для кожнай падапечнай у сацыяльнага работніка складзены дакладны спіс прадуктовых замоў. Малако, чвэртка хлеба, крупы, лекі — самыя запатрабаваныя сярод пенсіянераў тавары. Па дамоўленасці грошы на пакупкі яны даюць наперад. Каб не заблытацца з рэштай, у Ірыны Ігнацьевай на кожнага з падапечных адведзены асобны аддзел у кашальку.

Дарэчы, дастаўка прадуктаў і медыкаментаў, як і паднос вады, дроў, прыборка ў хаце — абавязковая дапамога, што аказвае сацыяльны работнік. Апроч таго, прадугледжаны і платныя паслугі — прыгатаваць паесці, пафарбаваць, пакасіць траву, выкапаць бульбу, — у прэйскуранце значыцца 33 паслугі. Кошт за іх — смех сказаць. Напрыклад, самая запатрабаваная дапамога — мыццё бялізны ўручную — каштуе 1700 рублёў за кілаграм чысціні.

Перад тым як разлічыцца за той ці іншы прадукт, жанчына яго ўважліва правярае, каб усё было свежанькім. Сочыць і за коштам, падбірае крамы, дзе хоць сто рублёў, але можна зэканоміць.

— Перапраўляраеш нават больш, чым калі набываеш сабе. Самі разумееце, старому чалавеку, які жыве на адну пенсію, не так і проста дагадзіць, — тлумачыць сацыяльны работнік.

Апошняя замова — сметанковае масла. Падыходзім да шапіка з малочна-мясной прадукцыяй, а там — даўжэзная чарга. Нягледзячы на гэта, Ірына Васільеўна літаральна праз некалькі хвілін ужо трымае патрэбны тавар у руках.

— Людзей шмат, бо штораніцы сюды прывозяць свежую свініну. У Цэнтра ёсць дамоўленасць, каб сацыяльнага работніка разлічвалі без чаргі. Прадавец ведае, але людзям штораз даводзіцца тлумачыць, што прадукты набываеш не сабе.

Капуста, памідоры, крупы, масла, яйкі — усё складваецца ў аб'ёмную торбу і мы накіроўваемся далей.

ДЗВЕ АДНОЛЬКАВА БАЛЮЧЫЯ ГІСТОРЫІ

Лёс былой настаўніцы Марыі Яфімаўны Рыштаковай не абышоўся без жыццёвай драмы. Яшчэ гадоў дзесяць таму старасць уяўлялася жанчыне зусім іншай. Але ў 2002 годзе загінуў старэйшы сын, праз некаторы час не стала і мужа. Хваляванні і горыч страты пакінулі раны на сэрцы і сляды на здароўі: ужо які год кожны крок па жыцці аддаецца Марыі Яфімаўне жудасным болем у суставах.

— А мусіш жыць. Трымаць у парадку дом і агародчык. Апорай мог бы стаць малодшы сын, але ён жыве ў Мінску, прыязджае не так часта, як хацелася б. Гэта ж добры кавалак дарогі, ды і з працы не заўсёды адпусцяць, — уздыхае былая настаўніца.

Адзін на адзін са складанасцямі жанчыну не пакідаюць калегі і былыя вучні. Апроч знакаў увагі ў выглядзе букетаў на святы, яны аказваюць ёй патрэбную дапамогу. Вось і ў той дзень, калі мы наведаліся да Марыі Яфімаўны, яна чакала ў госці настаўнікаў, якія выклікаліся дапамагчы разгрузіць і ўпарадкаваць брыкет.

— А Іра таксама мая вучаніца, — ківае ў бок сацыяльнага работніка Марыя Яфімаўна. — Часам няёмка прасіць яе аб дапамозе, тады сціскаю зубы ад болю і раблю сама. Дык яна малайчынка — дапамагае і не чакае, пакуль папрашу. Неяк на час адпачынку яе замяняла іншая работніца, дык я не магла дачакацца, пакуль зноў прыйдзе Іра, — усміхаецца Марыя Яфімаўна.

Жыццёвая гісторыя наступнай падапечнай Ірыны Васільеўны драматызмам падобная на папярэднюю. Дзяцінства Ганны Піменаўны Самонавай прыпала на гады вайны ліхалецця. Застаўшыся без бацькі, з 14 гадоў дзяўчыне давялося працаваць у калгасе.

— Не было ні тэхнікі, ні нават каня, таму калгасныя палеткі даводзілася перакопваць рыдлёўкамі. Ведаеце, за радасць лічылі, калі вясной выпадала перакопваць поле, дзе летась была бульба: можна было назбіраць на вячэру гнілушак, — ледзь стрымліваючы слёзы, узгадвае Ганна Піменаўна.

Крыху пазней жыццё жанчыны пачало наладжвацца. Яна выйшла замуж, разам з мужам збудавалі свой дом. Каб паставіць двух сыноў на ногі, бацькі круціліся як маглі. І вось, калі здавалася, што самае складанае за спінай, прыйшла бяда: трагічна загінуў сын, а праз два гады Ганна Піменаўна стала ўдавой. Яшчэ адзін сын жыве ў Мінску. Ужо цэлы год у яго не атрымоўваецца праведаць маці...

— Большасць работ па доме я ў свае 80 яшчэ здольная выконваць сама. Але з кожным днём рабіць гэта ўсё складаней. Вось і вырашыла напісаць заяву на надомнае абслугоўванне. З Ірай, скажу шчыра, мне вельмі пашанцавала: яна і дапаможа, яна выслухае і абнадзеіць, — гаворыць Ганна Піменаўна.

Пакуль я размаўляў з жанчынай пра жыццё-быццё, сацыяльны работнік паспела прыбрацца ў хаце. Яшчэ хвілін дваццаць жанчыны разам прыкідвалі фронт работ на наступнае наведванне, вырашылі, што неабходна дакупіць з прадуктаў.

— Вось такая ў мяне работа, — пачала разважаць Ірына Ігнацьева, калі за намі зачыніліся веснічкі. — Гэта, напэўна, і ёсць самае галоўнае — умець выслухаць чалавека. Ну, вы ўжо ідзіце, а я яшчэ паеду гляну, як там Сцяпанаўна.

Я глядзеў услед Ірыне Васільеўне, а рука сама цягнулася да мабільнага тэлефона, каб набрать нумар бацькоў. І хоць яны пакуль не зусім старыя і зусім не адзінокія, так захацелася як мага хутчэй пераадолець адлегласць у сотні кіламетраў, каб хоць які дзень пабыць разам. Ведаю, яны гэтага заўсёды чакаюць.

Аляксандр АЛЕСІК.
Фота аўтара.

Веткаўскі раён.

КАМЕНТАРЫЙ З НАГОДЫ:

Марына Віктараўна ВАСЬКОВА, інспектар па асноўнай дзейнасці аддзялення сацыяльнай дапамогі дома:

— У Веткаўскім раёне на надомным абслугоўванні знаходзіцца 253 чалавекі: 65 — на бясплатнай аснове, 184 — на ўмовах частковай аплаты, 4 — уносяць 100-працэнтную аплату. Кошт залежыць ад шэрагу абставінаў: прыналежнасці да той ці іншай групы рухомай актыўнасці (здольнасці да самаабслугоўвання), месца жыхарства (горад, вёска), памеру пенсіі, наяўнасці дзяцей і месца іх жыхарства. У агульным заліку лічбы не такія і вялікія. Напрыклад, для трэцяй групы рухомай актыўнасці пры 100-працэнтнай аплаце ў вёсцы абслугоўванне сацыяльным работнікам абыдзецца ў 29 080, а ў горадзе — 18 170. Дапамагаюць адзінокім пажылым людзям 43 сацыяльныя работнікі.

ЯК МАЛА ТРЭБА ДЛЯ ШЧАСЦЯ

Толькі адна бутэлька гарэлкі. Каб яе здабыць, 37-гадовы жыхар вёскі Хутар Светлагорскага раёна разам з неўстаноўленым пакуль сябрам днём зайшлі ў вясковую краму ААТ «Дружба» і адкрыта выкралі так неабходную ім вадкасць маркі «Радамір». Заведзена крымінальная справа.

НІ САБЕ НІ ДЗЕЦЯМ

Глыбокай ноччу была падпалена надзіманая горка для дзяцей, якую прыватны прадпрымальнік устанавіў побач з Прудкоўскім рынкам у Гомелі. На ноч яе звычайна здзімалі, але пакідалі на тым жа месцы. Каму не спадабаўся бізнэс, ці гэта было звычайнае хуліганства — высвятляе цяпер міліцыя.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

СКРАЛІ ТОНУ ДРОТУ — ВЫНЕСЛІ ЦІ ВЫВЕЗІ?

Ноччу з тэрыторыі, якая належыць Баранавіцкаму аддзяленню чыгункі, нехта выкраў тону меднага дроту.

Стандарты сталі зброяй пры абароне рынкаў

Вопытам па выкананні тэхнічных і заканадаўчых патрабаванняў, рэгламентаў і іншых працэдур пры доступе на замежныя рынкі падзяліліся ў рамках рэспубліканскага савета дырэктараў РГА «Беларуская навукова-прамысловая асацыяцыя» прадстаўнікі прамысловых прадпрыемстваў і дзяржорганаў.

— Тэма ў нас асабліва актуальная ва ўмовах крызісу, — лічыць **Мікалай СТРАЛЬЦОЎ, старшыня РГА «БНПА»**. — Выкананне патрабаванняў, стандартаў і заканадаўства іншых краін пры пастаўцы тавараў на экспарт сёння з'яўляецца важнай умовай пры прасоўванні прадукцыі на знешніх рынках. На практыцы не заўсёды вытворца мае нават уяўленне пра наяўныя дакументы і патрабаванні. Як прыклад — нядаўні малочны крызіс.

У ходзе абмеркавання спецыялісты прыйшлі да высновы, што ў сённяшняй складанай эканамічнай сітуацыі шмат якія краіны выкарыстоўваюць тэхнічныя і санітарныя патрабаванні да прадукцыі як сродак не пусціць на рынак сваёй краіны замежную прадукцыю.

— Калі мы кажам пра дыверсіфікацыю рынкаў збыту, то стандарты — адна з асноўных частак пытання. Бо пачынаецца прымяненне не такіх класічных бар'ераў, як пошліны, кватаванне, ліцэнзаванне, а тэхнічных стандартаў і санітарных патрабаванняў. І калі мы кажам пра дыверсіфікацыю рынкаў, то трэба ўяўляць, якія ў гэтых краінах патрабаванні, — лічыць **Дзмітрый ФОМЧАНКА, намеснік аддзела ахоўных мераў і доступу на рынкі Міністэрства замежных спраў Беларусі**. — Пакуль асноўная частка нашай прадукцыі была сканцэнтравана на краінах СНД, дзе падобныя да нашых стандарты, таму вялікіх праблем з экспартам ў гэтыя краіны не ўзнікала. Але калі мы пачынаем казаць пра рынкі краін Еўрасюза, то якраз тэматыка стандартаў выходзіць на першы план.

Дзмітрый Анатольевіч расказаў, што цяпер вядзецца праца па выхадзе беларускай малочнай прадукцыі на рынкі ЕС — і, магчыма, ужо ў пачатку 2010 года будзе першы дазвол. Праўда, Дзмітрый Фомчанка сказаў, што такую працу вядуць усяго толькі тры прадпрыемствы, а астатнія альбо не гатовыя, альбо не праяўляюць цікавасці.

Таксама Дзмітрый Фомчанка параіў прадпрыемствам паставіць на сур'ёзную аснову маніторынг зменаў ў тэхнічным рэгламентаванні тых краін, куды яны экспартуюць ці збіраюцца экспартаваць прадукцыю. Прынамсі, калі гэта цяжка зрабіць, напрыклад, з Мінска, то можна прадугледжваць у кантрактах з замежнымі партнёрамі, каб тыя аператыўна інфармавалі пра розныя змены. Таксама ён параіў пры наяўнасці праблем звяртацца ў пасольствы Рэспублікі Беларусь, а таксама карыстацца інфармацыяй з сайта Нацыянальнага інфармацыйнага цэнтра па тэхнічных бар'ерах у гандлі, санітарных і фітасанітарных мерах (http://www.nicwto.by/).

Віктар НАЗАРАНКА, першы намеснік старшыні Дзяржстандарта, нагадаў, што ёсць абавязковыя патрабаванні, а ёсць спажывецкія характарыстыкі.

— Канкурэнтаздольнасць прадукцыі не вызначаецца адным выкананнем абавязковых патрабаванняў. Абавязковыя патрабаванні, хочам мы таго ці не, мы абавязаныя выконваць. Гэта вельмі важна, але не гарантуе, што прадукцыя будзе канкурэнтаздольная на тым ці іншым рынку, — мяркуе Віктар Уладзіміравіч. — Мне падаецца, што вельмі важны аспект, які сёння прапускаецца, гэта спажывецкія характарыстыкі, якія не прапісаныя ў рэгламентах. І прадпрыемствы часта сутыкаюцца з праблемай, калі прадукцыя бяспечная, адпавядае ўсім патрабаванням, але не знаходзіць свайго спажыўца або па якасных характарыстыках, альбо па цэнавых, альбо па сістэме абслугоўвання.

Дарэчы, першы намеснік старшыні Дзяржстандарта расказаў, што ў найбліжэйшыя два тыдні ва Урад паступіць вельмі сур'ёзная праграма пераходу на еўрапейскія нормы:

— Праграма будзе ўключаць больш за 1990 дакументаў. Бясспрэчна, гэта вельмі сур'ёзнае пытанне да ўсіх вытворцаў. На жаль, у нас, як правіла, вельмі складана ідзе ўвядзенне новых стандартаў, вельмі мала ініцыятывы ад вытворцаў...

Расказаў Віктар Назаранка і пра стварэнне адзіных тэхнічных рэгламентаў для некалькіх краін.

— Вельмі прагрэсіўны цяпер напрамак: у рамках ЕўрАзЭС, у першую чаргу ў рамках мытнага саюза, мы прыйшлі да высновы, што трэба пераходзіць на адзіныя тэхнічныя рэгламенты. Існуе графік іх прыняцця, гэта 32 тэхнічныя рэгламенты, пад якія трапляе ўся асноўная наша прадукцыя на экспарт, — кажа Віктар Уладзіміравіч. — Мы разлічваем,што ў 2010 годзе з'явяцца першыя рэгламенты, якія ўсе краіны будуць асвойваць. І мы лічым, што іншыя краіны СНД далучацца да гэтага працэсу, бо ён сапраўды прагрэсіўны і сапраўды вырашае шмат праблем.

Павел БЕРАСНЕЎ.

НАСЕЛЬНІЦТВА РЭСПУБЛІКІ ПАКРЫВАЕ Ў СЯРЭДНІМ КАЛЯ 30 ПРАЦЭНТАЎ КОШТУ КАМУНАЛЬНЫХ ПАСЛУГ

Пра гэта паведаміў журналістам начальнік упраўлення камунальнай гаспадаркі і энергетыкі Мінжылкамгаса Анатоль ШАГУН.

У летні перыяд жыллёва-камунальныя паслугі, што робяцца насельніцтву, акупляюцца ў сярэднім на 31,4 працэнта, у ацяпляльны — крыху больш чым на 28 працэнтаў. Сёння стандартная двухпакаёвая кватэра агульнай плошчай 48 квадратных метраў з трыма жыльцамі штомесяц абыходзіцца прыкладна ў 106 тысяч рублёў летам і 163 тысячы — у ацяпляльны сезон.

Магда КРЭПАК, «Мінск—Навіны».

МІНСК ЛІДЗІРУЕ ПА ЎЗРОЎНІ ЗАРПЛАТЫ

Мінск па-ранейшаму займае лідзіруючую пазіцыю сярод рэгіёнаў Беларусі па ўзроўні аплаты працы, паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце.

Так, намінальная налічаная сярэдняя зарплата работнікаў Мінска ў жніўні складала Br1328,1 тыс. У Мінскай вобласці гэты паказчык быў Br1026 тыс., у Гомельскай — Br989,5 тыс., у Гродзенскай — Br972,2 тыс., у Віцебскай — Br951,2 тыс., у Брэсцкай — Br934,6 тыс. А самую нізкую зарплату ў жніўні атрымлівалі ў Магілёўскай вобласці (у сярэднім — Br929,9 тыс.).

Найбольш высокімі тэмпамі ў студзені—жніўні 2009 года павялічвалася рэальная налічаная заработная плата да студзеня—жніўня 2008 года ў Віцебскай вобласці (102,6 працэнта). У Брэсцкай вобласці гэты паказчык складаў 102,1 працэнта, у Гродзенскай — 101,9 працэнта, у Гомельскай — 101,8 працэнта, у Мінску — 100,9 працэнта, у Мінскай вобласці — 100,4 працэнта. А ў Магілёўскай вобласці — адзіным рэгіёне рэспублікі — адзначана зніжэнне рэальнай зарплаты (98,3 працэнта).

БЕЛТА.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 29.09.2009 г. (для б/н разлікаў)

▲ 1 долар ЗША	2 767,00
▼ 1 еўра	4 041,76
1 латвійскі лат	5 717,53
1 літоўскі літ	1 170,70
1 чэшская крона	159,97
1 польскі злоты	954,93
▲ 1 расійскі рубель	91,63
1 украінская грыўня	325,34

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	30,1985
UAH	35,5695
1000 BYR	10,9336
EUR	44,1291

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

Факт

РАБОТНІКІ ЗАВОДА «МАЗ-КУПАВА» АТРЫМЛІВАЮЦЬ ПРЭМІІ

На заводзе аўтамабільных прычэпаў і кузаваў «МАЗ-Купава» ўкаранёная сістэма матывацыі работнікаў, накіраваная на падтрыманне ўзроўню продажу прадукцыі ў крызісны час. За садзейнічанне продажу гатовай прадукцыі работнік атрымлівае прэмію ў памеры 0,5 % ад кошту аўтамабільнага шасі і 3 % ад кошту кузава.

Як паведамілі ў ТАА «АДС», для арганізацыі сістэмы матывацыі і кантролю над яе працай створана простая і эфектыўная мадэль. Прадпрыемства выпусціла 1000 картак-купонаў з індывідуальнымі нумарамі, якія даюць права на зніжку пры пакупцы прадукцыі «МАЗ-Купава». Карткі распаўсюджваныя сярод работнікаў прадпрыемства. Пры гэтым вядома, якая менавіта картка каму выдадзена. Калі ў аддзеле маркетынгу з'яўляецца рэальны пакупнік і падае карткукупон на зніжку, становіцца вядома, чыя гэта заслуга. Пасля паступлення платы за тавар работнік прадпрыемства атрымлівае прэмію.

Паводле слоў галоўнага эканаміста завода Уладзіміра Вараб'ёва, колькасць пададзеных пры пакупках картак ужо складае дзясяткі. Ён таксама адзначыў, што матывацыя работнікаў да камерцыйнай дзейнасці ў спалучэнні з мерамі па аптымізацыі выдаткаў дазволілі стабілізаваць фінансавую сітуацыю на прадпрыемстве. Звышнарматыўных запасаў гатовай прадукцыі на складзе няма ўвогуле. У параўнанні з мінулым годам выраслі продажы на ўнутраным рынку і экспарт у краіны Еўропы.

Андрэй ПЯТРОЎ, «Мінск—Навіны».

ТЭХНІКА ААТ «МАЗ» ПЕРАМАГЛА АДРАЗУ Ў ДЗВЮХ НАМІНАЦЫЯХ КОНКУРСУ «PRODВИЖЕНИЕ»

у апошні дзень работы 5-га Міжнароднага аўтатранспартнага форуму, які праходзіў у Маскве.

Экспертны савет прысудзіў перамогу аўтамабільнай тэхніцы МАЗ у намінацыях «Лепшы турыстычны аўтобус года» і «Лепшы грузавік сярэдняй грузападзёмнасці года». Прызы атрымалі аўтобус МАЗ-251 і бартавы аўтамабіль МАЗ-534019. Акрамя таго, па выніках інтэрнэт-галасавання саспіса «Аўтаперавозчык» седлавы цягач МАЗ-5440 быў прызнаны лепшым у сваім класе.

ЭЛІТНАМУ ШАКАЛАДУ — ЗАЛАТЫ МЕДАЛЬ

У Маскве ў Экспацэнтры на Краснай Прэсні прайшла XVIII міжнародная выстава «World Food Moskow 2009». Яна з'яўляецца найбуйнейшай у Расіі міжнароднай харчовай выставай — са сваімі рэпутацыяй і традыцыямі.

Напрыканцы працы выставы, па выніках дэгустацыйнага конкурсу «Прадукт года-2009», кандытарская фабрыка «Спартак» была ўзнагароджана Вялікім залатым медалём. Строгае і кампетэнтнае журы годна ацаніла якасць прадукцыі прадпрыемства, адзначыўшы таксама мастацкі стыль яе афармлення. Залаты медаль у намінацыі «Кандытарскія вырабы» атрымаў шакалад «Спартак Горкі Элітны 90 %» вагой адзін кілаграм.

Сяргей СТАРЫНАЎ.

Што нам прынясе Мытны саюз — выгоды ці страты?

Новыя магчымасці і выклікі для бізнэсу ў сувязі са стварэннем Мытнага саюза паміж Беларуссю, Казахстанам і Расіяй абмяркоўвалі бізнэсоўцы і прадстаўнікі дзяржорганаў на чарговым пасяджэнні Савета па развіцці прадпрымальніцтва Рэспублікі Беларусь.

— Рэгіяналізацыя, выступаючы знешне як антыпод глабалізацыі, насамрэч з'яўляецца сродкам уцягвання дзяржаў у сусветную эканоміку, прычым з найменшымі для іх выдаткамі. З гэтых пазіцый стварэнне Мытнага саюза Расіі, Беларусі і Казахстана — гэта аб'ектыўна абумоўлены працэс, які дазволіць лепей задзейнічаць патэнцыялы нашых краін і ўзняць канкурэнтаздольнасць кожнага з удзельнікаў у глабальным маштабе, — лічыць **Уладзімір ЗІНОЎСКІ, старшыня Савета па развіцці прадпрымальніцтва і старшыня Нацыянальнага статыстычнага камітэта**.

Сяргей КУДРЭЙКА, дарадца ўпраўлення СНД і ЕўрАзЭС Міністэрства замежных спраў Беларусі, паведаміў, што Мытны саюз павінен пачаць працу 1 студзеня 2010 года. Пры гэтым яго ключавымі задачамі з'яўляюцца зняцце ўсіх тарыфных і нетарыфных бар'ераў ва ўзаемным гандлі, правядзенне ўзгодненай знешнегандлёвай палітыкі, спрашчэнне знешнегандлёвых працэдур, стварэнне спрыяльных умоў для інвестыцыйнага клімату. Пры гэтым Сяргей Аляксеевіч лічыць, што рэалізацыя гэтых задач дазволіць павялічыць ВУП і знешнегандлёвы абарот, а суб'екты гаспадарання атрымаюць магчымасць бесперашкодна перамяшчаць свае тавары ў рамках адзінай мытнай тэрыторыі. На сёння ўжо падпісана больш за 30 міжнародных дамоў, амаль што сфарміраваны адзіны мытны тарыф, з 1 студзеня 2010 года пачне працаваць камісія Мытнага саюза, а з 1 ліпеня 2010 года ўсе формы кантролю (санітарны, транспартны) будуць перанесены з унутраных межаў Расіі і Беларусі на знешні кантур Мытнага саюза. Канчаткова завяршыць перанос мытнага кантролю ў рамках трохбаковага фармату Беларусі, Расіі і Казахстана плануецца ў 2011 годзе, і менавіта тады завершыцца фарміраванне адзінай мытнай тэрыторыі.

— Вядуцца перамовы па распрацоўцы механізма залічэння і перараз меркавання сумаў мытных пошлін, — сказаў Сяргей Кудрэйка. — Такім чынам, тавары, калі трапляюць на адзіную мытную тэрыторыю і праходзяць мытную аўстрыку, паступаюць у вольнае абарачэнне, г.зн. іх рух у рамках адзінай мытнай тэрыторыі будзе бесперашкодны.

Увядзенне адзіных мытных тарыфаў будзе ў рамках Мытнага саюза аднолькавае, а не аднабаковае, і рашэнні камісіі Мытнага саюза будуць абавязковымі для ўсіх бакоў. Дарэчы, у гэтай камісіі размеркаванне галасоў будзе наступным чынам: 57 % у Расіі, у Беларусі і Казахстана па 21,5 %.

Што датычыцца ўступлення ў Сусветную гандлёвую арганізацыю, то Сяргей Кудрэйка паведаміў, што Беларусь, Расія і Казахстан будуць уступаць у СГА адначасова і на скаардынаваных умовах.

На пытанне ад бізнэсоўцаў, да чаго ж рыхтавацца суб'ектам гаспадарання, бо да 2010 года засталося не так шмат часу, прадстаўнік Міністэрства замежных спраў звярнуў увагу найперш на канкурэнтаздольнасць.

— Перш за ўсё, асноўная мэта Мытнага саюза, паколькі Беларусь з'яўляецца экспартаарыентаванай краінай, гэта свабодны і прадказальны доступ на рынкі Расіі і Казахстана, — лічыць Сяргей Кудрэйка. — У сваю чаргу нам трэба быць гатовымі да канкурэнцыі нашых тавараў з ІХНІМІ.

Аднак некаторых бізнэсоўцаў хвалюе: ці змогуць нашы прадпрыемствы ва ўмовах Мытнага саюза паспяхова канкураваць з, скажам, расійскімі, бо ў нашых краінах розныя ўмовы гаспадарання, напрыклад, розныя цэны на энерганосьбіты.

— Мы не экспартная краіна, мы імпартная краіна, — лічыць **Уладзімір КУЛЬБЯНКОЎ, дырэктар унітарнага прыватнага прадпрыемства «Куво»**. — З адкрыццём межаў у нас стане большым паток тавараў. Я лічу, што існуе вельмі высокая рызыка. Дзяржаўны сектар нашай дзяржавай лепей падтрымліваецца, чым у Расіі, таму для яго небяспекі будзе менш, але вось што датычыцца прыватнага сектара...

Сяргей Кудрэйка заўважыў, што Беларусь дабіваецца адмены ўвазных пошлін на энерганосьбіты ад Расійскай Федэрацыі і што асноўная ідэя Мытнага саюза — адсутнасць бар'ераў і абмежаванняў ва ўзаемным гандлі, а адзіная эканамічная прастора — гэта ўжо нешта больш цеснае.

Такім чынам, на сёння атрымліваецца, што яўныя перавагі ад адзінай мытнай прасторы для сябе бачаць гандлёвыя прадпрыемствы і міжнародныя перавозчыкі, а вось вытворчыя прадпрыемствы апасаюцца як канкурэнтаў з расійскага і казахстанскага боку, так і танных тавараў, скажам, з Кітая пры вынасе мытнага кантролю на знешні контур Мытнага саюза. Бо калі нашы бізнэсоўцы ўпэўненыя ў сумленнасці працы беларускай мытні, пра што адзначалася на пасяджэнні, то ніякіх гарантый па працы расійскай і казахстанскай мытні ніхто даць не можа.

— Я лічу, што рух у Мытны саюз, у СГА — гэта правільна. Але пытанне ў тым, што мы ідзём па гэтым шляху дастаткова непадрыхтаваныя. Сёння суб'екты гаспадарання не валодаюць інфармацыяй, людзей трэба рыхтаваць для гэтага, — лічыць **Георгій БАДЗЕЙ, старшыня праўлення Бізнэс саюза прадпрымальнікаў і наймальнікаў імя Куняўскага**. — І звярніце ўвагу, што ўсю працу па СГА, па мытнай прасторы вядзе Міністэрства замежных спраў, а Міністэрства эканомікі быццам як і не ўдзельнічае ў гэтым. Гэта што ў нас, палітычны акт альбо глыбока прадуманы напрамак эканамічнага развіцця?

Нечакана з такой пастаноўкай пытання згадзіўся прадстаўнік Міністэрства замежных спраў Сяргей Кудрэйка і папрасіў Уладзіміра Зіноўскага, старшыню Савета па развіцці прадпрымальніцтва, уключыць у тэкст звароту ў Саўмін па выніках пасяджэння і прапанову «падключыць Міністэрства эканомікі».

Улічваючы тое, што да пачатку дзеяння Мытнага саюза засталося не так шмат часу, а суб'екты гаспадарання адчуваюць недахоп інфармацыі па ўмовах дзеяння ў новай сітуацыі, то **Веніямін БІРУКОЎ, начальнік упраўлення эканамічнай бяспекі Дзяржаўнага сакратарыяту Савета Бяспекі Рэспублікі Беларусь**, прапанаваў зрабіць якія-небудзь метадычныя рэкамендацыі для кіраўнікоў прадпрыемстваў:

— Было б правільна прасіць Мінэканомікі, МЗС, Мінфін, Дзяржстандарт і мытню, каб яны распрацавалі метадалагічны дакумент, кшталту даведніка, дзе былі б галоўныя рэкамендацыі па працы, — сказаў Веніямін Аркадзьевіч і выказаў пажаданне, каб такі дакумент з'явіўся яшчэ да канца 2009 года.

Павел БЕРАСНЕЎ.

ПАМІЖ БЕДНЫМІ І БАГАТЫМІ

Яшчэ нядаўна мы жылі ў краіне, палітычнай асновай якой быў саюз рабочага класа і сялянства, а пра сярэдні клас тады ніхто не чуў. Але ж за межамі былога Саюза ён існаваў.

Ва ўсіх эканамічна развітых краінах Еўропы, Паўночнай Амерыкі ды Японіі прыкладна 50—80 % насельніцтва можна аднесці да сярэдняга класа.

У катэгорыю «сераднякоў» там трапляюць настаўнікі, урачы, інжынерна-тэхнічныя работнікі, высокакваліфікаваныя рабочыя — усе, хто мае высокі заробак (2,5 тыс. долараў і болей), жыве ў асабістым доме, у сям'і некалькі аўтамашын, той, хто можа адпачыць за межамі сваёй краіны, паабедаць у рэстаране...

Сярэдні клас — гэта частка насельніцтва, якая ўпісалася ў сацыяльна-эканамічную сістэму, адаптавалася да існай рэчаіснасці і адчувае сябе даволі камфортна.

Але сярэдні клас у заходніх краінах адрозніваецца ад сярэдняга класа на постсавецкай прасторы. Тут карціна даволі размытая.

Напрыклад, у Расіі да сярэдняга класа сябе адносяць тыя, хто зарабляе ад 1 тыс. долараў, мае 21 м² жыллёвай плошчы на чалавека, аўтамашыну, дачу... Але часта сярод тых сераднякоў — будаўнікі, вадзіцелі ды служачыя, а ўрачоў, настаўнікаў сярод іх мала. Ды трэба адзначыць, што расійскі сярэдні клас сканцэнтраваны, у асноўным, у мегаполісах.

І яшчэ.

Сярэдні клас вызначаецца не толькі даходам сям'і, але і яе ладам жыцця. У людзей фарміруюцца свае погляды, запатрабаванні...

У «серадняка» адбылося пераасэнсаванне каштоўнасцяў. Ён цэніць час і лічыць, што, найперш, дзякуючы працы можа дасягнуць поспеху. Не на апошнім месцы стаіць і адукацыя.

Што датычыцца Беларусі, то нягледзячы на тое, што больш за палову нашых людзей адносіць сябе да насельніцтва з сярэднім дастаткам, наш сярэдні клас, як і ў іншых краінах Усходняй Еўропы, знаходзіцца ў стадыі фарміравання.

А што з'яўляецца зыходным пунктам для вызначэння «серадняка»? Калі прытрымлівацца заходніх параметраў, то нам яшчэ крочыць ды крочыць.

Але гледзячы на шыкоўныя катэджы не толькі наўкол гарадоў, міжволі ловіш сябе на думцы, што ўзвялі іх не бедныя гаспадары. Пры тых дамах стаяць аўтамашыны, і часта не па адной. Можа, гэта і ёсць сярэдні клас?

Няхай насельнікі тых катэджаў аддаюць перавагу матэрыяльным каштоўнасцям, але тым не меней яны ўжо стараюцца сваім дзецям даць вышэйшую адукацыю. І гэта вялікі крок наперад. А раней здаралася пачуць і такое. На бацькоўскім сходзе класны кіраўнік гаварыла, што і дзяўчаткам трэба добра вучыцца, а ў адказ чула: «Галоўнае не вучоба, а каб замуж удала выйшла!»

У кожнага народа свае традыцыі, менталітэт, стандарты. І калі беларускі «серадняк» не спяшаецца ў рэстаран абедаць, то гэта не значыць, што ён не мог бы сабе той абед дазволіць. Проста ў нас няма такой традыцыі, ды можа і шкада на рэстаран траціць грошы?

Калі прытрымлівацца статыстычных напрацовак і апытанняў, то атрымліваецца прыкладна наступная карціна.

Беларус, якога можна аднесці да сярэдняга класа, — гэта той, чыя сям'я мае заробак за мільён на чалавека (улічваючы дзяцей), у каго ёсць дом ці добрая кватэра, дача і аўтамашына (не старэйшая за 10 гадоў). Праўда, ужо пэўны працэнт «сераднякоў» ездзіць на «маладзейшых» іншамарках ці новых. А вось адпачываюць за мяжой далёка не ўсе. Часта аддаецца перавага свайго дачы ці чалавек спасылаецца на недахоп часу. Хоць хапае і тых, хто адпраўляецца ў замежныя экскурсіі на аўтобусе ў Іспанію, Італію, Грэцыю... І яшчэ ёсць 5—10 тыс. долараў на «чорны дзень».

А што датычыцца падзелу па прафесіі, то пад «сераднякі» найперш падпадаюць індывідуальныя прадпрымальнікі, пэўная катэгорыя служачых, урачы, якія маюць прыватную практыку, банкаўскія кіраўнікі, шахцёры, дырэктарскі корпус...

З нашым чалавекам бывае даволі цяжка разабрацца, у які сацыяльны слой яго залічыць. Нехта мае дзве-тры кватэры (а сёння такіх не адзінкі), а ўсё скардзіцца на жыццё. А здараецца і наадварот: «Мае браты багатыя, ды і я не бедная», — разважае пенсіянерка з пенсіяй у 300 тысяч.

* * *

Стабільнасць грамадства ў значнай меры залежыць ад сярэдняга класа, які ўраўнаважвае яго. Процістаянне, як правіла, узнікае ў краінах, дзе вялікі кантраст паміж беднымі і багатымі, дзе сярэдні клас нязначны. Там прыжываюцца розныя рэвалюцыйныя ідэі, там падрыхтавана глеба для сацыяльных канфліктаў.

Але станаўленне сярэдняга класа — працэс працяглы, і патрэбен час для яго фарміравання. А фарміруецца ён з ініцыятыўнай і адукаванай часткі насельніцтва. І напэўна ж, у сталым сярэднім класе зацікаўлена кожная дзяржава.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Смачна есці!

ШАШЛЫКІ Ў КРАМЕ БУДУЦЬ УЖО НА ШПАЖКАХ

Выпуск шэрагу чарговых навінак — ахалоджаных мясных паўфабрыкатаў — мае намер распачаць у найбліжэйшы час Кобрынскі мясакамбінат. У прыватнасці, гаворка ідзе пра шашлыкі «Факел» і «Агеньчык», якія мяркуецца выпускаць адразу на драўляных шпажках — па пяць—шэсць штук на вагу на невялікіх паддончыках.

Гэта будуць кавалачкі мяса, загорнутыя ў грудзінку — у натуральных чырвоных ці зялёных марынадах. У апошнім выпадку колер тлумачыцца наяўнасцю сярод інгрэдыентаў зяленіва, патлумачыла **галоўны тэхнолаг прадпрыемства Людміла КАДЗІРАВА**. Яшчэ плануецца выпуск «Вітушак», «Смаўжоў», «Ракушак», «Падковак» — паўфабрыкатаў з мяса, калі ў кавалачак свініны ці ялавічыны дадаецца нейкі іншы напаўняльнік, у ролі якога можа быць шпік, фарш, грудзінка. Гэта ўсё загортваецца адмысловым чынам і заліваецца марынадам.

Такая прадукцыя падыходзіць для прыгатавання ў мікрахвалевай печы, у духоўцы, на грылі. Першую пробную партыю ў смажаным выглядзе ахвотныя маглі пакаштаваць на нядаўніх «Дажынках». Цяпер на мясакамбінаце вывучаюць магчымасць пераходу на выпуск паўфабрыкатаў больш істотнымі па аб'ёмах партыямі. Напрыклад, такімі, якімі цяпер вырабляецца тут вараная каўбаса з рознымі напаўняльнікамі. Раней мы пісалі, што «першынцам» стала каўбаса з сырам, а цяпер яе пачалі вырабляць і з маслінамі, алівамі, грыбамі, папрыкай. На чарзе — каўбаса з чарнаслівам, кажуць, будзе незвычайны смак.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Государственный комитет по имуществу Республики Беларусь ПОВТОРНО ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже в процессе приватизации находящегося в республиканской собственности и хозяйственном ведении могилевского республиканского предприятия «Могилевэнерго» предприятия как имущественного комплекса (филиал Бобруйский завод древесноволокнистых плит)

Наименование предмета аукциона:			филиал могилевского республиканского унитарного предприятия «Могилевэнерго» Бобруйский завод древесноволокнистых плит (далее – имущественный комплекс) и право заключения договора аренды земельных участков, необходимых для обслуживания капитальных строений (зданий, сооружений), входящих в состав имущественного комплекса, сроком на 60 лет
Местонахождение:			г. Бобруйск, ул. Куйбышева, 29
Вид деятельности объекта:			производство древесноволокнистых плит
Положение на рынке:			не занимает доминирующего положения
Продавец, его местонахождение, контактные телефоны:			Государственный комитет по имуществу Республики Беларусь, г. Минск, пер. Краснозвездный, 12, тел. 2881152, 2944676
Численность работающих, чел.			734
Финансовое состояние объекта, рублей:	**Балансовая прибыль:**		–
	Задолженность:	**Кредиторская:**	2 755 408 522
		Дебиторская:	874 029 975
Начальная цена предмета аукциона:			32 395 152 340 (тридцать два миллиарда триста девяносто пять миллионов сто пятьдесят две тысячи триста сорок) рублей, в том числе: - имущественного комплекса в сумме 31 703 283 960 (тридцать один миллиард семьсот три миллиона двести восемьдесят три тысячи девятьсот шестьдесят) рублей; - права заключения договора аренды земельных участков, необходимых для обслуживания капитальных строений (зданий, сооружений), входящих в состав имущественного комплекса, сроком на 60 лет, в сумме 691 868 380 (шестьсот девяносто один миллион восемьсот шестьдесят восемь тысяч триста восемьдесят) рублей
Сумма задатка:			1 500 000 000 (один миллиард пятьсот миллионов) рублей
Условия продажи:			сохранение имеющегося количества рабочих мест в течение первых 12 месяцев с даты его приобретения, не менее 90 процентов этого количества рабочих мест в течение последующих 12 месяцев и осуществляемых имущественным комплексом видов деятельности в течение 5лет;инвестирование покупателем имущественного комплекса (далее – покупатель) в развитие производства в течение 3 лет с даты приобретения суммы, эквивалентной не менее 7 млн. долларов США
Порядок оплаты:			30 рабочих дней со дня заключения договора купли-продажи
Справочно:			Имущественный комплекс расположен на земельных участках общей площадью 7,5217 га. Победитель аукциона обязан заключить договор безвозмездного пользования без права распоряжения с условием сохранения целевого использования объектом гражданской обороны (защитное сооружение) остаточной стоимостью 11 250 185 руб.

Аукцион состоится **22 октября 2009 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, пер. Краснозвездный, 12, 5 этаж, актовый зал.

Желающим участвовать в аукционе необходимо заключить с Госкомимуществом соглашение о правах и обязанностях сторон и представить следующие документы:

заявление на участие в аукционе по установленной форме;

заверенную банком копию платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении;

индивидуальным предпринимателем – копию свидетельства о государственной регистрации и его подлинник для заверения его копии;

юридическим лицом – доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица и их подлинники для заверения их копий;

иностранным юридическим лицом, иностранной организацией, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств, иностранным государством и их административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организацией – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на русский или белорусский язык;

представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Задаток перечисляется Государственному комитету по имуществу Республики Беларусь на расчетный счет 604925280011, ф-л № 529 «Белсвязь» АСБ «Беларусбанк», г. Минск, пр. Независимости, 56, код 153001720; УНН 100745627; ОКПО 00034720.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Минск, пер. Краснозвездный, 12, каб. 504, в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 18.00 по 20 октября 2009 года включительно.

Заключительная регистрация участников – 22 октября 2009 г. с 9.00 до 10.30.

Победитель аукциона в день проведения торгов обязан подписать протокол о результатах аукциона.

Победитель аукциона в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполкомом решения о предоставлении ему земельного участка обязан внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, расходы, связанные с формированием земельного участка, в том числе государственной регистрацией создания земельного участка.

После совершения победителем аукциона названных платежей, но не позднее 2 рабочих дней, с ним продавцом заключается договор купли-продажи имущественного комплекса, а местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка. Оплата за приобретенный имущественный комплекс осуществляется в течение 30 календарных дней после подписания договора купли-продажи.

Информация о продаваемом объекте размещена на сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь: **www.gki.gov.by.**

УНП 100745627.

Сведения об объекте республиканской собственности, подлежащем разгосударствлению и приватизации

Полное и сокращенное наименование объекта разгосударствления и приватизации, его ведомственная принадлежность			**Производственно-торговое республиканское унитарное предприятие «Белвторресурсы» (РУП «Белвторресурсы»), Министерство торговли Республики Беларусь**	**Производственно-снабженческое республиканское унитарное предприятие «Белреахим» (УП «Белреахим»), Министерство торговли Республики Беларусь**	**Реставрационно-строительное республиканское унитарное предприятие «Минскреставрация» (УП «Минскреставрация»), Министерство культуры Республики Беларусь**	**Республиканское унитарное предприятие «Дорожно-строительный трест № 5» (РУП «ДСТ № 5»), Министерство транспорта и коммуникаций Республики Беларусь**	**Республиканское унитарное предприятие «Авиакомпания Трансавиаэкспорт» (УП «Авиакомпания Трансавиаэкспорт»), Министерство транспорта и коммуникаций Республики Беларусь**
Адрес			220006, г. Минск, ул. Денисовская, 33, комната 1	220103, г. Минск, ул. Калиновского, 6	220103, г. Минск, ул. М. Богдановича, 143	220090, г. Минск, ул. Широкая, 26	220090, г. Минск, ул. Захарова, 44
Вид деятельности объекта разгосударствления и приватизации, укрупненная номенклатура выпускаемой продукции			Оптовая торговля неметаллическими отходами и неметаллическим ломом	Оптовая торговля химическими веществами и химическими продуктами	Реставрационно-строительные работы	Дорожное строительство	Деятельность воздушного транспорта; грузовые перевозки
Положение на рынке			Не занимает доминирующего положения	Не занимает доминирующего положения	Не занимает доминирующего положения	Не занимает доминирующего положения	Не занимает доминирующего положения
Планируемые сроки разгосударствления и приватизации			4 квартал 2009 г.	4 квартал 2009 г.	4 квартал 2009 г.	4 квартал 2009 г.	4 квартал 2009 г.
Предполагаемый способ разгосударствления и приватизации			Создание открытого акционерного общества	Создание открытого акционерного общества	Создание открытого акционерного общества	Создание открытого акционерного общества	Создание открытого акционерного общества
Орган, осуществляющий разгосударствление и приватизацию данного объекта, и его местонахождение			Минский городской территориальный фонд государственного имущества, 220050, г. Минск, пр. Независимости, 8	Минский городской территориальный фонд государственного имущества, 220050, г. Минск, пр. Независимости, 8	Минский городской территориальный фонд государственного имущества,

На слыху

ПРАВАПАРАДАК НА ЎБОРАЧНАЙ

Дзясятку злачынстваў былі раскрыты падчас прымеркаванай да ўборачных работ рэспубліканскай акцыі Міністэрства ўнутраных спраў «Служу табе, зямля родная!». Дзеля фінальнага акорда акцыі на Гомельшчыну, у Мазыр, прыехалі супрацоўнікі абласных упраўленняў унутраных спраў, Дэпартамента аховы МУС, а таксама прадстаўнікі добраахвотных дружын кожнай вобласці.

Намеснік міністра ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь Анатоль Курылец падзякаваў супрацоўнікам і дружыннікам за самаадданую працу. Сярод дружыннікаў можна вылучыць, напрыклад, прадстаўніка добравольных дружын Гомельшчыны Аляксандра Мілохіна. Пад яго камандай дружына Улукаўскага сельсавета з 12 чалавек пяць разоў на тыдні дапамагала ўчастковым і патрульным міліцыянерам забяспечваць правапарадак — правярала мехдвары, збожжаткі, сельскагаспадарчыя ўгоддзі, малочна-таварныя фермы. Дзякуючы ўлукаўскай дружыне, былі выяўлены восем крадзяжоў.

Лепшыя з лепшых праваахоўнікаў і дружыннікаў атрымалі ўзнагароды ад міліцэйскага ведамства і падзякі Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання. За прапаганду міліцэйскіх традыцый Мазырскаму дзяржаўнаму абласному ліцэю быў уручаны тэлевізар. Дарэчы, некаторыя выпускнікі профільнага класа ліцэя паступілі сёлета ў Акадэмію МУС, на юрыдычныя факультэты іншых ВНУ.

Святлана БАРЫСЕНКА.

ЗАБІРАЕ ЖЫЦЦІ... КУКУРУЗА

Пачалася масавая ўборка кукурузы, і пачасціліся выпадкі гібелі людзей пад уборачнымі камбайнамі. Літаральна на гэтым тыдні на Брэстчыне ўжо загінула два пенсіянеры. У сераду камбайн смяротна параніў старога чалавека ў Бярозаўскім раёне, а ў чацвер такая ж вестка прыйшла з Іванаўшчыны. У СВК «Агра-Моталь» пад жняярку камбайна трапіў 75-гадовы чалавек і загінуў.

Сёлета дрэнна ўрадзіла бульба, вось і пацягнуліся пажылыя вяскоўцы на калгасныя палеткі, каб назбіраць для жывёлы спелых пачаткаў. Надвор'е стаіць ветранае, спелая кукуруза шапаціць сухой лістотай. А яшчэ, калі слых бы зрок не вельмі добрыя, то людзі проста не заўважаюць набліжэння камбайна. З кабіны сельгасмашыны таксама нельга заўважыць чалавека ў кукурузе вышынёй больш за два метры. Вось і трапляюць небаракі пад смяротныя нажы машыны, прыносячы гора не толькі ў свае сем'і, але і ў сем'і механізатараў, якія кіруюць камбайнамі.

Застаецца толькі заклікаць усіх быць пільнымі: кіраўнікам гаспадарак і іх інжынерам па ТБ лепш арганізоўваць інструктажы механізатараў, а сельсаветам праводзіць гутаркі з насельніцтвам, асабліва з пенсіянерамі. У рэшце рэшт астаткі кукурузы можна назбіраць і на зжатым полі. Літаральна ўчора аўтар гэтых радкоў назірала ў Жабінкаўскім раёне, як маладыя людзі збіралі ў мех пачаткі пасля камбайна. Вялікая машына не можа ўбраць чыста, да аднаго каліва. Нешта абавязкова застаецца. Дык лепей не рызыкаваць жыццём.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

ГРАН-ПРЫ «АНІМАЁЎКІ-2009» АТРЫМАЎ БЕЛАРУСКІ ПРАЕКТ

«Аповесць мінулых гадоў» студыі анімацыі «Беларусьфільм» прызнана лепшым мультыплікацыйным фільмам на XII Міжнародным фестывалі анімацыйных фільмаў у Магілёве.

Творчай групе пад кіраўніцтвам Ігара Волчака журы фестывалю ўручыла сімвалічны «Крышталёвы аловак».

«Аповесць мінулых гадоў» — беларускамоўная стужка. У ёй расказваюцца гісторыі стварэння гербаў беларускіх гарадоў. Трэцяя частка, прадэманстраваная на фестывалі, прысвечана гербам раённых цэнтраў — Шклова, Полацка і іншым.

Старшыня журы, вядомы расійскі рэжысёр-аніматар Леанід Носыраў сказаў, што «Аповесць мінулых галоў» будзе цікавай і пазнавальнай для дзяцей і дарослых і праз пяць, і праз сто гадоў, таму што гэта жывая гісторыя.

Тры дні Магілёў быў захоплены мультфільмамі. Для таго, каб паглядзець самыя новыя творы рэжысёраў анімацыйных студый з 11 краін свету, не трэба было нават ісці ў кінатэатры. Вялікай глядацкай залай стала плошча Зорак у абласным цэнтры, дзе кіраўніцтва фестывалю ўсталявала вялізны экран.

Колькасць гледачоў на «Анімаёўцы» налічвалася дзясяткамі тысяч дзяцей і дарослых. Прыз глядацкіх сімпатый вызначылі галасаваннем. Яго атрымаў беларускі рэжысёр Аляксандр Ленкін за стужку «Пра сяброўства, Шарыка і лятальную талерку».

Лепшым эксперыментальным фільмам названа стужка «Калыханка» расійскага рэжысёра Андрэя Залатухіна, лепшым мультфільмам для дзяцей — «Мядзведзь ідзе» рэжысёра з Латвіі Яніса Цымерманіса. «Крышталёвы аловак», прызначаны сапраўднаму майстру анімацыі, атрымаў украінскі рэжысёр Яўген Сіваконь.

Праграмы, складзеныя з новых мультфільмаў розных краін, будуць на працягу месяца глядзець гледачы ў кінатэатрах Беларусі.

Ілона ІВАНОВА.

АСАБЛІВАСЦІ САКАЛІНАГА ПАЛЯВАННЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Самы «круты» з сабак-пасажыраў належыць Юрыю Мікалаевічу. **Дэн** — не проста прыгажун, а і вельмі тытулаваны сабака. Дэн — ірландскі сэтэр. Неаднаразова заваёўваў для Беларусі і, само сабой, для любага гаспадара розныя медалі. На спаборніцтвах выхлаў у Смаленску, Віцебску ён быў пераможцам, пад Масквой — прызёрам. Напрыклад, у Падмаскоўі атрымаў лепшыя егерскія балы і здабыў гаспадару прыз — «Лепшаму вядучаму».

ДРАПЕЖНІК І РЭПАРЦЁР — ГЭТА...

Бачэйкава — вялікі населены пункт у Бешанковіцкім раёне. Гэтая вёска добра вядомая тым, хто цікавіцца гісторыяй. Тут жылі знакамітыя прадстаўнікі шляхты — Цеханавецкія. Маёнтак іх былы ў наш час, на жаль, так і не адрамантавалі. А якія былі планы яшчэ ў 1990-я! І вінакурню, і піўзавод планавалі адчыніць тут, канал пачысціць. Гатэль стварыць у былых пакоях. Куды там! Затое менавіта тут, дзякуючы сакалінаму паляванню, можа з'явіцца своеасаблівая Мека для тых, хто гэтым захапляецца.

— Зараз пазнаёмім вас з Сярожам і Фёдарам, — кажа мне Сяргей Эдуардавіч Усаў. — Але вельмі асцярожна з апошнім!!!

«Хто такія? І чаму нейкі Фёдар кусаецца?» — падумаў я. Высветлілася, што апошні — мой будучы напарнік па паляванні — ястраб-сцярвятнік па мянушцы Фёдар. А Сярожа — ягоны гаспадар і паралельна пляменнік Сяргея Эдуардавіча. І яму толькі 14 гадкоў.

Сціплы сельскі хлопчык жыве ў вёсцы Клешчыно, што недалёка ад Бачэйкава, кіламетры за два. Вучыцца ў звычайнай сярэдняй школе.

Фёдару каля сямі месяцаў. А ўсяго жывуць ястрабы, як мне расказаў Сярожа, гадоў 15. Злавілі драпежніка на голуба. Яшчэ пастарацца вельмі давялося, каб трапіў ён у сетку. Цяпер дрэсіруюць, каб быў добрым паляўнічым на качак, курапатак...

Мяне ястраб-сцярвятнік чамусьці адразу незалюбіў. Шчыра прызнацца, думаў, што рэпартаж не атрымаецца. А ўсё таму, што не хацеў Фёдар садзіцца мне на руку, на спецыяльную пальчатку. Капцюры ў яго такія, што, калі сядзе проста на рукаў ды капцюры «прыменіць», радасць мазахіста атрымаецца — да крыві можа ўчапіцца.

Фёдар сядзеў у Сярожы вельмі спакойна. Некалькі разоў спрабаваў Сярожа перадаць мне пальчатку, да якой сцярвятнік прывязаны. Той крыламі махае і пералятаць не хоча. Урэшце пальчатка на маёй руцэ, ды Фёдар раптам — уніз галавой. Вісіць, заціх, як мёртвы. Як тая качка, што здабылі на паляванні.

І вось «цуд» — урэшце сядзіць. Ды неяк нервова. Нейкія гукі чую — незадаволены Фёдар. Глядзіць так, як маё начальства падчас плянёркі. Няўтульна. А яшчэ я ўсё пужаўся, што пазбавіць ён мяне вока. Так ужо нядобра аглядаў мой твар сцярвятнік. Добра, кепку надзеў для падстрахоўкі.

— А як жа ён «працуе», растлумач, калі ласка, — прашу Сярожу.

— Вельмі проста. Адпускаеш — і ён ляціць да будучай ахвяры, а потым ужо справа тэхнікі. Сціскае капцюрамі здабычу, — адказвае Сярожа Усаў. — Каб «знайсці яго», як вы гаворыце, званочкі маленькія прывязваюцца, вось... І не ўцячэ, на тое і муштруецца, каб не паляцеў!

Качку і іншую птушку мы з Фёдарам так і не злавілі. Затое я шмат чаго даведаўся пра ягоныя павадкі і, скажам так, пра лад жыцця.

Жыве сцярвятнік у гаспадарчай забудове сельскага дома Усавых. Кормяць яго толькі мясам злоўленых птушак. Галубы, вароны — ягоная ежа. Натуральна, мяса з крамы яму не прыносяць — не ў заапарку ж жыве. Павінен есці толькі тое, што і яго браты на волі. Мышы падабаюцца — ён жа на волі таксама іх можа лавіць.

Хлопчык, бывае, ходзіць па роднай вёсцы разам са сцярвятнікам (носіць на руцэ). Дык, птушка, як сабака, «пужае» мінакоў — ахоўвае гаспадара. Сярожа гаворыць, што курэй суседскіх сцярвятнік не крадзе. Вельмі разумны. Але расслабляцца з ім — сабе даражэй. Драпежнік ёсць драпежнік — колькі ўжо шрамаў у хлопчыка было пасля стасункаў з ім.

— А як так атрымалася, што ты захапіўся менавіта сакаліным паляваннем?

— І дзядзька мой, і тата — паляўнічыя з вялікім стажам. Я ж з малых гадоў на паляванні.

САКОЛЬНІКІ ПАКАЖУЦЬ БЕЛАРУСЬ!

— Мы ўжо ўвайшлі ў міжнародную асацыяцыю сакольнікаў, — распавядае Сяргей Усаў. — Гэта значыць, што можам удзельнічаць у міжнародных спаборніцтвах. Вось, ужо ў Англію запрашалі летась, але за наш уласны кошт. Цяпер ужо арганізатары спаборніцтваў абяцалі ўзяць на сябе ўсе выдаткі. Але думаю, што каб ехаць, трэба быць на ўзроўні.

У прыватнасці, мы, група аднадумцаў, хочам поўнасцю аднавіць касцюм паляўнічага часоў Вялікага Княства Літоўскага. Чытаем спецыяльную літаратуру, працуем з архіўнымі дакументамі. У Радзівілаў была свая школа сакалінага паляванння...

Прадстаўнікі розных краін удзельнічаюць у спаборніцтвах у нацыянальных паляўнічых касцюмах, тыя ж расіяне, палякі. А чым мы горшыя?..

Наколькі я зразумеў, нашым беларускім энтузіястам не вельмі проста адраджаць «царскае паляванне». Як гаворыцца, ёсць нюансы. Маўляў, нельга грамадзянам лавіць прадстаўнікоў сям'і сакаліных. А каб юрыдычнай асобе атрымаць дазвол, трэба абысці шмат інстанцый. Ну, не было раней у нас такога віду палявання! У выніку і шмат праблемных дробязяў.

Упэўнены, што цяпер, калі так шмат гаворыцца пра неабходнасць развіцця ў Беларусі турыстычных паслуг, менавіта такія ідэі трэба падтрымліваць уладам. Тыя ж аматары сакалінага палявання з-за мяжы маглі б прыязджаць да нас. Паралельна трэба, безумоўна, вырашаць многія пытанні развіцця цікавасці да сакалінага палявання ўнутры краіны. Напэўна, нямногія звычайныя паляўнічыя ў Беларусі чулі, што ўжо і ў нас адраджаецца сакалінае паляванне.

ПАЭЗІЯ ПАЛЯВАННЯ

Ды што там гаварыць пра перспектывы сакалінага палявання, калі толькі пазалетась у наваколлях Віцебска былі ўпершыню праведзены выпрабаванні выжлаў па курапатках. У апошні раз да гэтай вельмі знакавай падзеі нешта такое праводзілася ў 1927 годзе! На жаль, пакуль што няшмат у вобласці тых, каму гэта цікава. На ўсю вобласць паляўнічых з выжламі — чалавек дзесяць.

— Паляванне з выжламі — гэта паэзія палявання, — лічыць Юрый Мікалаевіч Гарагляд. — Тургенеў, Някрасаў так і палявалі. Выжлы — сэтар, курцхаар, дратхаар, поінтар — з імі ходзяць на птушак: дупеля, бякаса, курапатку, слонку (вальдшнэпа), цецерукоў...

Кароткай камандай «піль» вы пасылаеце сабаку ўперад падняць птушку. Вопытны выжал сам лажыцца пры ўзлёце птушкі. Дарэчы, у нас паляўнічыя ходзяць у поле з адным сабакам, а ў Англіі — з двума (здабычу прыносіць рэтрывер).

Шчаня выжла каштуе мінімум 300 долараў. Правільная муштроўка і дрэсіроўка выжла — працэс вельмі цікавы, але карпатлівы і цяжкі. Зразумела, можна запрасіць вымуштроўваць прафесіянала, абыдзецца гэта ў 1000 долараў, але, упэўнены, няма большай радасці ва ўладальніка сабакі, чым зразумець яго душу.

— У добрага сабакі ў крыві — інстынкт паляўнічага, — расказвае паляўнічы Алег Цітоў. — Само сабой, занімацца выхаваннем сабакі трэба. Па-першае, навучыць сабаку знаходзіць здабычу, птушак паказаць, потым стойка, падводка. Добры сабака адчувае здабычу метраў за 30—50, калі нос па ветры...

Наконт радаслоўных. Абавязкова перад тым, як набыць шчаня, трэба пракансультавацца ў таварыстве паляўнічых і рыбаловаў...

Мой суразмоўца паказаў мне радаслоўную на свайго сабаку — нават мянушкі «дзеда» і «бабкі» там надрукаваныя. І ўсе новыя «тытулы» — перамогі на выставах, фіксуюцца там жа. Калі яшчэ адзін паляўнічы паказаў мне расійскі аналаг, я зразумеў, што ён «лепшы» — цэлая «кніжачка», а ў нас нейкі лісцік.

НУ, ЗА ПАЛЯВАННЕ!

Падчас бяседы я ўсё цікавіўся традыцыямі паляўнічых. Не гаворыць — «забіў», «застрэліў» птушку, звера, а «здабыў». Адзін аднаго пры ўдачы віншуюць: «З полем!». Адтуль і пайшло слова — «паляўнічы».

Пра абрады. Кабана, напрыклад, здабылі — галінку яму ў рот — апошні сняданак. А потым яе на капялюш паляўнічага — «медаль».

Тосты. Першы — «За паляванне!», другі — «За сабак!», трэці — За ўдачу!». Дарэчы, па тэме. Некаторыя паляўнічыя так добра дрэсіруюць сваіх гадаванцаў, што тыя і газеты ім прыносяць, і... бутэльку гарэлкі ў зубах прынясуць (на фота). Паказалі мне трукі гаспадары і сабакі — у цырку разам выступаць смела могуць.

Наконт інстынктаў. Наколькі я зразумеў, ніякіх псіхалагічных курсаў не патрабуецца заканчваць, калі ты — паляўнічы са стажам. Кожны з іх, калі назапашваецца досвед, добра ведае інстынкты здабычы. Адпаведна, міжвольна больш пільна пачынаеш сачыць за звычкамі людзей. На мой погляд, часта сабакі лепшыя за некаторых людзей. Не прадаюць, служаць старанна, ад душы, таму што любяць.

Сапраўдныя паляўнічыя — людзі адкрытыя ў большасці сваёй. Адразу знайшлі агульную мову з маімі новымі таварышамі. І не смяяліся яны з часта «тупых» маіх пытанняў. Стараліся, як і прасіў, усё тлумачыць даступна.

Цяпер я ведаю, чаму нармальныя мужчыны суткамі могуць быць на паляванні. Сябры, сабакі, лес. Інстынкт здабытчыка. І ніякіх жанчын. Хаця, трэба сказаць, без іх асабіста мне было трохі сумна.

Спадзяюся, што вярнуўшыся з палявання, я не намацаю рогаў, якія раптам выраслі дома. Як у тым анекдоце пра мужа, які вяртаецца з палявання.

Дамовіліся мы з паляўнічымі, што ў «Звяздзе» яшчэ неаднаразова раскажам пра іх захапленні. Усё чамусьці часу не хапала. А шкада.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Бешанковіцкі раён — Віцебск.

Фота аўтара і паляўнічых.

У БЕЛАРУСАЎ НЕ ПАВІННА БЫЦЬ КОМПЛЕКСАЎ НАКОНТ 1939 ГОДА

На міжнародную навукова-практычную канферэнцыю «Восень 1939 года ў гістарычным лёсе Беларусі» ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі сабраліся навукоўцы з усёй краіны, а таксама госці з Польшчы, Украіны, Эстоніі.

— Старажытныя мудрацы, пэўна, мелі рацыю, калі заклікалі гісторыкаў адмовіцца ад эмацыйна-псіхалагічнага ўспрыняцця падзей і абмяркоўваць пэўныя думкі і разважанні. Падзеі, якія адбываліся 70 гадоў таму, сёння выклікаюць вострыя спрэчкі і дыскусіі не толькі сярод навукоўцаў, але і шырокай грамадскасці, — сказаў у прывітальным слове **дырэктар Інстытута гісторыі НАН Беларусі Аляксандр КАВАЛЕНЯ**. — Сёння фактычна паміж польскімі і расійскімі навукоўцамі ідзе вельмі актыўная палеміка. Пра гэта засведчыў даволі прадстаўнічы форум еўрапейскіх палітыкаў, які адбыўся у Польшчы з нагоды 70-й гадавіны пачатку Другой сусветнай вайны...

Дырэктар Інстытута гісторыі лічыць, што для нас, беларусаў, галоўным фактам усё ж было аб'яднанне народа:

— Можна весці працяглыя дыскусіі пра маштабныя ўзрушэнні 1939 года, але відавочна адно: у дачыненні да беларускага народа быў здзейснены акт гістарычнай справядлівасці і адбылося ўз'яднанне беларускага народа ў адзіную сям'ю. Нават сёння шмат хто з еўрапейскіх і расійскіх гісторыкаў, гаворачы пра падзеі 1939 года, не бяруць пад увагу інтарэсы суверэннай Беларусі, некаторыя з іх і сёння не ўспрымаюць Беларусь у якасці самастойнага суб'екта сваёй гісторыі. Нас спрабуюць у лепшым выпадку не заўважаць. Цяпер адна з актуальных задач беларускай гістарыяграфіі — барацьба за інфармацыйную прысутнасць на еўрапейскім гістарыяграфічным полі, на полі барацьбы нацыянальных ідэй. Беларускія гісторыкі не павінны маўчаць, нашу пазіцыю павінны ведаць польскія і расійскія даследчыкі, гісторыкі іншых краін Еўропы. Мы не асуджаем пакт Рыбентропа-Молатава, мы прапануем не палітызаваць гісторыю, а сумесным намаганнямі больш дасканала вывучаць агульнае мінулае з мэтай кансалідацыі народаў у барацьбе за мір і бяспеку ў Еўропе.

Аляксандр Каваленя прапанаваў у межах аддзела беларускай дзяржаўнасці Інстытута гісторыі НАН Беларусі стварыць сектар гісторыі Заходняй Беларусі. Прычым зрабіць гэта яшчэ да канца 2009 года, а пазней выдаць нейкую сур'ёзную працу, магчыма, дакументальнага характару, на тэму ўз'яднання Заходняй і Усходняй Беларусі.

Дарэчы, думку Аляксандра Кавалені пра прысутнасць голасу беларускіх гісторыкаў падтрымаў і **Яўген МІРАНОВІЧ, доктар гістарычных навук, прафесар Беластоцкага дзяржаўнага ўніверсітэта**:

— Голас беларускіх гісторыкаў па гэтай тэме даволі рэдка чуваць у Польшчы, таму лічу і маю падзею, што пабачым вас у Польшчы, што з пункту гледжання інтарэсаў беларускай нацыі вы прадставіце гэтую праблему на розных канферэнцыях у Польшчы, — пажадаў замежны госць.

У сваім выступленні Яўген Міранавіч падрабязна расказаў пра дзейнасці беларускіх партый на тэрыторыі Заходняй Беларусі, і, прынамсі, пра тое, чаму савецкую ўладу вітала не ўсё насельніцтва:

— Большасць грамадства чакала нейкай сваёй, не расійскай, улады. Некаторыя чакалі камуністаў. Некаторыя — праваслаўнай улады. Чулі пра падзеі ў Савецкім Саюзе, чулі пра калектывізацыю, але ўсё гэта прымалі як польскую прапаганду. Чакалі, што прыйдзе ўлада, якая не будзе прыніжаць па культурных, этнічных прычынах, рэлігійнай адметнасці, — расказвае польскі гісторык. — Чакалі кагосьці другога, чым тую ўладу, якая прыйшла ў 1939 годзе... Таму прасавецкая арыентацыя на Беласточчыне канчаткова знікла ў 1939—1941 гадах. І калі пасля вайны жыхарам Беласточчыны прапаноўвалася паехаць у савецкую Беларусь, давалі 30 га зямлі, статак кароў — ніхто туды не паехаў...

Рыгор ЛАЗЬКО, доктар гістарычных навук, прафесар Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны, лічыць, што ніякіх комплексаў наконт 1939 года ў беларусаў быць не павінна:

— Ці трэба нам камплексаваць па прычыне, што мы былі аб'яднаныя ў выніку падпісання пакта Молатава-Рыбентропа? Ні ў якім разе! Успомнім, што і немцам у першы раз не ўдалося аб'яднацца дэмакратычным шляхам падчас рэвалюцыі 1848 года. І праз 20 гадоў яны былі загнаныя Бісмаркам у «прускія казармы», як сказалі Маркс і Энгельс. Сам факт аб'яднання Германіі не страцію свайго гістарычнага значэння з-за таго, што не яны аб'ядналіся, іх аб'ядналі. Тое ж з Беларуссю — аб'яднанне стала магчымым у выніку змовы Гітлера і Сталіна, якія менш за ўсё думалі пра аб'яднанне Беларусі. І цана была вялікая, але ў 1939 годзе іншага варыянту не заставалася, такой была наша гісторыя, і яе трэба прымаць такой, якая яна ёсць.

Павел БЕРАСНЕЎ.

Як наведаць Латвію

Адкажыце, калі ласка, якія дакументы на візу патрэбныя грамадзяніну Рэспублікі Беларусь для ўезду ў Латвію.

Ваш чытач Алег, *Латвія*

Паколькі Латвія ўваходзіць у Шэнгенскую зону, то ўезд у Латвію магчымы як па Латвійскай нацыянальнай візе, так і па Шэнгенскай візе, якая дае права на свабоднае перамяшчэнне па краінах—удзельніцах гэтага дагавора.

Для афармлення візы ў Латвію неабходныя падставы, якімі, у залежнасці ад мэты паездкі, можа быць запрашэнне, афармленае асобай, якая запрашае, ва Упраўленні па справах грамадзянства і міграцыі Латвіі, якое самастойна накіроўвае яго ў Пасольства Латвійскай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь. Грамадзянін Беларусі пры звяртанні па візу павінен ведаць нумар запрашэння, а таксама тое, што тэрмін дзеяння гэтага запрашэння — 6 месяцаў.

Асоба, якая запрашае, можа самастойна афарміць запрашэнне ў адвольнай форме і выслаць грамадзяніну Беларусі, які пры звяртанні па візу павінен мець яго пры сабе. Запрашэнне ў гэтым выпадку павінна быць натарыяльна заверджана.

Без запрашэння прымаюцца дакументы ад мужа (жонкі) грамадзян Латвіі або іншых краін ЕС і іх няпоўнагадовых дзяцей; асобаў, чыя нацыянальнасць латыш або ліў; асобаў, у якіх хоць адзін з бацькоў з'яўляецца грамадзянінам Латвіі; асобаў, якія наведваюць месца пахавання блізкага сваяка; асобаў, якія маюць у Латвіі нерухомую маёмасць або афармляюць спадчыну; асобаў, якія наведваюць Латвію ў сувязі з цяжкай хваробай або смерцю блізкага сваяка і інш.

Пры звяртанні па атрыманне візы для паездкі ў Латвію грамадзянін Рэспублікі Беларусь павінен мець пры сабе акрамя запрашэння ці яго нумару пашпарт з дзвюма свабоднымі старонкамі для віз, тэрмін дзеяння якога на тры месяцы перавышае тэрмін дзеяння візы; запоўненую анкету, якую можна атрымаць у консульскім аддзеле; дзве фатаграфіі на белым фоне памерам 35х45 мм; поліс страхавання здароўя, страхавая сума якога складае не менш за 30 тысяч еўра (не абавязковы для мужа (жонкі) грамадзян ЕС (у тым ліку Латвіі) і іх няпоўнагадовых дзяцей, а таксама для афармлення транзітных віз); даведку з месца працы аб займаемай пасадзе (студэнты падаюць ксеракопію студэнцкага білета, пенсіянеры — ксеракопію пенсійнай кніжкі); пацвярджэнне наяўнасці фінансавых сродкаў, калі ў запрашэнні не ўтрымліваецца абавязак асобы, якая запрашае, фінансаваць запрошанага; копію тэхнічнага пашпарта аўтамабіля; натарыяльна засведчаную згоду на выезд за мяжу няпоўнагадовых дзяцей і ксеракопіі пасведчанняў аб іх нараджэнні.

У якасці пацвярджэння наяўнасці фінансавых сродкаў можа быць пададзена выпіска з банкаўскага рахунка за апошнія 3 месяцы, а калі яго няма — дарожныя чэкі ці наяўныя грошы на суму 20 еўра ў дзень, калі ў грамадзяніна ёсць прадастаўленае ў Латвіі месца прабывання, або 45 еўра ў дзень пры яго адсутнасці.

Пры разглядзе заявы на атрыманне візы консульская службовая асоба мае права патрабаваць дадатковыя дакументы і звесткі, якія пацвярджаюць мэту паездкі або звесткі, якія ўказаны ў анкеце.

Больш падрабязна азнаёміцца з парадкам выдачы візы на ўезд у Латвію грамадзянам Рэспублікі Беларусь і разгорнутым пералікам неабходных для гэтага дакументаў вы можаце на сайце Пасольства Латвійскай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь www.latvija.by у раздзеле «Латвійская віза», або па тэлефоне 375 17 284 74 75.

НА СТАЛІЧНЫХ ВАДАЁМАХ ЧАСЦЕЙ ТОНУЦЬ СЛЕСАРЫ

— Чацвёра ў агульнай колькасці патанулых. Як расказаў старшыня Мінскай гарадской арганізацыі Асвод Фёдар Клюкач, другое і трэцяе месца ў сумнай статыстыцы займаюць токары і грузчыкі. Вада забрала па тры прадстаўнікі гэтых прафесій. Сярод загінулых нямала пенсіянераў (13 чалавек). Прычым пяцёра з іх патанулі дома ва ўласнай ванне, а адзін — падчас ачысткі зліўной ямы ў дварэ.

Аляксей ІВАНЮШКА, «Мінск—Навіны».

ЯКІ БЫЎ ВОДАР...

Можна толькі ўявіць, які водар стаяў у ванным пакоі, калі 33-гадовая жыхарка Калінкавічаў амаль добраахвотна вылівала ў прыбіральню 1270 літраў самагоннай брагі. Сыравіна захоўвалася на кухні кватэры ў ёмістасцях аб'ёмам ад 40 да 200 літраў. Як расказаў намеснік начальніка Калінкавіцкага РАУС Юрый Красюк, грамадзянка абсталявала сваю «лабараторыю» па вытворчасці самагону сістэмай відэаназірання.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

З нагоды

ПРАДПРЫМАЛЬНІКАМ ЗАПАЛІЛІ ЗЯЛЁНАЕ СВЯТЛО ДЛЯ ЭКСПАРТУ

ІНІЦЫЯТЫВА прадпрымальнікаў дапамагчы ў экспарце беларускіх тавараў знайшла падтрымку Прэзідэнта краіны: у пятніцу, 25 верасня, Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ № 477 «Аб некаторых пытаннях дзейнасці індывідуальных прадпрымальнікаў і ўнясенні змяненняў ва Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 15 красавіка 2009 г. № 194».

Згодна з новым Указам індывідуальныя прадпрымальнікі за дзейнасць па рэалізацыі тавараў, вырабленых на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь і набытых у беларускіх арганізацыях (вытворцаў гэтых тавараў або гандлёвых арганізацый, што ажыццяўляюць аптовы гандаль імі), плацяць адзіны гандлёвы збор у памеры 35 тыс. беларускіх рублёў за месяц і пры гэтым вызваляюцца ад выплаты падаходнага падатку, падатку пры спрошчанай сістэме падаткаабкладання, падатку на дадатковы кошт, мясцовых падаткаў і зборaў. Калі прадпрымальнік будзе ажыццяўляць іншыя віды дзейнасці, акрамя рэалізацыі тавараў за межамі рэспублікі, то ён павінен весці асобны ўлік і па астатніх відах дзейнасці плаціць патрэбныя падаткі і зборы. Што тычыцца адзінага гандлёвага збору памерам у 35 тысяч, то ён выплачваецца да набыцця тавараў з мэтай іх вывазу за межы Беларусі. Калі дзейнасць па экспарце беларускіх тавараў прынясе даход, большы за 100-разовы памер адзінага гандлёвага збору, то дадаткова трэба будзе заплаціць збор у памеры 10 % ад сумы перавышэння. Вывозімыя тавары падлягаюць статыстычнаму дэкларараванню або мытнаму афармленню згодна з заканадаўствам.

Указ № 477 дазваляе індывідуальным прадпрымальнікам ажыццяўляць аўтамабільную перавозку тавараў без спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі), аднак толькі на аўтамабілях, спецыяльна прызначаных для перавозкі грузаў з максімальнай вагой да 3,5 тоны (разам з вагой прычэпа ці паўпрычэпа), а таксама выключна прадпрымальнікаў ад абавязковага залічэння наяўнай замежнай валюты ад рэалізацыі тавараў на банкаўскія рахункі. Указ № 477 набывае сілу ў 10-дзённы тэрмін пасля апублікавання, і карыстацца ім індывідуальныя прадпрымальнікі змогуць да 1 ліпеня 2010 года.

Пракаментаваць новы Указ Прэзідэнта мы папрасілі **Аляксандра КАЛІНІНА, старшыню Беларускага саюза прадпрымальнікаў**:

— Указ вельмі станоўчы, бо ён стварае новы напрамак руху для індывідуальных прадпрымальнікаў. Ён уводзіць спрошчаную сістэму падаткаабкладання для экспартных аперацый, адмяняе ліцэнзаванне перавозак на транспарце малой грузападымальнасці, дазваляе свабодна выкарыстоўваць валюту, атрыманую за мяжой, і самае галоўнае пытанне, якое знаходзіцца ў складаным для разумення чацвёртым пункце, — гэта адмена абмежавання разлікаў наяўнымі паміж суб'ектамі гаспадарання ў 50 базавых велічынь за месяц. Такім чынам, цяпер абмежаванне разлікаў наяўнымі дзелегуецца Нацбанку, які новых дакументаў яшчэ не прыняў, але я спадзяюся, гэтыя дакументы будуць утрымліваць умовы, не горшыя за тыя, што агучваліся — 300 базавых велічынь за дзень. Гэта сур'ёзна спросціць, паскорыць і зробіць больш таннымі разлікі паміж суб'ектамі гаспадарання.

Прымяненне адзінага гандлёвага збору ў 35 тысяч, дазвол на свабоду перавозак — таксама сур'ёзныя стымулы да таго, каб прадпрымальнікі пачалі займацца гэтым відам дзейнасці. Усё-такі засталося статыстычнае дэкларараванне тавараў. Скажам, для індывідуальнага прадпрымальніка, які адзін асабіста займаецца ўсім, гэта вельмі вялікая страта часу. Таму неабходна хоць бы спрасціць парадак статыстычнага дэкларавання, калі яго не ўдалося поўнасцю адмяніць. Указ будзе дзейнічаць толькі да 1 ліпеня 2010 года, на жаль, каментары ад чыноўнікаў пакуль накшталт «ну, далі магчымасць, а потым, магчыма, усё адменім», а тут наадварот трэба казаць пра тое, што такі напрамак будзе працягнуты і надалей, а з 1 ліпеня 2010 года проста трэба будзе ў сувязі са стварэннем Мытнага саюза Беларусі, Расіі і Казахстана змяніць заканадаўства. Людзі павінны паверыць, што гэта не на некалькі месяцаў, а сур'ёзная мера. У цэлым гэта вельмі сур'ёзны антыкрызісны дакумент, які яшчэ павінен быць дапоўнены іншымі дакументамі, напрыклад, звязанымі з адменай штрафных санкцый за няправільнае афармленне накладных.

Аляксандр Калінін дадаў, што ўжо сёння група прадпрымальнікаў паехала ў Маскву, каб паглядзець на магчымасці рэалізацыі тавараў:

— Ужо праяўленая цікавасць, і людзі паехалі глядзець, куды прадаваць. Адна рэч — купіць тут, іншая — куды прадаць. Трэба наогул разумець, што працэс пераарыентацыі бізнэсу — справа не аднаго дня.

Станоўчым крокам лічыць Указ № 477 і **Уладзімір КАРАГІН, старшыня Мінскага сталічнага саюза прадпрымальнікаў і працадаўцаў**:

— Мы прымалі актыўны ўдзел у падрыхтоўцы, вывучалі гэты праект, з 22 нашых прапаноў па стымуляванні гэтага напрамку ўвайшла цэлая група, аднак далёка не ўсе пытанні. Новы дакумент стварае ўнікальную магчымасць для некаторых прадпрымальнікаў сёння заняцца гэтай праблемай і нават добра зарабіць. Мы ацэньваем такі крок станоўча, цяпер пытанне за прадпрымальнікамі — пачуюць яны ці не. Дзяржава пайшла, можна сказаць, на эксперымент, і той з прадпрымальнікаў, хто зарыентуецца — зможа добра зарабіць, ну, а той, хто адстане — пройдзе міма.

Нагадаем, што па звестках Нацыянальнага статыстычнага камітэта, суадносіны запасаў гатовай прадукцыі і сыравінных матэрыялаў у дзесяцімесячнай вытворчасці на беларускіх прадпрыемствах у студзені—жніўні склалі 80,2 %. Для параўнання: у 2008 годзе гэтыя суадносіны былі 50,4 %. Найгоршыя паказчыкі цяпер у лёгкай прамысловасці (202,1 %, або 599,61 мільярда беларускіх рублёў прадукцыі на складах) і машынабудаванні і металаапрацоўцы (164,7 %, або 3078,1 мільярда беларускіх рублёў прадукцыі на складах).

Павел БЕРАСНЕЎ.

Арэнда жылля

ПЕРШЫМІ ПАЧЫНАЮЦЬ ТАННЕЦЬ ВЯЛІКІЯ КВАТЭРЫ

Сёлета даволі хутка і рэзка закончыўся сезон студэнцкага ажыятажу на сталічным рынку арэнды кватэр. Максімальная актыўнасць будучых кватарантаў назіралася толькі ў другой палове жніўня і ў першыя дзве дэкады верасня. Тады максімальны кошт аднапакаёвых кватэр уздоўж першай лініі метро дасягаў 250—300 долараў.

АДНАПАКАЁЎКІ — МІНУС 50 USD

А вось у апошні тыдзень верасня попыт на ўсе тыпы мінскіх кватэр істотна знізіўся, таму арэнда і пачала таннець. Зараз кошт арэнды стандартных аднапакаёвых кватэр стабільна вагаецца ў межах 200 долараў плюс квартплата. У сам

Яўгена ПЯСЕЦКАГА
фота слова

Было светла і ціха ў хаце,
клён да ганку хіліўся ў журбе,
На дарогу мне зычыла маці —
хай Гасподзь беражэ цябе!
Успамін гэтай светлай далі
жыццядайную моц дае,
Колькі потым мне людзі казалі:
хай Гасподзь беражэ цябе!
Зберагаючы Крыж над сабою
(Крыж вышэйшы за ўсіх заўжды),
Мы пакутнай прайшлі грамадою
скрозь заблуджаныя гады...
Не пагасне агонь прад іконаю,
не зацягне чужынскі хаўрус,
Покуль чую Крыжом бласлаўлёнае:
хай Гасподзь беражэ Беларусь!

Наши культурны асяродак
ЖЫВАНДОЛЯ
Выпуск № 28 (74)

Патрыярх патлумачыў, навошта сучаснаму чалавеку Царква

(Заканчэнне. Пачатак на 2-й стар.)

Нарэшце, у панядзелак, дзень ад'езду — сустрэча з моладдзю Віцебска, прэс-канферэнцыя, асвячэнне крыжа на месцы Свята-Мікалаеўскага сабора... Гэта толькі няпоўныя чатыры дні. Нехта ў прэсе паездку Патрыярха ў Беларусь назваў «адпачынкам». Але, безумоўна, аўтар такога меркавання не спрабаваў паспець за Найсвяцейшым у гэтыя дні. Ён не бачыў стомленых удзельнікаў дэлегацыі ў Сафійскім саборы, якія прыселі на некалькі хвілін у крэслы, пакуль Патрыярх знаёміўся з нізкняй часткай святыні. Праўда, сам Прадстаяцель і сапраўды выглядаў на дзіва бадзёрым і свежым, нібы стома не брала яго, альбо ён атрымліваў аднекуль моцную падтрымку.

І хоць падзей і пастарскіх прамоў за гэтыя дні было шмат, і ўсе яны былі розныя, ніводная не паўтаралася, некалькі асноўных момантаў можна паспрабаваць вылучыць.

ЗВАРОТ ДА ІНТЭЛІГЕНЦЫІ

Гэта, безумоўна, запомніцца мінчанам. Падобнага ў нашым жыцці яшчэ не было. 2700 чалавек — не прыхаджане, не паломнікі, не тыя, каго звыкла бачыць на набажэнствах, а ўрачы, настаўнікі, выкладчыкі, кіраўнікі, вучоныя прыйшлі на сустрэчу з царкоўным лідарам. А можа быць не так. Патрыярх прыйшоў да ўсіх гэтых людзей, да пакалення, якое ў найбольшай ступені засталося па-за царкоўнай агароджай. Патрыярх звярнуўся да іх са словамі, поўнымі павагі, падзякі, болю і трывогі.

Ён патлумачыў, у чым прызначэнне Царквы, якая яе роля ў жыцці Беларусі і іншых народаў:

— Царква закліканa зберагаць гэты тонкі інструмент — чалавечую свядомасць... У сучасным свеце вельмі лёгка заблудзіцца, сістэма каштоўнасцяў скажоная, часта праўда змешваецца з падманам... Таму вельмі важна разумець сістэму каштоўнасцяў, якой мы жывём, і якая для нас з'яўляецца самым важным фактарам, які вызначае, у тым ліку, нашу рэлігійную і нацыянальную прыналежнасць.

Уладыка падкрэсліў, што ўздзеянне Царквы на людзей заключаецца не ў выкарыстанні сілы, не можа навязвацца, атаясамлівацца з уладай. Гэта ўздзеянне падобнае на лёгкі подых ветрыка, насустрач якому разварочваецца ўвесь чалавек. Аднак без гэтага развароту, без змяшчэння сабе ўнутр сістэмы каштоўнасцяў, якой жылі і перамагалі нашы продкі, немагчыма супрацьстаяць выклікам сучаснага свету, глабалізацыі.

Патрыярх у сваёй прамове да беларускай інтэлігенцыі ўзгадаў гісторыю і культуру Беларусі, працытаваў Максіма Багдановіча, Якуба Коласа і Васіля Быкава. На прыкладах ён паказаў, што Беларусь выйшла пераможцай з многіх катаклізмаў, але гэта было б немагчыма без духоўнай апоры, якую меў народ.

— Стварэнне дзяржаўнасці і нацыянальнага характару немагчыма без глыбокай сувязі з гістарычнымі каранямі народа, з яго царкоўнай і свецкай культурай. На арганічным адзінстве высокай духоўнасці і самабытнасці характару беларускага народа трымаецца будынак дзяржаўнасці ў Беларусі, — падкрэсліў Патрыярх Кірыл.

Уладыка прысвяціў сваю прамову важнасці духоўнага адзінства паміж народамі Расіі, Украіны, Беларусі і Малдовы.

— Усё другаснае, першаснае толькі наша агульнасць, з яе павінна выцякаць палітыка. Палітыка не можа карэктаваць базісныя каштоўнасці народа, якія з малаком маці ўваходзяць у нашу свядомасць. Толькі такая палітыка, якая будзе ўлічваць гэтыя духоўныя, маральныя, культурныя базісныя каштоўнасці адзінага народа Святой Русі, будзе запатрабавана, падтрымана народам, — упэўнены кіраўнік Рускай Праваслаўнай Царквы.

Напрыканцы свайго звароту Патрыярх параўнаў Беларусь з Белым клабуком, які з'яўляецца сімвалам чысціні, і можа вянчаць толькі галовы самых адказных іерархаў. Але заўважыў, што на белым колеры вельмі заўважныя нават самыя маленькія плямы. Яго Святасць сказаў пра асаблівае месца Беларусі і асаблівую місію, якая заключаецца ў захаванні сваёй веры і сапраўднасці.

— Мы высока цэнім вялікую ролю Праваслаўнай Царквы, якую яна адыгрывае ў фарміраванні маральных вытокаў беларускага грамадства, — сказаў на гэтай сустрэчы намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Уладзімір Патупчык. — Аднаўляючы храмы і ўзводзячы новыя, займаючыся дабрачыннасцю, Праваслаўная Царква не толькі вяртае людзям вялікую культурную спадчыну, але і захоўвае сямейныя каштоўнасці, усяляе людзям упэўненасць і надзею на тое, што толькі духоўнасць можа перамагчы зло і гвалт.

ЗВАРОТ ДА ПАСТВЫ

Такіх сустрэч было шмат. І амаль усюды Патрыярх знаходзіў асаблівыя словы, якіх ад яго чакалі людзі. У Доме Міласэрнасці Найсвяцейшы сказаў пра тое, што добрыя і грандыёзныя задумы магчыма ажыццявіць, калі намаганні людзей, Царквы і дзяржавы аб'ядноўцца. І сацыяльны цэнтр Беларускай Праваслаўнай Царквы — таму прыклад.

— Служыць чалавеку знямогламу — гэта добрая і святая мэта. Ад таго, як мы яе выконваем, залежыць сама наша пасмяротная будучыня, — звярнуўся Найсвяцейшы да духавенства, кіраўніцтва і супрацоўнікаў Дома Міласэрнасці. — Гасподзь не спытае нас аб пасадзе, якую мы займалі ў Царкве і грамадстве. Не спытае нас аб тым, у якіх дамах мы жылі і на якіх машынах ездзілі. Але Ён спытае нас пра тое, ці накармілі мы галоднага, ці напаілі таго, хто пакутуе ад смагі, ці далі прытулак вандроўніку, ці наведалі хворага або таго, хто ў цямніцы.

— Міласэрнасць — у аснове, у цэнтры нашага хрысціянскага светапогляду, — нагадаў сваёй пастве Пастар. — Погляд хрысціяніна на свет павінен быць такім, каб ён высвечваў, рабіў яўным усё тое, дзе патрабуецца прыкладанне яго сілаў.

Цэнтральнай падзеяй пастарскага візіту стала, безумоўна, святочнае набажэнства і чын Уздзвіжання Крыжа ў полацкім манастыры. Гэта падкрэсліваў і Мітрапалаіт Філарэт, гэта адчулі і ўсе праваслаўныя беларусы. Большая частка паломнікаў, якія прыбылі ў Свята-Крыжа-Уздзвіжанскі сабор манастыра, не змаглі патрапіць унутр храма і некалькі гадзін стаялі звонку, прымалі ўдзел у набажэнстве і прагна слухалі патрыяршую пропаведзь. Яна была прысвечана сімволіцы і сэнсу Крыжа ў хрысціянстве.

— Трэба сказаць, што і сёння людзі не здольныя з Крыжом звязваць нейкія станоўчыя пачуцці, перажыванні. ...«Што гэта за рэлігія такая, якая ў цэнтры свайго паслання мае пакуты і смерць?..» Гэта тыповая рэакцыя сучаснага чалавека, дакладна такая ж, як і дзве тысячы гадоў таму. Для адных — спакуса, г. зн. дзівацтва, а для іншых — вар'яцтва.

— Госпаду хацелася юродствам, вар'яцтвам гэтай пропаведзі, праз поўную адмову ад розуму адкрыць людзям тайну выратавання. А што ж з'яўляе нам Крыж Гасподні? Ён з'яўляе нам тое, што Бог ёсць любоў. Бо аддаць Сябе, Сына Свайго дзеля выратавання свету на гэтыя пакуты і панашэнні, знявагу, на злобу чалавечую, на зайздрасць жудасную, на страшнае крыжовае катаванне, — добраахвотна аддаць! — мог толькі Той, Хто свет любіць больш за Самаго Сябе.

Бог ёсць любоў, гаворыць нам апостал Павел, і толькі любоўю Божай можа быць зразумета ўся тайна Крыжа Гасподняга. А што для нас гэта азначае? А азначае гэта вось што: калі Бог ёсць любоў, то выратаванне ў любові. Вядома ж, не ў той самай любові, якую нам сёння па тэлевізары паказваюць, не ў буйстве чалавечых жарсцяў, — а ў той любві, якая моцна злучае людзей, у той любові, праз якую адзін аддае сябе іншаму з радасцю, бо любіць і заўсёды гатовы прынесці сябе ў ахвяру любімаму», — сказаў у сваёй пропаведзі Патрыярх.

Калі так адбываецца ў сям'і, сказаў Архіпастыр, сям'я становіцца моцнай, шлюб — шчаслівым. Падобнае адбываецца і з грамадствам, калі яно кіруецца законамі, у якіх закладзена высокая мараль. Калі дзяржава, Царква, школа пачынаюць выхоўваць людзей у здольнасці аддаваць сябе іншаму, — калі сама гэта аддача іншаму становіцца нацыянальным гонарам, дастаяннем, ідэалам, тады кожны захоча быць падобным на ідэал.

«Выхаванне людзей у любові пачынаецца з таго, што ў сэрцы чалавечым выхоўваецца дабрыня. Усякая злоба — па-за Божым законам. Як злачынца становіцца па-за грамадствам, таксама па-за Законам Божым той, хто мае зло ў сэрцы».

Пастар параіў кожнаму верніку, які падыходзіць да Святога Крыжа альбо асяноў сябе крыжовым знамяннем, прааналізаваць свае пачуцці, дараваць усе крыўды блізкаму, пазбавіцца ад усякага зла ў сваім сэрцы.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

ГУСЬ І БУСЕЛ — У МАНЕТАХ

З сённяшняга дня Нацыянальны банк Беларусі выпускае ў абарачэнне памятныя манеты серыі «Птушка года» — «Шэрая гусь» і памятныя манеты «Белы бусел. Жывёльны свет краін ЕўрАзЭС», паведаміў карэспандэнту «Звязды» намеснік начальніка Упраўлення інфармацыі галоўнага банка Міхаіл Журавовіч.

Памятная сярэбраная манета «Шэрая гусь» выпушчана наміналам 10 рублёў, пробай сплаву 925, масай 16,81 грама, медна-нікелевая — наміналам 1 рубель. Гэтыя манеты адчаканеныя на РДП «Казахстанскі манетны двор Нацыянальнага банка Рэспублікі Казахстан»: сярэбраная — якасцю «пруф», медна-нікелевая — «пруф-лайк», іх тыраж складае па 5000 штук кожнай.

Сярэбраныя манеты «Белы бусел. Жывёльны свет краін ЕўрАзЭС» маюць намінал 100 рублёў, пробу сплаву 999, масу 155,5 грама і намінал 20 рублёў, пробу сплаву 925, масу 33,63 грама. Медна-нікелевая манета выпушчана наміналам 1 рубель. Гэтыя манеты таксама адчаканеныя на РДП «Казахстанскі манетны двор Нацыянальнага банка Рэспублікі Казахстан»: сярэбраная наміналам 100 рублёў і медна-нікелевая — якасцю «пруф-лайк», сярэбраная наміналам 20 рублёў — якасцю «пруф». Тыраж сярэбранай наміналам 100 рублёў — 500 штук, наміналам 20 рублёў — 7000 штук і медна-нікелевай — 5000 штук.

Ігар ГРЫШЫН.

ПАЎНАМОЦНЫ ПАСОЛ

ТАК, ён Пасол у прамым сэнсе гэтага слова: мае ранг Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла. У свой час паспяхова ўзначальваў пасольствы незалежнай Украіны ў Канадзе, Славакіі, Польшчы. Быў і дэпутатам Вярхоўнай Рады. Адным словам, вядомы дзяржаўны і грамадскі дзеяч. Але я — пра іншага Пасла. Пра таго, якога пасылае на Зямлю сам Бог, каб усё бачыць, чуць, адчуваць, усведамляць і ягонымі вуснамі яскравым вобразным словам выказаць боскія адносіны да таго, што творыцца на зямной цвердзі. Я — пра Пасла-Паэта божай міласцю. Пра выдатнага майстра слова, Героя Украіны Дмытра Васільевіча Паўлычку, якому ўчора споўнілася восемдзесят зямных гадоў.

У 1999 г. юбілейнае выступленне ў кіеўскім палацы «Украіна» ён пачаў вершам свайго найбольшага настаўніка Івана Франка:

Хто ў першай чвэрці жыцця
Ведаў не здабыў,
У другой чвэрці жыцця
Дабра не нажыў,
А ў трэцяй чвэрці жыцця
Сумленным не быў, —
Той скажа ў чацвёртай:
«Усё роўна як і на свеце не жыў!»

Пачаў, каб тут жа заявіць: «Часам мне здаецца, ведамі і маёмасцю я такі убогі, а праз розныя цяжкія абставіны быў такі несумленны, што ажно хочацца крыкнуць: «Усё роўна як і на свеце не жыў!» Ведаючы няблага Дмытра Васільевіча і ягоную творчасць, хачу адразу сказаць: гэта прамовіла яго прыроджаная сціпласць. Хоць маёмасці асаблівай ён за сваё жыццё і сапраўды не нажыў (якая там маёмасць у пісьменніка!), але што да ведаў, таленту, сумлення, то гэтага дабра яму не займаць. Гэтым дабром ён багаты як ніхто. І не толькі ва Украіне, але, бадай, і ва ўсім славянскім свеце.

«Гранаслоў» — так называецца адна з некалькіх дзясяткаў яго паэтычных кніг. Якая дакладная назва! Д. Паўлычка не проста пісаў, складаў вершы, а менавіта граніў у іх кожнае слова. Ён, у адрозненне ад многіх сваіх равеснікаў і асабліва малодшых калег, ніколі не гуляў у словы і не гуляў словамі. Ён імкнуўся, каб у кожным яго творы палаў «агонь у адзенні слова» (І. Франко). Пра гэта сведчаць ужо самі назвы яго кніг — ад «Любові і нянавісці» (1953) і да «Аўтодафе» (2008). Грамадзянская смеласць, публіцыстычная зоркасць, філасофская засяроджанасць, дэмакратызм, палкае адстойванне агульначалавечых, па сутнасці боскіх, маральна-этычных пастулатаў, шчыры патрыятызм і арганічны інтэрнацыяналізм — гэтым вызначаецца глыбінная сутнасць Паўлычкі як асобы і як пісьменніка. І нішто — ні выключэнне яго з аспірантуры Львоўскага ўніверсітэта за адстойванне роднай украінскай мовы ў цёмнай памяці часы «зліцця моў», ні знішчэнне васямнаццацітысячнага тыражу кніжкі «Праўда кліча!» (1958) за антытаталітарысцкі верш «Калі памёр крывавы Тарквемада...» — нішто не змусіла яго схіліцца перад ідэалагічным фарысействам і крывадушшам. І ледзь зардзеўся світанак незалежнасці Украіны, такой жаданай для паэта, ён заклямі'ў «Братэрства па-імперску» (1991) ды, як некалі Я. Купала («Час!»), вершам заклікаў родны народ: «Уставай з каленяў!» (1991). Ён і цяпер смела папераджае сваіх «князёў», «украінскіх Банапартаў», «патрыятычных блазнаў, самалюбаў», якія «мячы адзін на аднаго куюць»:

Що там гуде? Степи й ліси гудуть,
Там хлопці йдуть,
що з тих князів зірвуть
Криві корони й крадені тризуби!
(«Там хлопці йдуть», 2006)

Аднак які агонь, такое і слова. Боскае пачуццё кахання да жанчыны, любові да роднай зямлі, роднага народа, роднай мовы, бацькоў, сяброў, увогуле добрых людзей і цэлых народаў — і такі агонь палае не толькі ў асобных вершаваных цыклах («Настаўнікам і сябрам», «Кіеўскія санеты»), але нават у цэлых зборніках вершаў Паўлычкі («Санеты падольскай восені», 1973; «Таямніца твайго аблічча», 1979). Прычым, як і наш М. Танк, украінскі паэт, услаўляючы каханне як найбольшую каштоўнасць жыцця, звяртаецца часам і да жанру эратычнай лірыкі, што надае яго паэзіі асаблівую цнатлівую шчырасць.

Сучасная еўрапейская версіфікацыя нярэдка адмаўляецца ад класічнай сілаба-тонікі, рыфмы, нават ад знакаў прыпынку, прапісных літар, як чорт крыжа баіцца быць западозранай у сувязі з традыцыямі вуснай народнай творчасці і літаратурнай класікі. У выніку многія вершы не выклікаюць ніякіх эмоцый, яны існуюць як своеасаблівыя рэбусы-загадкі, тэксты-забаўлянкі. У супрацьлегласць такой тэндэнцыі, Паўлычка ні ў ранні перыяд творчасці, ні цяпер не імкнецца быць «модным», «мадэрным», «авангардным». Наадварот, у яго паэзіі пругка струменяць крыніцы роднага фальклору, украінскай і сусветнай класічнай вершатворчасці. Не дзіва, што асобныя яго вершы сталі папулярнымі песнямі («Два кольори», «Лелеченьки», «Я стужився, мила, за тобою», «Дзвенить у зорях небо чисте» і інш). Відаць, як ніхто ў сучаснай украінскай паэзіі Паўлычка выкарыстоўвае т.зв. цвёрдыя формы верша (трыялеты, тэрцыны, секстыны, рубаі і інш.). Што да санетаў, то тут Паўлычку няма роўных. Да ўжо названых мной яго вялікіх санетных цыклаў, можна дадаць яшчэ «Львоўскія санеты», «Белыя санеты», «Балючыя санеты» і інш.

Пры ўпамінанні санета тут жа згадалася яшчэ адна неафіцыйная «пасольская» пасада паэта. Ва Украіне Паўлычка даўно стаў паўнамоцным прадстаўніком многіх літаратур свету. Дастаткова нагадаць ім адным укладзеную, перакладзеную з 25 моў свету (!), забяспечаную кваліфікаванай прадмовай і даведкамі пра 117 аўтараў (!) унікальную анталогію «Сусветны санет» (1983). Там, дарэчы, знайшлося месца і для 11 санетаў Я. Купалы і 2 — М. Багдановіча. А ён жа перакладаў на ўкраінскую мову не толькі санетапісцаў. Свайму літаратурнаму Паслу за вялікую аўтарскую «Анталогію славацкай паэзіі» (1997) удзячныя славакі, за «Анталогію рускай паэзіі» (2004) — расіяне, за «Анталогію балгарскай паэзіі» (1997) — балгары... Д. Паўлычка мае званне пачэснага прафесара Варшаўскага ўніверсітэта. І нездарма. Столькі ён пераклаў твораў польскіх паэтаў, пра столькіх (А. Міцкевіча, Ю. Славацкага, Я. Івашкевіча і інш.) захоплена і глыбока пісаў! Увогуле, няма, відаць, ніводнай еўрапейскай (дый не толькі!) літаратуры, да якой сваім перакладчыцкім або літаратуразнаўчым сціпом не дакрануўся б Паўлычка. У прыватнасці, толькі ў 2-і том яго вялікага двухтомніка «Літаратуразнаўства. Крытыка: Сусветная літаратура» (2007; 1-ы том прысвечаны ўкраінскай літаратуры) увайшлі артыкулы пра 33 пісьменнікаў розных народаў, ад Гамера, Шэкспіра, Хасэ Марці, Шарля Бадлера да Пушкіна, Блока, Ясеніна, Шолам-Алейхема, Мірдзы Кэмпе. У тым ліку — і пра нашых В. Быкава, Р. Барадуліна, Н. Гілевіча.

Некалькі згаданых вышэй фактаў ужо дазваляюць назваць Паўлычку Паўнамоцным Паслом і беларускай літаратуры, нават шырэй — беларускай культуры ва Украіне. Беларусь і беларускае прыгожае пісьменства ён добра ведае, творы многіх беларускіх паэтаў (апрача названых — А. Куляшова, П. Панчанкі, М. Танка, Г. Бураўкіна і інш.) перакладаў. Неаднойчы ён наведваў нашу краіну. Асабліва памятныя (у тым ліку і для мяне) былі яго прыезды ў Беларусь у лютым 2003-га і ў лютым 2009 года. Абодва разы прыязджаў ён да нас яшчэ з адным шчырым сябрам беларускай літаратуры Раманам Лубкіўскім. І абодва разы пасля гэтых паездак у газеце «Літаратурна Україна» з'яўляліся вялікія, на дзве паласы, разваротры з зацікаўленымі, падчас трывожнымі, але разам з тым і аптымістычнымі дыялогамі «Паўлычка — Лубкіўскі» пра сучасныя беларускія літаратурныя (і не толькі) справы, сучасны стан і перспектывы ўкраінска-беларускіх узаемасувязяў, з перакладамі вершаў беларускіх паэтаў, рэцэнзіямі на беларускія выданні і г.д. Памятаюцца і мае асабістыя кантакты з Дмытром Васільевічам, калі мы з Жаннай Дапкюнас, тагачасным дырэктарам Дзяржаўнага літаратурнага музея Я. Купалы, укладалі кнігу песняра «Санеты» на васьмі еўрапейскіх мовах. Д. Паўлычка тады быў загружаны пасольскай працай у Польшчы, але з радасцю згадзіўся перакласці ўсе 22 купалаўскія санеты, у тым ліку і 7 польскамоўных. Па сутнасці, дапераклаці, бо палова на той час ім ужо была перакладзена. А ў суправаджальным лісце да сваіх дасланых перакладаў напісаў: «Я ўдзячны лёсу за тое, што меў гонар перакладаць гэтыя надзвычай важныя творы, якія сведчаць пра геній аўтара, пра яго бясстрашную любоў да беларускага народа і пра вялікую тугу вялікай душы... У мінулым годзе я выдаў санеты Шэкспіра ў сваіх трансляцыях і, праўду кажучы, ужо быў пакляўся, што больш перакладаць нічога не буду. Але перад Купалам я адступіў. Я кланяюся не толькі Вашаму паэту, але і Вашаму народу якраз у той час, калі беларусы павінны ведаць, што яны не адзінокія, што ўкраінцы з імі».

І мы з Вамі, дарагі Дмытро Васільевіч, дарагія браты-ўкраінцы!

Вячаслаў РАГОЙША.

Юрыдычны гонар

ЧАТЫРЫ КАНСТЫТУЦЫІ БЕЛАРУСІ

480 гадоў таму, 29 верасня 1529 года, нашы продкі ўвялі народную Канстытуцыю — Статут ВКЛ

Варта пра гэта памятаць, тым больш, што сёлета споўнілася 15 гадоў яе нашчадку — сучаснаму Асноўнаму Закону Беларусі... Сапраўды, у навучальных установах адбываліся патрыятычныя заняткі на тэму правоў чалавека, на прадпрыемствах мелі месца палітгадзіны, ды нават любому мінаку на вуліцах гарадоў абавязкова кідаліся ў вочы віншаванні з нагоды Канстытуцыі. Але ці так шмат мы ўсе ведаем? Ці задумваліся вы над пытаннем, чаму наш галоўны закон такі дасканалы; як настолькі маладая дзяржава здолела стварыць яго? І будзеце мець рацыю: Беларусь мае глыбокія карані ў гісторыі і, у асаблівасці, у развіцці айчынных асноўных законаў — канстытуцый. Дакладней, гэта ўжо чацвёрты важны гістарычны канстытуцыйны закон Беларусі!..

Дапамагаць жа высвятляць гістарычны лёс беларускіх зборнікаў законаў будзе наш спецыяліст, <u>прафесар кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права БДУ, аўтар шматлікіх даследаванняў на тэму гісторыі развіцця беларускага справаводства, доктар юрыдычных навук спадарыня Таісія Іванаўна ДОЎНАР</u>.

САМЫ ДАСКАНАЛЫ

Першая спроба агульнага нармавання справаводства адносіць нас у XVI ст., у той час, калі жыў і толькі пачынаў сваю дзейнасць вялікі беларускі асветнік Францыск Скарына. Гэта часіны бясконцых войнаў і асветы, крызісу дзяржаўнай улады ды адначасова ўзмацнення самой дзяржавы. Дакладна ж тады пачынае з вялікай хуткасцю развівацца дыпламатыя, набываючы знаёмыя да сённяшняга часу рысы. І першая Канстытуцыя Беларусі была дачкой свайго часу і свайго народа, бо гэта Статут Вялікага Княства Літоўскага — самы дасканалы звод законаў на той час не толькі ў Еўропе, але і ў свеце; звод законаў, што меў канстытуцыйны характар.

З'явіўся ён на пачатку стагоддзя, 29 верасня 1529 г., хоць яго ўкладанне вялося на працягу дзесяці гадоў. У Статуце выдзяляліся цывільныя (грамадзянскія), зямельныя, крымінальныя, ваенныя і нават прыродаахоўныя артыкулы. Па сваёй грунтоўнасці ён быў значна набліжаны да сучасных Асноўных Законаў дзяржаваў, чым усе папярэднія зборнікі звычаёвых нормаў. Сам факт выхаду ў свет такога зборніка законаў паставіў нашу Радзіму ў шэраг (калі не на ўзвышшы) найбуйнейшых краінаў Еўропы па развіцці прававой навукі. Дарэчы, некаторыя даследчыкі лічаць, што працай па падрыхтоўцы Статута кіраваў той самы доктар навук, наш першадрукар Францыск Скарына. Відаць, таму і не дзіўна, што Статут атрымаўся такім гуманістычным да свайго часу. Уявіце: калі ў Еўропе панавала інквізіцыя, то на Беларусі ўжо была зацверджана забарона дыскрымінацыі па рэлігійным прынцыпе; калі ж ва ўсім свеце манарх вырашаў, каго мілаваць, а каго катаваць, дык у ВКЛ ужо існавала палоча прэзумпцыі невінаватасці.

Але і на гэтым нашы продкі не збіраліся спыняцца, а таму праз нейкія паўстагоддзя выходзяць у свет значна дапрацаваныя і ўдасканаленыя Статуты 1566 і 1588 гадоў. Найлепшыя людзі свайго часу працавалі над законамі ВКЛ: гэта і вялікі рэфарматар Мікалай Радзівіл Чорны, і Канцлер Леў Сапега, які ў апошняй «рэдакцыі» 1588 г. на прававым узроўні зацвердзіў старабеларускую мову ў якасці дзяржаўнай (трэба сказаць, што і ўсе Статуты выйшлі нашай мовай). Дзеянне ж гэтага найвялікшага зводу законаў было прыпынена толькі ў сярэдзіне XIX ст., калі Беларусь увайшла ў склад Расійскай імперыі. Але нават у канцы XVIII ст. французы і палякі зазначалі, што Статут 1588 года з'яўляецца прыкладам для развіцця ўласных Канстытуцый, законаў, кодэксаў, а таму ён быў пакладзены ў аснову Асноўных Законаў многіх краінаў Еўропы.

Каментар спецыяліста:

Т.Д.: *Калі ўзяць Статут Вялікага Княства, то гэта звод законаў (інакш і не назавеш), у якім былі абагульненыя ўсе нарматыўна-прававыя акты свайго часу. Асабліва апошні Статут з'яўляецца найвялікшым дасягненнем, бо ўсе кірункі жыцця, пачынаючы ад парадку праходу вайсковай службы і заканчваючы рэлігійнымі ды «спадчыннымі» пытаннямі, былі закранутыя на яго старонках. Вельмі важна, што Статуты надавалі, як цяпер любяць казаць, легітымнасць суверэнітэту Вялікага Княства Літоўскага, нават не заўважаючы існавання Рэчы Паспалітай. У гэтым зводзе законаў з'явіўся акрэслены, знаёмы нам па сённяшніх Канстытуцыях, падзел уладаў: так, напрыклад, заканадаўчая ўлада належала толькі Сойму, які з'яўляўся прадстаўніком народа — шляхты (варта сказаць, што шляхта ў Беларусі была большай, чым дзе-небудзь яшчэ: прыкладна, 10 % насельніцтва. — **Аўт.**). Безумоўна, Статут можна назваць сапраўднай Канстытуцыяй, няхай і феадальнай, бо і часы былі феадальныя. А таму гэта вельмі дваісты Закон: з аднаго боку, ён апераджаў свой час, бо і прынцыпы абвяшчаліся прагрэсіўныя (вяршэнства закона, падзел уладаў, прэзумпцыя невінаватасці і інш.); з другога ж боку, гэта быў феадальны закон, бо прывілеі надаваліся толькі шляхце.*

ПЕРШЫ Ў ЕЎРОПЕ, ДРУГІ Ў СВЕЦЕ

Наступным крокам мы павінны ганарыцца не менш за папярэдні, бо стаць першымі — ганаровая падзея, а палепшыць дасягненні папярэдніка і давесці да дасканаласці яшчэ больш паважана. Так адбылося і з Канстытуцыяй Рэчы Паспалітай, якая была другой у свеце Канстытуцыяй (першай была ў сучаснай звышдзяржавы ЗША), прынятая 3 мая 1791 года Чатырохгадовым Соймам. Яна з'яўлялася сапраўдным прарывам у прававой думцы Новага часу, бо пераварала грамадства з феадальнага ў буржуазнае, і, як вынік, часткова ліквідавала прыгоннае права — кожны чалавек аб'яўляўся вольным грамадзянінам. Былі праведзеныя важныя эканамічныя і судовыя рэформы, з'явіўся падзел інстытутаў улады на звыклыя сённяшняму воку судовую, выканаўчую і заканадаўчую... Увогуле ўсе найлепшыя дасягненні амерыканскай Канстытуцыі і ідэйныя набыткі Вялікай Французскай рэвалюцыі знайшлі сваё месца і на старонках Канстытуцыі Рэчы Паспалітай. І што яшчэ больш цікава, яна была перапісаная з Канстытуцыі РСФСР 1918 г. — першай савецкай Канстытуцыі. Частае перавыданне Канстытуцыі БССР у савецкі перыяд зрабіла сваю справу, а таму, гартаючы яе, нельга знайсці асаблівых адрозненняў ад СССРаўскай Канстытуцыі. Апошняя ж, у сваю чаргу, на паперы лічылася лепшай у свеце, а таму, можна меркаваць, што гэтакім быў і найлепшы з усіх савецкіх, апошні Закон БССР 1978-га года. Варта дадаць, што яшчэ роўна 16 гадоў таму ўся Беларусь яшчэ жыла паводле Канстытуцыі Беларускай ССР 1978 года.

Каментар спецыяліста:

Т.Д.: *Так, першая Канстытуцыя 1919 года — дастаткова супярэчліва класавы закон, які спярша ўводзіўся толькі для таго, каб надаць легітымнасць існавання БССР, але ж нейкіх адметных рысаў яшчэ тады не было, бо ўсе артыкулы проста перапісваліся з Канстытуцыі РСФСР, прычым скарочана. У дадатак у гэтым Законе шмат чаго не было: напрыклад, ні слова не сказана пра выбарчае права і мясцовыя органы ўлады ды СНК (урад). Чаму ж так? А прычына ў тым, што ўсе рашэнні прымала расійская кампартыя, якая ў перыяд утварэння БССР магла часткова пазбавіцца ўлады на землях беларускай дзяржавы, калі ў БССР з'явіліся б Наркаматы (міністэрствы). І толькі ў наступнай «рэдакцыі» 1927 г. з'явіліся артыкулы аб з'ездзе Саветаў, мясцовых органах улады, выбарчым праве, статусе сталіцы і г.д. І самае галоўнае, што з'явілася нешта такое, што адрознівала гэтую Канстытуцыю ад адпаведнай Канстытуцыі СССР: чатыры дзяржаўныя мовы (беларуская, польская, руская, яўрэйская). Варта дадаць, што адным з найвялікшых набыткаў наступнага Закона 1937 года з'яўляецца абвяшчэнне права на адукацыю, працу, матэрыяльнае забеспячэнне нямогламу і г.д. У пазнейшыя ж перыяды, калі Асноўны Закон няўхільна развіваўся ў лепшы бок, дасягнуўшы свайго найлепшага ўздыму ў 1978 г., ён усё адно знаходзіцца ў поўнай адпаведнасці з Канстытуцыяй СССР 1977 года (што значыць, поўнае падпарадкаванне цэнтру (Маскве) па ўсіх важных пытаннях) — дзе ж тады самастойнасць, што абвяшчалася? Але, нягледзячы на гэта, яна ўсё ж была адной з самых значных і прагрэсіўных з усіх савецкіх Канстытуцый.*

НАША РЭЧАІСНАСЦЬ

Урэшце, на вяршыні айчыннага развіцця права месціцца сучасны Закон Рэспублікі Беларусь. Дзейная Канстытуцыя нарадзілася ў бясконцых спрэчках і праўках, беручы вопыт з усіх свецкіх папярэднікаў, улічваючы і міжнародны. У нашым Асноўным Законе дзяржавы ёсць усё тое, што неабходна, што не дае падставы для яе бесперапынных зменаў. Такім чынам, гэтая адна з самых значных падзей у найноўшай гісторыі Беларусі адбылася 15 сакавіка 1994 года. Пазней з некаторымі праўкамі адпаведныя рэдакцыі Канстытуцыі былі прынятыя на агульнанацыянальных рэферэндумах 1996 і 2004 гадах.

Каментар спецыяліста:

Т.Д.: *Сапраўды, дзейная Канстытуцыя — гэта наша рэчаіснасць і ўсё тое, чаго беларускае грамадства дасягнула за ўвесь перыяд развіцця права, канстытуцыйная гісторыя якога налічвае болей за паўтысячагоддзя. Падкрэслю два важныя, на мой погляд, палажэнні. Па-першае, яна гаворыць аб пабудове сацыяльнай, прававой дзяржавы, а, па-другое, у Прэамбуле Канстытуцыі ідзе размова аб шматвяковай гісторыі беларускай дзяржаўнасці!.. Лічу, што наша сучасная Канстытуцыя мае вялікія дасягненні і паказвае не тое, як было, як мы жылі, а як патрэбна жыць і да чаго імкнуцца. А таму, паколькі яна закранае ўсе сферы нашага жыцця: яна ёсць крыніцай да ўсяго, — Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь мае вялікія шанцы ў спрэчцы паміж найлепшымі Законамі свету. Вядома, ёсць заўжды да чаго імкнуцца, і, можа, праз некалькі стагоддзяў нашы нашчадкі будуць гэтаксама разбіраць наш сучасны Закон, як і мы робім тое самае са Статутам ВКЛ, ці іншымі прававымі зборнікамі.*

Як бачым, Беларусь мае сваю залатую прававую базу, якая развівалася з пачатку дзён, пачатку нашай дзяржаўнасці. У нас ёсць, чым ганарыцца: гэта і першы ў свеце найдасканалейшы зборнік законаў Вялікага Княства Літоўскага, і другая ў свеце Канстытуцыя Рэчы Паспалітай, і, паклаўшы сённяшнюю, Асноўны Закон Беларускай ССР, і, безумоўна, наша Канстытуцыя. І, веру, мы можам з упэўненасцю казаць: беларусы — юрыдычная нацыя!

Мікола ТАМАШЭВІЧ.
Фота аўтара і з архіўных крыніц.

Статут ВКЛ 1588 года.

Канстытуцыя Рэчы Паспалітай 1791 года.

Канстытуцыя Беларускай ССР 1927 года.

КАНСТЫТУЦЫЯ
РЭСПУБЛІКІ
БЕ

ШТО НАЎМЕ Ў БЕЛАРУСАЎ?

Ведаюць найперш сацыёлагі

Мы часта чуем: гэта для людзей, на карысць народа. Так і карціць спытаць: а ці цікавіліся вы ў саміх людзей, што ім патрэбна, што турбуе і што задавальняе? Прынамсі сацыёлагі гэтым цікавяцца. І вынікі іх працы карысныя ўсім — ад уладаў да бізнэсменаў, быць у курсе праслаўтай грамадскай думкі дарагога варта. Сацыёлагі могуць падказаць, на што звярнуць увагу заканадаўцам, і даць падставу для слушных захадаў выканаўцам, адкрыць вочы тэлевізійнікам на густы аўдыторыі і патлумачыць вытворцам, чым кіруюцца пакупнікі, аддаючы перавагу гэтаму прадукту, а не іншаму. Сама па сабе акадэмічная ўстанова Інстытут сацыялогіі, што займаецца перш за ўсё тэарэтычнымі распрацоўкамі, арыентаваная ўсё ж на прыкладны характар даследаванняў, на канкрэтны вынік.

Рэха крызісу

— Толькі з улікам меркавання людзей удасца прымаць рашэнні, якія будуць падтрыманыя большасцю насельніцтва і будуць гэтым насельніцтвам рэалізоўвацца, — упэўнены **дырэктар Інстытута сацыялогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар сацыялагічных навук, прафесар Ігар КАТЛЯРОЎ**, аўтар канцэпцый заканадаўчага забеспячэння нацыянальнага развіцця краіны, фарміравання ў Беларусі грамадзянскай супольнасці, стабілізацыі міжканфесійных адносінаў.

З ім мы і абмяркуем, што наўме ў беларусаў. Тым больш актуальна гэта ва ўмовах крызісу.

— Аператыўныя сацыялагічныя даследаванні паказваюць, што нашы грамадзяне адчуваюць яго наяўнасць. 90 працэнтаў насельніцтва лічаць, што крызіс іх закрануў, — дзеліцца з намі першымі зводкамі навукоўца. — Але гэта пераважна звязана з інфляцыяй, астатнія праблемы не такія істотныя, як часам іх малююць.

І толькі дзясятая частка нашых суграмадзян (у адпаведнасці з вынікамі апытання) знаходзіцца ў шчаслівай недатычнасці... пакуль? Больш дэталёва меркаванне беларусаў пра крызіс будзе вывучана ў кастрычніку — падчас чарговага этапа сацыялагічнага маніторынгу. Шмат гадоў пад кіраўніцтвам спадара Катлярова даследуецца ўспрыняцце жыхарамі краіны сацыяльна-палітычнай сітуацыі. Прыблізна дзве трэці пытанняў штогод паўтараюцца. Навошта?

— Такім чынам мы можам дастаткова дакладна спрагназаваць сацыяльна-палітычную і эканамічную сітуацыю і даць адказ на пытанне, што ж будзе заўтра з тымі ці іншымі аб'ектамі нашага даследавання. Ва ўмовах крызісу адной з найважнейшых функцый сацыялогіі з'яўляецца прагнастычная. Нельга ісці наўздагон падзеям — іх трэба прадказваць і засцерагацца ад магчымых негатыўных наступстваў. Многія законы яшчэ на стадыі праектаў шырока абмяркоўваюцца ў грамадстве. А чаму б ужо на гэтым этапе спецыяльна ўтворанай экспертнай групе Інстытута сацыялогіі не выказваць сваю пазіцыю?

І сапраўды! Ёсць жа, напрыклад, крыміналагічная экспертыза прававых актаў — калі ацэньваюць, ці не павялічаць яны ўзровень злачыннасці, гэтак жа варта было б улічваць і грамадскую думку... Паколькі выбарка рэпрэзентатыўная (у апытанні прысутнічаюць меркаванні ўсіх сацыяльных груп), можна лічыць, што вынікі штогадовага маніторынгу адпавядаюць меркаванню жыхароў нашай краіны. Яшчэ траціна апытальніка — так званыя сітуацыйныя пытанні, што ўяўляюць найвялікшую цікавасць у канкрэтны час. Няцяжка здагадацца, чаму будуць прысвечаныя сітуацыйныя пытанні сёлета. Ну, а пакуль мы яшчэ не маем інфармацыі пра рэакцыю беларусаў на крызіс, застаецца толькі звярнуцца да папярэдніх (мінулагодніх) даследаванняў у спробе высветліць, што дапамагае суайчыннікам змагацца з жыццёвымі нягодамі.

Выратавальная саломінка

Як высветлілася, паратунку мы шукаем найперш у сям'і:

— Больш як палова рэспандэнтаў лічыць, што сям'я дапамагае ва ўсіх жыццёвых сітуацыях, прыблізна чвэрць мяркуе, што ў большасці, — кажа Ігар Катляроў.

Многія з нас збавення шукаюць у рэлігіі:

— Крыху менш за палову рэспандэнтаў перакананыя, што выжыць у найскладанейшай сітуацыі дапамагае вера ў Бога. Большасць удзельнікаў апытання лічаць, што сучаснаму чалавеку патрэбная рэлігія. Так, паводле меркавання 32 працэнтаў, яна садзейнічае маральнаму росту людзей, 25,8 працэнта — дапамагае захаваць культурныя традыцыі народа, 22,4 працэнта — дае чалавеку заспакаенне і ціхмянасць, 16,8 працэнта — дапамагае знайсці сэнс жыцця. У той жа час рэгулярна наведвае храм толькі кожны дзясяты апытаны...

Палітычны парадокс

А вось на палітычную дзейнасць як на палачку-выручалачку, паводле апытання, беларусы асаблівых спадзяванняў не ўскладаюць. Досыць прадказальныя вынікі, пагадзіцеся. Ужо хоць бы таму, што пра айчынныя палітычныя партыі, мякка кажучы, не чуваць...

— Паводле звестак нашага сацыялагічнага маніторынгу, партыям давярае толькі 6,9 працэнта насельніцтва, а не давярае — ажно 45,3 працэнта. Змадэлюем сітуацыю: калі б у Беларусі зараз праводзіліся парламенцкія выбары па прапарцыянальнай выбарчай сістэме («партыйных спісах»), што практыкуецца ў Расіі, то 22,3 працэнта выбаршчыкаў прагаласавалі б супраць усіх партый. Цалкам верагодна, што дзве трэці насельніцтва наогул не пайшлі б на выбары, бо нічога не ведаюць пра беларускія партыі. Выбарчы бар'ер давялося б устанаўліваць мінімальны — два працэнты. Але і яго пераадолела б толькі Ліберальна-дэмакратычная партыя. Папулярнасць калісьці магутнай палітычнай сілы — Камуністычнай партыі Беларусі — знізілася за апошнія 18 гадоў амаль у 40 (!) разоў.

Не маглі мы не пацікавіцца ў доктара сацыялагічных навук, колішняга парламентарыя, аднаго з вядучых спецыялістаў краіны ў галіне палітычнай сацыялогіі і палітычнай філасофіі, адкуль ногі растуць у гэтага беларускага парадокса.

— Самай сур'ёзнай праблемай практычна ўсіх паліtпартый краіны з'яўляецца амаль поўная адсутнасць тэарэтычнай і ідэалагічнай работы, яны не бяруць удзел у распрацоўцы і прыняцці палітычных рашэнняў — а гэта іх ключавая функцыя. У многіх з іх няма яркіх, запамінальных лозунгаў, практычна няма цікавых, знакавых лідараў. У Палаце прадстаўнікоў дэпутаты не выступаюць як члены палітычных партый, не агучваюць падыходы сваёй партыі да найважнейшых пытанняў. Аднак самае галоўнае — большасць партый не цікавіць жыццё простых людзей. Для сябе сабралісь, пагутарылі, а што з усімі намі, з Радзімай будзе — іх не надта хвалюе. Такія палітычныя структуры як дзяржаве, так і людзям зусім непатрэбныя, — заключае дырэктар Інстытута сацыялогіі.

У яго планах — надаць асаблівую ўвагу палітычнай сацыялогіі (пакуль новаму для нашай краіны кірунку, у той час як на Захадзе гэта досыць распаўсюджана). Магчыма, ужо налета пачнецца падрыхтоўка аспірантаў па такой спецыяльнасці. Палітычная сацыялогія павінна ўсебакова вывучаць уладныя адносіны і іх успрыняцце ў беларускім грамадстве. «На жаль, раней гэтым у краіне практычна не займаліся, а праблем, як высветлілася, шмат», — сцвярджае Ігар Катляроў. І «папулярнасць» палітычных партый — не адзінае таму сведчанне. Вынікі сацыялагічных даследаванняў няўмольныя — народныя абраннікі карыстаюцца невысокім аўтарытэтам у народа.

— Усё з-за таго, што кандыдаты ў парламентарыі абяцаюць вельмі шмат, а дэпутаты робяць, на мой погляд, яшчэ вельмі мала, — мяркуе Ігар Катляроў. — Патрэбныя канкрэтныя рэкамендацыі па паляпшэнні дзейнасці заканадаўчай галіны ўлады, новая тэарэтычная мадэль дзяржаўнага кіравання. Гэтым і займаецца наш інстытут.

Актуальным становіцца развіццё грамадзянскай супольнасці — новага сектара грамадска-палітычнага жыцця, дзе адбываецца пераход некаторых уладных функцый ад дзяржавы да незалежных ад яе грамадскіх аб'яднанняў.

— Грамадзянская супольнасць як натуральны партнёр уладаў у вырашэнні праблем насельніцтва можа стаць адным з аб'ектаў даследавання сацыёлагаў, — заўважае кіраўнік інстытута. — Сёння такія катэгорыі, як стабільнасць і згода, прававая дзяржава і цывілізаваныя рынкавыя стасункі, права ўласнасці і правы чалавека, свабода сацыяльных камунікацый і нацыянальная ідэя цяжка ўявіць па-за кантэкстам грамадзянскай супольнасці.

Усё стабільна?

У той час як сацыёлагаў клапоціць «вялікая» палітыка, большасць беларусаў хвалюе стан здароўя і цэны на тавары першай неабходнасці. Якасць і даступнасць медыцынскага абслугоўвання, узровень аплаты працы турбуюць амаль кожнага другога жыхара краіны. Аднак большасць беларусаў сваім матэрыяльным становішчам, трэба думаць, здаволеныя — толькі 2,7 працэнта рэспандэнтаў лічаць сваю жыццёвую сітуацыю бядотнай. А эканамічныя праблемы турбуюць толькі кожнага пятага. Паводле слоў Ігара Катлярова, неўзабаве пасля аварыі на ЧАЭС такіх было дзве трэці.

Даказаць, што ў Беларусі няма ніводнага мужчыны...

Набліжаюцца прэзідэнцкія выбары, напярэдадні Інстытут сацыялогіі будзе праводзіць апаведны маніторынг, вызначаць рэйтынг палітычных лідараў. Між іншым, інстытут прэзідэнта ў Беларусі, паводле даследаванняў Інстытута сацыялогіі, мае найбольшы рэйтынг сярод уладных структур.

— Ёсць такая праблема, што некаторыя сацыялагічныя службы ў краіне выконваюць заказ самых розных палітыкаў, і таму яны прыводзяць самыя розныя звесткі. Сацыёлаг можа даказаць нават тое, што ў Беларусі няма ніводнага мужчыны... калі правядзе апытанне ў жаночай лазні! Таму давяраць вынікам даследаванняў можна толькі тады, калі поўнасцю выкананыя сацыялагічныя тэхналогіі. Для гэтага ўтвораная Камісія па апытаннях грамадскай думкі. Яна аказвае метадычную дапамогу сацыялагічным структурам, што праводзяць даследаванні, якія маюць дачыненне да выбараў і сацыяльна-палітычнай сітуацыі. Камісія акрэдытоўвае ўсе сацыялагічныя службы, якія праводзяць такія даследаванні, прычым па фармальных прыкметах, распрацаваных усёй сацыялагічнай супольнасцю Беларусі. Туды ўваходзяць усе без выключэння вядомыя айчынныя сацыёлагі, — запэўнівае Ігар Катляроў.

Камісію ўжо не першы год узначальвае наш суразмоўца. Рэгулярна праводзяцца семінары, тэма чарговага, які мае адбыцца літаральна ў канцы верасня, — рэгіянальная сацыялогія. У цэнтры ўвагі айчынных спецыялістаў апроч іншага яшчэ і праблемы беларускай ідэнтычнасці, улічваючы тое, як імкліва набіраюць абароты інтэграцыйныя працэсы. І хацелася б, каб ва ўсіх даследаваннях сацыёлагаў апошняе слова сапраўды было за намі, беларусамі.

Ала МАЧАЛАВА.

Інфарм-укол

РАЦЫЁН ДЛЯ ГІПЕРТОНІКАЎ

У 1997 годзе было праведзена даследаванне — Дыетычны падыход да лячэння гіпертаніі, Dietary Approach to Stop Hypertension, DASH, — падчас якога параўноўвалася эфектыўнасць трох дыет. У групу паддоследных з 459 чалавек уваходзілі хворыя на гіпертанічную хваробу і людзі з памежнымі значэннямі артэрыяльнага ціску з рызыкай развіцця гіпертаніі.

Адна дыета поўнасцю адпавядала харчовым звычкам сярэдняга амерыканца — нізкае ўтрыманне садавіны, гародніны і малочных прадуктаў. Утрыманне тлушчу даходзіла да 37 працэнтаў агульнай каларыйнасці. У другой дыеце былі шырока прапанаваныя садавіна і гародніна, але адсутнічалі малочныя прадукты і тлушч. Трэцяя дыета, названая камбінаванай, утрымлівала садавіну, гародніну, а таксама вялікую колькасць злакаў і абястлушчаных малочных прадуктаў. Тлушч складаў менш за 30 працэнтаў агульнай каларыйнасці.

Да канца даследавання ў тых, хто атрымліваў пладова-агароднінную і камбінаваную дыеты, артэрыяльны ціск знізіўся. Аднак найбольш спрыяльны вынік быў атрыманы ў тых, хто прымяняў камбінаваную дыету. У хворых, якія пакутавалі ад артэрыяльнай гіпертэнзіі, сісталічны ціск знізіўся ў сярэднім на 11,4 мм рт. сл., а дыясталічны на 5,5 мм рт. сл. Такога выніку часам даводзіцца дабівацца з дапамогай лекаў. Даследчыкі лічаць: эфект абумоўлены тым, што дыета стымулюе змяншэнне вагі цела, і, акрамя таго, багатая на калій, кальцый і магній — на рэчывы, якія спрыяюць зніжэнню артэрыяльнага ціску.

Дыета DASH

Злакавыя і крупы

Да злакавых адносяць хлеб, кашы, рыс. Акрамя таго, што ў злаках мала тлушчу, яны ўтрымліваюць вялікую колькасць складаных вуглеводаў і разнастайных спажыўных рэчываў. У цэльных злаках больш клятчаткі і карысных рэчываў, чым у ачышчаным зерні. Не дадавайце да хлеба тлустых прадуктаў — масла і соусаў, вяршкоў і сыру. Лепей карыстайцеся *фруктовымі джэмамі* або мёдам.

Прыклады страў

1/2 кубка (90 г) вараных злакаў, рысу

1/2 кубка гатовых шматкоў

1 луста хлеба

1/2 булачкі

Садавіна і гародніна

Не ўтрымлівае тлушчу, у ёй мала калорый, шмат клятчаткі і вялікая колькасць пажыўных рэчываў, у тым ліку калію і магнію, а таксама фітазлучэнняў — рэчывaў, здольных знізіць рызыку сардэчна-сасудзістых захворванняў і некаторых тыпаў злаякасных пухлін. Імкніцеся не дадаваць у гародніну тлустыя соусы і лішак алеяў.

Прыклады страў

1/4 кубка (45 г) разынак

3/4 кубка (180 г) 100-працэнтга фруктовага соку

1 сярэдні яблык, банан ці іншы фрукт

12 вінаградзін

1 кубак (60 г) зялёнай гародніны

1/2 кубка (90 г) варанай гародніны

1 сярэдняя бульбіна

Малочныя прадукты

Ключавая крыніца кальцыю, вітаміну Д і бялку, але ў іх можа ўтрымлівацца вельмі многа тлушчу. Выбірайце малако з нізкім утрыманнем тлушчу або абястлушчанае.

Прыклады страў

1 кубак (240 г) малака ці ёгурта

45 г абястлушчанага сыру або сыру з нізкім утрыманнем тлушчу

Мяса, птушка і рыба

Багатыя на бялок, вітаміны групы В, жалеза і цынк. Выбірайце посную выразку — філейную частку. З мяса выдаляйце ўвесь бачны тлушч, а з птушкі — скуру. Рыбныя прадукты — самыя бедныя на тлушч, але багатыя на бялок жывёльнага паходжання. Тлушчы рыбы — у большасці сваёй амега-3-ненасычаныя тлустыя кіслоты, якія спрыяюць зніжэнню ціску, разрэджваюць кроў і зніжаюць рызыку трамбозаў.

Прыклады страў

60—90 г варанай птушкі без скуры або рыбы, або нятлустага мяса

Бабы, арэхі і семкі

Да бабоў адносяць фасолю, сушаны гарох, чачавіцу, у якіх мала тлушчу, няма халестэрыну, і яны з'яўляюцца цудоўнай крыніцай бялку. Акрамя таго, бабовыя багатыя на пажыўныя рэчывы, у тым ліку магній, калій, фітазлучэнні і клятчатку. Хоць арэхі і семкі ўтрымліваюць тлушч, большая яго частка прадстаўлена монаненасычанымі ліпідамі, якія адыгрываюць прафілактычную ролю ў ішэмічнай хваробе сэрца.

Прыклады страў

1/2 кубка (100 г) варанай фасолі

1/4 кубка (30 г) семак

1/3 кубка арэхаў

Вядучая рубрыкі Святлана БАРЫСЕНКА.

ПЕРАКУЛІЎСЯ

На аўтамагістралі Івацэвічы—Гродна каля в. Шэпічы Пружанскага раёна ехаў беспрацоўны з в. Малочкі, які не меў вадзіцельскага пасведчання. Акрамя гэтага, 21-гадовы хлопец быў п'яны. І не дзіўна, што яго ВАЗ-2101 апынуўся ў кювеце і перавярнуўся.

19-гадовы пасажыр загінуў.

УКРАЛА РАЗ, ДРУГІ І ПАПАЛАСЯ

Беспрацоўная з г. Калінкавічы на калгасным рынку ў Драгічыне выкрала ў мясцовай жыхаркі грошы, дакументы вадзіцеля і банкаўскую картку.

Праз паўгадзіны яна абрабавала жыхарку Кобрына — выкрала грошы і банкаўскую картку.

Аператыўная група зладзейку вылічыла і затрымала.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА

«ПАГОДА Ў ДОМЕ»-6

Працягваем гэты класіфікацыйны конкурс заданнем № 6 — камбінацыйнай праблемай:



Белыя: a5, b6, d4, f6, g7, h2 (6). **Чорныя:** b2, b8, c3, d8, e5, f4, g3, h4 (8). Выйгрыш.

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі».

БЛІЦ-50/5

Яго прапануе наш актыўны аўтар з Наваполацка Пётр Шклудаў:



Белыя: 8, 12, 13, 17, 19, 22, 27, 37, 46 (9). **Чорныя:** 2, 3, 26, 28, 29, 33, 35, 39, 41 (9). Перамога белых.

РЭДКІ ХОД

Вядомы дзіцячы трэнер з Гродна Міхаіл Мікалаевіч Стэфановіч захапляецца і шашачнай кампазіцыяй. У рэдакцыю ён даслаў шэраг сваіх новых задумак на 64-клетачнай дошцы. Выносім на ваш суд некаторыя з іх:

№ 1. Белыя: a1, a5, a7, b6, f2, g7 (6). **Чорныя:** b4, c3, d2, d4, e3, h2 (6). Перавагу дае рэдкі ход 5. ab8!

№ 2. Белыя: b4, c5, d4, e7, f6, g5, g7 (7). **Чорныя:** a7, b2, b6, c7, e3, e5, f2, h4 (8). Белыя перамагаюць ударам дамкі «абцасікам» з поля h6. Канструкцыя дапаўняе творы А. Кагоцькі (Пінск), С. Рэзнікава (Харкаў) і вядучага рубрыкі (глядзі папярэдні выпуск шашак).

№ 3. Белыя: a1, a3, b2, f2, f4, f6, g5, g7 (8). **Чорныя:** a5, b6, c3, c5, d2, d4, d6, h4, h8 (9). Тут дапамагае аналагічны ўдар, але ўжо з поля g7. Пераканайцеся ў гэтым. Таксама будзем рады вашым рашэнням.



ЧЭМПІЁНЫ І ІХ ВІЦЭ

Раней мы інфармавалі, што Андрэй Толчыкаў (Гомель) заваяваў залаты медаль на першынстве свету ў Віцебску па шашках-100 сярод моладзі ўзростам да 20 гадоў. А мінчанка Дар'я Федаровіч стала віцэ-чэмпіёнкай у турніры дзяўчынак.

У Польшчы не падвялі іх прадстаўнікі шашак-64. У катэгорыі да 13 гадоў была мацнейшай Вера Хвашчынская (Бабруйск). У хлопчыкаў сярэбраную ўзнагароду атрымаў Аляксей Куніца (Мінск).

РАШАЕМ, АБВЯРГАЕМ

Калі ласка, праверце свае рашэнні ранейшых заданняў:

«Пагода ў доме»-6/4 (М. Грушэўскі): g5 (f8:h6A) c5, cb8, b:d6, b8 (b6, e3) f4, b8x. A (f4:h6) ab8, b6-a7, g5, h8 (d4) I c3 (e3) e1 (b4, f2) g3, c7x. I g3? (e3) e1A (b4, f2)=. IA c3(e7)=.

Па-за конкурсам (М. Грушэўскі): ab8, e7, d8, e3!, c1x.

Бліц-50/3 (А. Маісееў, М. Грушэўскі): 17, 14, 3, 49 з запіраннем чорных на палях 36, 41, 43 і 45. Другая іх варыяцыя-мініяцюра мае тую ж самую развязку з пазбаўленнем хадоў простай 43.

Аўтар бліца-47/6 П. Шклудаў перадаў па электроннай пошце абвяржэнне доказаў В. Талкачова (в. Уздзевічы Клімавіцкага раёна), што заданне дапускае пабочныя разгалінаванні: 1. c3 (b4) d4 (a3) c3 (h6)= і 1. d8 (d4) b6 (c3) d4 (c5)=.

У СТАЛІЦЫ ЛЯГЧЭЙ ЗА ЎСЁ ЎЛАДКАВАЦЦА НА ПРАЦУ ВАДЗІЦЕЛЯМ

Колькасць зарэгістраваных беспрацоўных па выніках сёлетніх васьмі месяцаў у Мінску ўзрасла: у раённыя службы занятасці звярнуліся 16,6 тысячы чалавек, што на 28 % больш, чым у студзені — жніўні 2008 года.

Пра гэта расказала **намеснік начальніка аддзела прафнавучання і прафарыентацыі ўпраўлення занятасці насельніцтва Камітэта па працы, занятасці і сацабароне Мінгарвыканкама Вікторыя ФЕДАРОВІЧ**.

Паводле яе слоў, апошнім часам рэгіструецца ў сярэднім 1,6 тысячы беспрацоўных у месяц, 7 працэнтаў з якіх — выпускнікі школ.

Больш за ўсё Мінск адчувае цяпер патрэбу ў вадзіцелях — 483 вакансіі з сярэднім заробкам каля 800 тысяч рублёў. Далей ідуць рабочыя будаўнічых спецыяльнасцяў, прадаўцы, кантралёры-касіры, аўтаслесары, кухары, сярэдні медперсанал, урачы, выхавальнікі, бухгалтары, інжынеры асобных кваліфікацый, кіраўнікі сярэдняга звяна. Асноўная доля вакансій (80 %) прыпадае на рабочыя прафесіі.

Ніна ЯНОВІЧ, «Мінск—Навіны».

ЯКАЯ МОВА ЗРУЧНЕЙШАЯ?

— Спадарынька, пакіруйце кіроўцам, — просіць мужчына ў машыне. — Паглядзіце, калі ласка, каб я шчыльна пад'ехаў да аўтамабіля, што стаіць наперадзе, але не закрануў яго.

— Што? Куды? Яшчэ раз.

Я, беларускамоўная беларуска, слупянею, калі да мяне раптам на вуліцы звяртаюцца на роднай мове, і губляюся, як першакласніца. Не разумею з першага разу, чаго ад мяне хочуць. Беларуская мова мае парадаксальнае ўздзеянне на мяне: з аднаго боку, патрабуе любові і абароны, з другога — палохае. Я адна такая?

Так зручней

Пайсці ў горад з беларускім словам на вуснах — гэта подзвіг. Калі ў кавярні я замаўляю гарбату — прыносяць хлеб, прашу рахунак — прыносяць меню. Калі ў краме прашу падабраць мне пантофлі без абцасаў — паказваюць без шнуркоў. Калі набываю булку з разынкамі — адказваюць: «С резинками не бывает».

Часцяком, калі не хапае сілаў і часу на тлумачэнне, я пачынаю размаўляць па-руску. Работнікі любой установы становяцца ад гэтага весялейшымі, маўляў, наша ўзяла. А чыя гэта ўзяла?

Адзін мой беларускамоўны знаёмы ніколі не «хадзіў у горад па-беларуску», з рускамоўнымі знаёмымі размаўляў «на іх мове». «Так зручней», — казаў Дзіма. У выніку ён сам вельмі хутка перайшоў на рускую мову.

Шчырая беларуска Вулляна стала рускамоўнай, калі паехала жыць у Польшчу. «Усё ж такі рускую разумее большае кола людзей, — апраўдваецца яна. — Так зручней».

Мая сяброўка Алёна перастала гаварыць па-беларуску, калі перайшла на новую працу. «Мяне пачалі падазраваць у апазіцыйнасці. І хоць мова і палітыка ў маім жыцці ніяк не звязаныя, я саступіла. Так зручней».

Мне таксама шмат разоў у розных асяродках і розных сітуацыях не дазвалялі размаўляць па-беларуску: хто прасіў адмовіцца, а хто і проста забараняў. Я так і не саступіла. Не з-за шкоднасці. Проста МНЕ ТАК ЗРУЧНЕЙ. І былі моманты, калі беларуская мова мяне выратоўвала.

Слова на «дзясятку»

На экзаменах ва ўніверсітэце я не эксперыментавала. На якой мове выкладаўся прадмет, на такой і здавала, каб не заблытацца ў тэрміналогіі.

Давялося будучым журналістам для агульнага развіцця здаваць эканоміку. Я ў ёй, скажу шчыра, плавала. На экзамене, заручыўшыся красамоўствам, «ліла ваду». І вось настаў момант, калі мой мозг выкарыстаў усе рускія словы, якія ведаў, і я выдала:

— Вабіць... вабіць... Не падкажаце, як па-руску гучыць гэта слова — «вабіць»?

— Вабіць? Гэта па-беларуску? Вы фармулюеце думкі па-беларуску? А скажыце што-небудзь яшчэ. Я так даўно не чуў гэтай мілагучнай мовы.

Да канца экзамену мы з выкладчыкам абмеркавалі гісторыю і сучаснае становішча беларускай мовы, і я, безумоўна, атрымала «выдатна» па эканоміцы.

Слова лечыць

За некалькі месяцаў я запісалася на прыём да аднаго доктара. Вось нарэшце падышла мая чарга. Але ля кабінета чакала яшчэ адна, на гэты раз «жывая», чарга. Прайшло некалькі гадзін. А пацыентаў, ахвотных трапіць на прыём, не станавілася менш. Каля васьмі гадзін вечара на парозе кабінета з'явілася сама доктар.

— Зараз прыму апошняга чалавека, і ў мяне заканчваецца працоўны дзень.

Стомленыя чаканнем пацыенты пачалі абурацца, а я пацікавілася па-беларуску:

— Скажыце, калі ласка, а што рабіць астатнім — тым, хто не паспеў?

— З астатнімі мы разбяромся, а вы прайдзіце ў кабінет, — адказала мне доктар.

Там мы абмеркавалі моду на беларускасць і мілагучнасць роднай мовы, а пасля плаўна перайшлі да маіх скаргаў на здароўе.

Слова ў падарунак

Я заскочыла ў абутковы аддзел вялікага ўнівермага.

— А ў вас толькі вялікія лыжачкі для абутку, ці ёсць малыя? — пытаюся.

На мяне азірнулася ўся чарга. Нешта не так? Што са мной? А, гэта таму, што я па-беларуску размаўляю! Ну, то, слухайце ўсе: я размаўляю па-беларуску! Павісла паўза.

— Дык што наконт лыжачкі?

— Пачакайце, калі ласка, хвілінку, — прадавачка выйшла з-за прылаўка і пайшла ўглыбіню залы.

Яна вярнулася з дзвюма маленькімі абутковымі лыжачкамі рознай формы.

— У нас у продажы толькі вялікія. А гэта падарунак. За тое, што па-беларуску.

Дык як зручней?

— Яшчэ крыху... Бліжэй... Бліжэй. Стоп, — кірую я кіроўцам.

— Дзякуй вялікі, я б адзін не прыпаркаваўся. Можа, па кубачку гарбаты?

Чаму б і не! Я ўпэўнена, што ён запрашае мяне не на лусту хлеба. Бо мы размаўляем на адной мове. І так зручней.

Таццяна САЛДАЦЕНКА.

Крынічны куточак

Жыхарка хутара каля вёскі Язна Міёрскага раёна Марыя ШЧАРБІЦКАЯ з унукам каля студні-крынічкі на ўласным падворку.

Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.

ЛІТАРАЛЬНАЯ ГІСТОРЫЯ ЗВЯЗДА

Дасягненні айчыннага кнігавыдавецтва, Новы «гаспадар» жлобінскага лесазавода і Чаму рабочыя дражджавога камбіната штурмуюць чоп з квасам?

У верасні 1925 года «Звязда» пісала пра тое, што...

23 верасня.

«С 1-го октября 1922 по 1-е января 1925 в Белоруссии было издано белорусской литературы 876.550 экземпляров, еврейской литературы — 40.000 экземпляров, польской — 9.000 и русской 248.000 экземпляров (да жніўня 1927 «Звязда» друкавалася ў асноўным на рускай мове — **Т.Ш.**). В текущем году издательская деятельность значительно расширилась. С января 1925 года по 25 августа издано: белорусской литературы — 755.000 экземпляров, еврейской — 35.000 экз., польской — 7.000 экз., русской — 24.000.»

25 верасня.

«В текущем году отмечается громадный наплыв молодежи, главным образом деревенской, прибывшей в Минск для поступления в учебные заведения. Многие из них очутились в Минске в очень тяжелом материальном положении и не могли выехать обратно домой. Белорусское общество Красного креста пошло навстречу этой молодежи и отправило за свой счет на родину до 100 человек.»

26 верасня.

«Во всех углах, во всех отделениях Жлобинского лесозавода царствует «мат». Ругаются почти все, начиная от завхоза и кончая чернорабочими. Матюкается даже секретарь комсомольской ячейки. Матерщина властвует и на союзном собрании. Давайте, товарищи, скажем все разом: «Д-о-л-о-й р-у-г-а-н-ь.»

«7-го сентября сгорел Быховский лесозавод. Виноват кочегар Калашников, бросивший машину на произвол судьбы и ушедший покалякать с приятелем — станковым рабочим. От упавшей из топки искры воспламенилось горючее масло — и огонь пошел гулять по заводу (...) 80 семей рабочих остались без хлеба.»

27 сентября.

«На дрожжевом заводе «Красная заря» процветает пьянка. Квасок — в моде. Рабочие до того наспециализировались в его приготовлении, что 3-4 кружки не хуже самогона. В те дни, когда заделывается «матка», квасильное отделение подвергается осаде. Рабочие с кружками и ведрами штурмуют чан. До сих пор слабо велась борьба с этим злом. Нужно принять более строгие меры.»

Падрыхтаваў Тарас ШЧЫРЫ.

БРАКАНЬЕРЫ ПАТРАПІЛІ Ў КАЛОНІЮ

Пазбаўленне волі тэрмінам на тры гады з адбываннем пакарання ў папраўчай калоніі строгага рэжыму. Такі прыгавор вынес суд Бярэзінскага раёна браканьеру за незаконную здабычу рыбы падчас нерасту і нанесенне шкоды прыродзе ў асабліва буйным памеры.

Яго «калегу» суд «адмераў» пазбаўленне волі тэрмінам на два гады ўмоўна. Парушальнікі таксама абавязаны будуць у салідарным парадку пакрыць нанесеную шкоду ў памеры больш за 10,2 мільёна рублёў (293 базавыя велічыні).

За аналагічнае правапарушэнне суд Шаркоўшчынскага раёна пазбавіў іншага браканьера волі тэрмінам на 1 год і 1 месяц — з адбываннем пакарання ў папраўчай калоніі агульнага рэжыму. Дадаткова яму трэба будзе пакрыць шкоду на суму больш за 1,9 мільёна рублёў. У папраўчую калонію агульнага рэжыму на 1 год і 2 месяцы адправіў грамадзяніна за здабычу рыбы падчас забароны на яе лоўлю і нанесеную прыродным рэсурсам шкоду ў асабліва буйным памеры суд Быхаўскага раёна. З браканьера таксама спагнана 30 базавых велічынь — у кошт пагашэння выдаткаў, звязаных з яго вышукам.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Гродненская обл., г. Новогрудок
ПРОДАЕТСЯ, СДАЁТСЯ В АРЕНДУ ПРОИЗВОДСТВЕННАЯ БАЗА
• ОБЩАЯ ПЛОЩАДЬ - 2,3 га. • 4 ТЕЛЕФОННЫЕ ЛИНИИ
• ОГОРОЖЕННАЯ и ЗААСФАЛЬТИРОВАННАЯ ТЕРРИТОРИЯ пл. 2,3 га;
• ВСЕ КОММУНИКАЦИИ, ТРАНСФОРМАТОРНАЯ ПОДСТАНЦИЯ - 650кВТ
СКЛАДСКИЕ, ПРОИЗВОДСТВЕННЫЕ, АДМИНИСТРАТИВНЫЕ помещения общ. пл. 4520 кв.м.
РАССМОТРИМ ВАРИАНТЫ СОВМЕСТНОГО ПОЛЬЗОВАНИЯ
Тел. (017) 277-02-02, (029) 676-65-52

Считать недействительными страховые полисы ЗАО «СК «Белросстрах»:

- Добровольное страхование от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу (2РН, 2РП) серия БИ № 0722123, 0723914, 0748720, 0748789, 0797131, 0797132, 0797134.
- Добровольное страхование от несчастных случаев ф.2РН, 2РП серия БИ № 0003965, 0003966, 0007790–0007793, 0010952.
- Квитанция 1-СУ серия ГС № 5384137.

Страховые полисы ЗАСО «Белнефтестрах» по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории Республики Беларусь серия АЖ № 9287508, 9287509 **считать недействительными.**

У **суд Зэльвенскага раёна Гродзенскай вобласці** паступіла заява аб прызнанні адсутным без вестак **Бурко Аляксандра Іванавіча**, 26 верасня 1978 года нараджэння, ураджэнца в. Рожанка Шчучынскага раёна Гродзенскай вобласці. Апошняе вядомае месца жыхарства: г.п. Зэльва, зав. Булака, д. 10, кв. 20.

Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Бурко А.І., паведаміць іх суду Зэльвенскага раёна на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

У вытворчасці **суда Пастаўскага раёна Віцебскай вобласці** маецца заява аб прызнанні адсутнай без вестак **Каробкі Алены Афінагееўны**, 18 студзеня 1971 года нараджэння, ураджэнкі г. Паставы Віцебскай вобласці. З 23 жніўня 2008 г. звесткі пра Каробку А.А. адсутнічаюць, месцазнаходжанне невядомае.

Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць нейкія звесткі пра Каробку А.А., паведаміць іх суду Пастаўскага раёна (г. Паставы, вул. Савецкая, 76 А, тэл. 4 15 46) на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

Да ведама

УВОДЗІЦЦА ЗАБАРОНА НА ЛОЎЛЮ

З 1 кастрычніка па 15 красавіка, у адпаведнасці з Правіламі вядзення рыбалоўнай гаспадаркі і рыбалоўства, забараняецца прамысловая лоўля рыбы на зімавальных ямах.

Зімавальнымі ямамі называюцца месцы, дзе рыба збіраецца зімой, патлумачылі ў Міністэрстве прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Часцей за ўсё такія месцы знаходзяцца на дастаткова вялікіх глыбінях. Аднак далёка не кожная яма на рацэ з'яўляецца зімавальнай, паколькі глыбіня — не галоўная ўмова для збірання рыбы на зімоўку. Трэба каб у дна ракі была зона з замаруджанай кругавой плынню. Тады рыба будзе забяспечана кіслародам, адначасова ёй не трэба будзе расходаваць шмат энергіі на супраціўленне плыні. У адрозненне ад ракі, на вадаёмах зімавальныя ямы не з'яўляюцца самымі глыбокімі месцамі. Тут яны, як правіла, размяшчаюцца на плаўных схілах, у невялікіх паглыбленнях дна. Характэрная рыса такіх месцаў — цвёрдае, не заглеенае дно. Дарэчы, канцэнтрацыя рыбы характэрная толькі для некаторых вадаёмаў, дзе ў гэтых месцах утвараюцца ўмовы для зімоўкі больш спрыяльныя, чым у цэлым па вадаёме. Звычайна ў ямах збіраюцца рыбы аднаго віду, што забяспечвае найлепшыя ўмовы для зімоўкі. Гэта асятровыя (асяцёр і сцерлядзь) і многія карпавыя (карп, карась, лінь, лешч і іншыя).

Сяргей РАСОЛЬКА.

У МІНСКУ ГАСЦЮЮЦЬ ЧАРОДЫ ПЕРАЛЁТНЫХ ПТУШАК

Мінск накрыла першая хваля пералётных птушак. Шчыглы, пеначкі, дубаносы, якія адкачоўваюць з поўначы, запаўняюць сталічныя паркі, скверы, дзелавіта раздзёўбваюць плады ў садах і бесперапынна шчабечуць.

— У адрозненне ад вясны, калі птушкі спяшаюцца звіць гняздо і пралятаюць хутка, восенню яны не спяшаюцца пакінуць нашы шыроты, — патлумачыла такія птушыныя паводзіны **супрацоўнік навукова-практычнага цэнтра па біярэсурсах Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Ірына САМУСЕНКА**. — Яны трымаюцца чародамі, дастаткова бестурботныя і не палахлівыя, любяць спыняцца ў гарадах.

Дарэчы, на ўскраінах Мінска можна сустрэць не толькі качэўнікаў, але і птушак з пастаяннай беларускай «прапіскай». Яны пакідаюць свае лясныя дамы і нейкі час перад адлётам на зіму гасцююць у горадзе.

Лена АЎРЫНСКАЯ,
«Мінск—Навіны».

Ашлі КЛОЙТЭ: «У ЗІМБАБВЭ ВАС СУСТРАКАЛІ Б НЕ ХЛЕБАМ-СОЛЛЮ, А МЯСАМ...»

Першы раз сустрэў дзяўчыну, прафесійную баскетбалістку, якая сумяшчае сваё спартыўнае захапленне з мадэльным бізнэсам. Мне раней здавалася, што калі дзяўчо гуляе ў баскетбол, то бывай манікюр і салют біцэпсам. Але ўраджэнка Зімбабвэ Ашлі Клойтэ цалкам разбурыла мой стэрэатып. Зграбная, станістая, любіць усміхацца. Не ведаю, чым мяне абаяла гэтая дзяўчына, але пры размове з ёй пачуваўся лёгка і чамусьці зусім па-свойску. Дзяўчына шчырая і адкрытая. Амаль як беларуска, толькі на свой, зімбабвійскі капыл...

Перад самым фіналам конкурса «Міс інтэркантыненталь», дзе дзяўчына выступала як прадстаўнік сваёй радзімы, Ашлі расказала, што ёй вельмі падабаецца Беларусь, нашы людзі і наша нацыянальная кухня. Нават некалькі слоў па-руску Ашлі ужо паспела вывучыць. Адзіная нязручнасць для дзяўчыны — гэта адносна халодны ў параўнанні з афрыканскім беларускі клімат:

— Зараз у Зімбабвэ, напрыклад, тэмпература за 35 градусаў па Цэльсію і вельмі вільготна. Чым вільготнасць большая, тым цяжэй пераносіць гэтыя кліматычныя ўмовы. Увогуле зараз там спякотны час: з верасня і да сярэдзіны лістапада надвор'е будзе цёплае і дастаткова вільготнае, таму цяжкапераноснае. Затым, дзесьці ў сярэдзіне лістапада, пахаладае, пройдуць дажджы і пачнецца халодны сезон. Калі хочаце паехаць у Зімбабвэ, то лепш рабіце гэта цяпер (*смяецца*).

— Для беларусаў Зімбабвэ крыху экзатычная краіна. Раскажы, калі ласка, пра сваю радзіму падрабязней...

— Мая краіна вельмі прыгожая. У ёй знаходзіцца адно з сямі цудаў свету — вадаспад Вікторыя. І я б вельмі параіла туды з'ездзіць. Гэта сапраўды неверагодна прыгожае месца. У нас вельмі шмат вальераў: у вас гэта называецца «заапаркамі», у нас гэта — вальеры з сапраўднымі дзікімі жывёлінамі і жывой дзікай прыродай. Таксама хацела б адзначыць нашых людзей: іх гасціннасць, сардэчнасць, цёплае стаўленне да іншых. Яны вельмі сціплыя, надзвычай добразычлівыя. Мне падабаецца, што яны вельмі паважаюць сваю культуру і традыцыі. Часам у адным чалавеку можна знайсці дзве натуры. Нягледзячы на тое, што ў нас цывілізаваная краіна, можна назіраць людзей, якія выходзяць са свайго дома, у якім гарыць электрычнае святло, раскладваюць агонь на двары і гатуюць на ім, напрыклад, мяса. Я сама таксама такі чалавек, дзе ужываюцца дзве сутнасці: з аднаго боку — гэта цывілізацыя (я жыву ў цалкам сучасным доме з электрычнасцю і ацяпленнем), з другога боку, я магу жыць і без гэтага. Мой бацька ў свой час трымаў ферму, а пасля яго смерці ферма адышла мне і маім сёстрам. Мы вельмі часта туды прыязджаем, любім бавіць там час, і нас зусім не засмучае адсутнасць якіхсьці там выгод. І ў прынцыпе, гэта тая рыса, якая вылучае маіх землякоў: яны могуць абыходзіцца і традыцыйнымі, вельмі старымі спосабамі існавання. Часам можна адчуць, быццам бы ты трапляеш у іншы свет.

— Падчас знаходжання ў Беларусі ці заўважыла ты якіясьці падабенствы паміж беларусамі і зімбабвійцамі?

— Натуральна, цяжка гаварыць пра падабенствы і адрозненні, паколькі я яшчэ зусім мала прабыла ў вашай краіне. Але з таго, што мы ўжо ўбачылі з пяцідзённага тура па Беларусі, я магла б адзначыць гасціннасць і добразычлівасць беларусаў. Тое, як яны сустракаюць нас, — гэта вельмі традыцыйны спосаб прывітання — з хлебам і соллю. І напэўна, калі б вы прыехалі да нас у краіну, мы б сустрэлі вас падобным чынам, толькі ў стылі нашай краіны, у стылі нашай культуры. Магчыма, гэта было б мяса і якаясьці яшчэ ежа, традыцыйная для нашай краіны. Танцы. Хацела б адзначыць, што ў гэтым плане нашы краіны падобныя. Таксама ў Дудутках я звярнула ўвагу на некаторыя асаблівасці побыту і старыя дэкарацыі, якія адлюстроўвалі побыт беларусаў. Аддалена ў нечым я таксама пазнала сваю краіну. Калі мы зайшлі ў памяшканне, дзе вырабляюць хлеб (такая своеасаблівая пякарня), вакол стаялі дамкі ў стылі таго часу, і мне гэта таксама нагадала маю радзіму.

— Як даўно ты ў мадэльным бізнэсе?

— Я ўжо прымала ўдзел у разнастайных конкурсах прыгажосці невялікага маштабу — але ў школе, таму не лічу гэта сур'ёзным конкурсам прыгажосці. Адзіным сур'ёзным конкурсам прыгажосці, у якім я прымала ўдзел у гэтым годзе, стаў конкурс прыгажосці, які праводзіўся паміж універсітэтамі Англіі, дзе я вучуся. У конкурсе ўдзельнічалі дзяўчаты з усіх куткоў Вялікабрытаніі: поўдзень, поўнач, захад, усход. У фінальнай частцы нас сабралася каля 20. Я ніколі не ставілася да гэтага сур'ёзна, нават удзельнічаць не збіралася. Рашэнне ўзяць удзел я прыняла за тыдзень да пачатку. Яшчэ на мяне націснулі сябры, сям'я, і ўвогуле ўсе мне казалі: «А чаму ты не хочаш паспрабаваць? Паспрабуй.» З самага пачатку я нават не разлічвала на перамогу, а ўспрымала гэта як чарговую магчымасць завесці новых сяброў і новыя знаёмствы, добра прабавіць час. Таму, калі я трапіла спачатку ў Топ-10, затым у Топ-6, а пасля і ў Топ-3, майму здзіўленню не было мяжы. Калі ж аб'явілі імя пераможцы — маё імя — я была проста ў шоку. Але, зразумела, вельмі ўзрадавалася. І цяпер самая правільная стратэгія, па-мойму — гэта не ўспрымаць удзел у такіх конкурсах усур'ёз, проста не надаваць ім вялікай увагі. Удзельнічаючы ў такіх конкурсах, трэба браць ад іх усё, час праводзіць максімальна з карысцю: знаёміцца з новымі людзьмі і заводзіць новых сяброў.

— Ты студэнтка адной з англійскіх ВНУ. На якім аддзяленні вучышся? І ці плануеш пасля вучобы вярнуцца ў Зімбабвэ?

— Я прыехала ў Англію шэсць гадоў таму: мая мама — медыцынская сястра, і яе выклікалі ў гэту краіну, паколькі ў гэты час там не хапала медыцынскіх работнікаў. Таму ўжо шэсць гадоў я жыву ў Англіі. Як толькі мы туды прыехалі, я спачатку скончыла англійскую школу, затым паступіла ў каледж — Саўс-Хэнтаўскі ўніверсітэт, што ў прыгарадзе Лондана. Мая спецыяльнасць — спартыўны трэнер. Яе спецыфіка ў тым, што мы не факусуем сваю ўвагу на якімсьці канкрэтным відзе спорту: патроху нас вучаць усяму. Але сама я больш аддаю перавагу баскетболу і лёгкай атлетыцы. Я насамрэч вельмі спартыўны чалавек. Раней вельмі сур'ёзна гуляла ў баскетбол, была ў камандзе сваёй школы, універсітэта і нават планавала ўдзельнічаць у Алімпійскіх гульнях 2012 года. Праблема толькі ў тым, што падрыхтоўка да гульняў ужо даўно пачалася, і зараз я ўжо выпадаю з рэпетыцый. Я доўга не трэніравалася, таму патрэбен час, каб прыйсці ў форму.

У Зімбабвэ я ездзу кожны год да свайго дзядзькі (амаль уся сям'я ўжо пераехала ў Вялікабрытанію — **І.Л.**). Яшчэ там засталіся мае сябры. Пакуль што я планую застацца ў Англіі і скончыць універсітэт, каб пасля вышэйшай адукацыі атрымаць ступень магістра. Пасля гэтага праз некалькі гадоў я б хацела вярнуцца дадому. Пакуль што такой магчымасці няма, бо большая частка сям'і знаходзіцца ў Англіі, і жыццё факусіруецца ў Лондане.

— У цябе ёсць мара?

— У мяне мараў шмат. Дзве самыя вялікія ў маім жыцці: стаць мадэллю і стаць спартсменкай. І я вельмі задаволеная тым, што ў пэўным сэнсе яны ўжо спраўдзіліся. Я ведаю, калі б я гэтым не займалася, то, відаць, так бы ніколі і не пабывала ў Беларусі. А мне тут вельмі спадабалася.

— Дзякуй за размову. І поспеху!

Ілья ЛАПАТО.

За дапамогу ў арганізацыі і правядзенні інтэрв'ю аўтар выказвае падзяку тэлеканалу АНТ і асабіста Кацярыне БАГАЛЕЙШЫ.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.08	18.51	11.43
Віцебск —	6.58	18.40	11.42
Магілёў —	6.58	18.41	11.43
Гомель —	6.54	18.38	11.44
Гродна —	7.23	19.06	11.43
Брэст —	7.23	19.07	11.44

Месяц

Першая квадра 26 верасня. Месяц у сузор'і Вадалея.

Імяніны

Пр. *Людмілы, Віктара, Іосіфа, Ісака, Рыгора.*

К. *Міхаліны, Габрыеля, Міхала.*

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

НАДВОР'Е на заўтра



...у суседзяў

ВАРШАВА	+12..+14°С	КІЕЎ	+12..+14°С
ВІЛЬНЮС	+11..+13°С	МАСКВА	+8..+10°С
РЫГА	+10..+12°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ	+7..+9°С

Дзве даты

29 верасня

1823 год — нарадзіўся Уладзіслаў Сыракомля (Людвік Кандратовіч), беларускі і польскі паэт. Вучыўся ў дамініканскіх школах у Нясвіжы і Навагрудку, затым працаваў у нясвіжскай канцылярыі па кіраўніцтве радзівілаўскімі маёнткамі. За ўдзел у антыўрадавых маніфестацыях у 1861 годзе пасаджаны ў турму. Друкавацца пачаў у 1844-м. Асноўны кірунак творчасці — тэма барацьбы за вызваленне сялянства ад прыгону. Першы друкаваны твор «Паштар» быў пакладзены на музыку і добра вядомы як руская народная песня «Когда я на почте служил ямщиком...». Вывучаў гісторыю, этнаграфію, фальклор, мову беларусаў. Быў першым крытыкам новай беларускай літаратуры. Шырока выкарыстоўваў элементы беларускага фальклору, апрацоўваў і перакладаў беларускія народныя песні. Аўтар «Кароткага даследавання мовы і характару паэзіі русінаў Мінскай правінцыі», гісторыка-краязнаўчай працы «Вандроўкі па маіх былых ваколіцах», вершаў «Добрыя весткі», «Ужо птушкі спяваюць паўсюль» і інш. Памёр у 1862 годзе.

1547 год — нарадзіўся Мігель дэ Сервантэс, іспанскі пісьменнік, стваральнік новага гумарыстычнага рамана, які пагубіў рыцарскую рамантыку.

Цытата дня:

«Клопат аб лішнім часта звязаны са стратай неабходнага».

Салон (637—559 да н.э.), афінскі мудрэц.

ІМЯНІНЫ

Імяніны — штогадовае свята, якое адзначаецца ў гонар хрысціянскага святога, імя якога далі дзіцяці пры хрышчэнні. Звычайна дзень імянінаў супадаў з днём нараджэння, таму што імя надавалі па святцах — календары ўшанавання святых.

● Асаблівае значэнне надавалася першым імянінам. Першы год жыцця дзіцяці вызначаўся як самы важны этап. Таму ў першыя імяніны праводзілі абрад пастрыжэння дзіцяці. На патыліцы крыжападобна выстрыгалі валасы, якія клалі за абразамі ў чырвоным куце. Лічылася: пакуль валасы дзіцяці ляжаць там, з ім нічога не здарыцца.

● Калі сына забіралі ў войска, маці даставала гэтыя валасы і з некалькіх валасінак рабіла амулет («каб дадому вярнуўся»): закатвала валасы ў воск грамнічнай свечкі і хавала гэты застылы воск у адзенні сына, астатнія клала назад. Калі дачка выходзіла замуж, валасы ад першага пострыгу вымалі і аддавалі ёй назаўжды — «каб стварыла (звіла) сваё гняздо, свой дом, сваю сям'ю і дамоў не вярталася».

● У гэты дзень дзіця першы раз падпярэзвалі і апраналі панчохі. Праводзіць усе рытуальныя дзеянні на імянінах дазвалялася хроснай маці або бабулі.

● Часам у гэты дзень дзіця аднімалі ад грудзей.

● У гэты ж дзень дзіця далучалі да дарослага жыцця, да працы: дзяўчынцы, напрыклад, у рукі першы раз укладвалі кавалак тканіны, хлопчыку — малаток і цвікі, і тады ён заўсёды ў рабоце будзе спрытным.

● Абавязковым рытуалам на імянінах было выпяканне каравая, якія таксама звалі «імяніннікамі».

● На імянінах дзіця падымалі за вушы, жадаючы, каб яно хутчэй расло.

● Імяніны святкавалі звычайна тры дні: «Добры імяніннік да трох дзён».

● У сувязі з тым, што галоўнага прадстаўніка хатняй жывёлы — карову — таксама звалі па імені або клічы, то ў народнай традыцыі існавала і такое паняцце, як «каровіны імяніны». Разам з тым, і другая карміцелька чалавека — зямля — ушаноўвалася як жывая істота. У народзе казалі: «На Тройцу ў зямлі імяніны».

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнёмся!

— Жонкі — зло. Яны лаюцца і забараняюць мужам сядзець у інтэрнэце па начах.

— Мужы — яшчэ большае зло. Яны адбіраюць інтэрнэт і сядзяць там самі.

☺

Раней пасля вячэры трэба было мыць посуд. Зараз ёсць пасудамыйная машына. Мыць трэба не толькі посуд, але і саму машыну.

☺

— Ты чаго гэта з сабой шкуру зебры цягаеш?!

— Зручна! Раскаці цераз дарогу і пераходзь, дзе хочаш!

☺

Хочаш не праспаць раніцай на працу? З'еш перад сном кавун.

ГАРАСКОП СТРЫЖАК на кастрычнік

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

1 кастрычніка. У выніку стрыжкі валасоў ці стварэння прычоскі вы прыцягніце да сябе радасць і шчасце.

2 кастрычніка. Сёння вельмі неспрыяльны дзень для наведвання цырульніка. Стрыжка валасоў можа прыцягнуць да чалавека мноства праблем, хваробаў і непрыемнасцяў.

3 кастрычніка. У гэты дзень прыслухоўвайцеся да сябе: калі ў вас ёсць моцнае жаданне змяніць стрыжку ці зрабіць новую прычоску, тады абавязкова наведвайце свайго майстра.

4 кастрычніка. У гэты дзень лепш устрымацца ад стрыжкі, паколькі гэта можа прывесці да недамагання: павышэння ціску, галаўнога болю, з'яўлення пачуцця страху.

5 кастрычніка. Стрыжка, зробленая ў гэты дзень, пойдзе на карысць не толькі вашай знешнасці, але і духоўнаму свету. У вас абвострыцца інтуіцыя і ўзмоцніцца пранікліваць розуму.

6 кастрычніка. Сённяшняе наведванне цырульні прынясе вам радасць і адновіць душэўную раўнавагу. Гэта адаб'ецца і на валасах: пасля стрыжкі яны стануць гусцейшымі.

7 кастрычніка. Стрыжка, зробленая ў гэты дзень, не застанецца незаўважанай. Вашым новым абліччам будуць зачараваныя ўсе навакольныя.

8 кастрычніка. У выніку стрыжкі могуць з'явіцца хваробы і перашкоды ў працы. Высокая верагоднасць атрымання траўмы. Паводле ўсходніх павер'яў, стрыжка можа прыцягнуць да вас злых духаў.

9 кастрычніка. Сёння ёсць сэнс звярнуцца да цырульніка — стрыжка валасоў палепшыць самаадчуванне.

10 кастрычніка. Стрыжка валасоў павялічвае вочны ціск і вядзе да пагаршэння зроку. У выніку стрыжкі магчымыя запаленні, з'яўленне ячменю.

11 кастрычніка. Выдатны дзень для стрыжкі валасоў. Вынік працы цырульніка перавысіць самыя смелыя чаканні, і навакольныя ацэняць ваш знешні выгляд.

12 кастрычніка. Гэты дзень быццам бы створаны для візіту да цырульніка. Зробленая сёння стрыжка прыцягне паляпшэнне фінансавага становішча, павелічэнне ўласнасці і прыхільнасць кіраўніцтва.

13 кастрычніка. Добры дзень для наведвання цырульні: новая стрыжка прыцягне ўдачу і дабрабыт.

14 кастрычніка. У гэты дзень лепш устрымацца ад стрыжкі, паколькі гэта можа прывесці да недамагання: павышэння ціску, галаўных болю, з'яўлення пачуцця страху.

15 кастрычніка. Сёння выдатны дзень для наведвання цырульніка. Стрыжка, зробленая ў гэты дзень, зменіць у лепшы бок усё ваша жыццё. У найбліжэйшыя месяцы пачнуць адбывацца станоўчыя змены ў асабістым жыцці, кар'еры і стане здароўя.

16 кастрычніка. Пасля стрыжкі, зробленай у гэты дзень, валасы стануць танейшымі. Затое будуць больш марудна адрастаць, і форма, створаная цырульнікам, захаваецца надоўга. Магчыма, зменіцца і колер валасоў: яны стануць крыху цямнейшымі.

17 кастрычніка. Сённяшняя стрыжка прынясе вам не толькі задавальненне ўласнай знешнасцю, але і ўдачу.

18 кастрычніка. Стрыжка валасоў у гэты дзень можа значна пагоршыць ваш стан здароўя. Сёння лепш пазбягаць зменаў знешняга выгляду.

19 кастрычніка. Сённяшняя стрыжка не толькі зробіць вас яшчэ больш прыцягальнымі, але і прыцягне ўдачу.

20 кастрычніка. Вельмі дрэнны дзень для стрыжкі валасоў: могуць узнікнуць розныя захворванні. Калі хочаце пазбегнуць праблем са здароўем — устрымайцеся ад наведвання цырульні.

21 кастрычніка. У гэты дзень стрыжка валасоў можа павялічыць вочны ціск, што прывядзе да пагаршэння зроку і абвастрэння вочных хваробаў. Лепш адкласці наведванне цырульні.

22 кастрычніка. У гэты дзень лепш устрымацца ад стрыжкі, паколькі гэта можа прывесці да недамагання: павышэння ціску, галаўных болю, з'яўлення пачуцця страху.

23 кастрычніка. Стрыгчы валасы сёння непажадана: можна «адрэзаць» сваю ўдачу.

24 кастрычніка. Стрыгчы валасы ў гэты дзень не рэкамендуецца, паколькі прыцягваюцца непрыемнасці і хваробы.

25 кастрычніка. У выніку стрыжкі валасоў ці стварэння прычоскі вы прыцягніце радасць і шчасце.

26 кастрычніка. Стрыжка валасоў можа прыцягнуць да вас сваркі і цяжбы, вы можаце пасварыцца з начальнікам. Існуе пагроза канфлікту з каханым чалавекам.

27 кастрычніка. Сённяшні дзень выдатна падыходзіць для змены іміджу. Зробленая сёння стрыжка ўзбагаціць вас не толькі эстэтычна, але і практычна: ваш фінансавы стан прыкметна палепшыцца.

28 кастрычніка. Стрыжка прынясе вастрыню пачуццяў, павялічыць вашы магчымасці да прадбачання і пранікліваці розуму.

29 кастрычніка. Калі пастрыгчыся ў гэты дзень, то валасы будуць лепш расці, стануць густымі і пышнымі. Але памятайце, што ў гэты дзень супрацьпаказана хімічнае ўздзеянне на валасы (фарбаванне, завіўка). А складаная ўкладка, зробленая ў гэты дзень, пратрымаецца нядоўга.

30 кастрычніка. Лепш ад стрыжкі ўстрымацца — могуць узнікнуць праблемы са здароўем: павышаная нервовнасць, галаўны боль.

31 кастрычніка. Сёння можаце смела накіроўвацца да свайго майстра: пасля новай стрыжкі вашы валасы будуць расці здаровымі і прыгожымі.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Сканворд + судоку (22 верасня). Па гарызанталі: Баркас. Маршал. Фетр. Вось. Моа. Юка. Шчэк. Алмаз. Еўпаторыя. Ола. Кук. Епіскап. Нара. Афон. Ірак. Карскі. Кале. Рза. Увал. Сноб. Мана. Вол. Цецярук. **Па вертыкалі:** Вегетарыянец. Авеню. Капцілка. Карма. Токар. Сквер. Сіваш. Олафсан. Чарапок. Орлік. Маснэ. Німб. Каяк. Унікум. Макарава. Ралан. Лебедзь. Акела. **Судоку:** адказы гл. у табліцы.

7	3	6	1	5	4	2	9	8
4	2	9	8	6	3	7	1	5
1	5	8	7	2	9	4	3	6
3	9	5	4	8	6	1	7	2
2	7	1	3	9	5	8	6	4
8	6	4	2	7	1	3	5	9
6	4	3	5	1	8	9	2	7
5	1	2	9	4	7	6	8	3
9	8	7	6	3	2	5	4	1

Сканворд (24 верасня). Па гарызанталі: Венесуэла. Брэст. Кадр. Паром. Маг. Абак. Атлас. Лава. Радыкал. Ікона. Індыя. Пара. Мост. Курага. Старт. Док. Бур. Барана. Турку. Аер. Кітай. Морж. Луза. Арба. Арка. Талі. Танін. Таблетка. **Па вертыкалі:** Скрэпер. Асот. Радно. Абрэз. Струк. Макет. Трук. Малі. Тартак. Рокат. Аркан. Эрэ. Агляд. Айбаліт. Суд. Іна. Расія. Бра. Куба. Галоп. Рым. Кананада. Вар. Гонар. Ева. Асака. Жалеза.

Сканворд (26 верасня). Па гарызанталі: Інтэграцыя. Арба. Урал. Гол. Табу. Аркан. Торс. Веер. Дым. Блюда. Кайданы. Газ. Кат. Руан. Муляж. Парода. Малаток. Нож. Байкал. Чара. Каса. Выраз. Факс. Батрак. Рама. Маска. Капітолій. **Па вертыкалі:** Галактыка. Зман. Дрэйф. Урок. Ложа. Дагляд. Самбук. Ажына. Жаба. Ікар. Мыза. Фетр. Рагу. Шайба. Рак. Табло. Крама. Лье. Марс. Кап. Вал. Арбітр. Ушачы. Клюшка. Тар. Андора. Стандарт. Казначэй.

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 32.345. Індэкс 63850. Зак. № 5316. Нумар падпісаны ў 19.30.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12